Л.В. Аляксееў

# ГРОДНА
## і помнікі Панямоння



Л.В. Аляксееў

# ГРОДНА
## і помнікі Панямоння



Мінск
"Беларуская навука"
1996

ББК 63.3(4 Беи)
А 60
УДК 947.66+72(476.6)(091)

Навуковы рэдактар
кандыдат гістарычных навук А. К. Краўцэвіч

**Аляксееў Л. В.**

А 60 Гродна і помнікі Панямоння. — Мн.: Беларуская навука, 1996.—191 с.: іл.
ISBN 5-343-01410-0.

Падарожжа па Нёмане ад яго вытокаў, аповяд у цікавай форме аб гісторыі паселішчаў на яго берагах, аб знакамітых і малавядомых архітэктурных помніках — усё гэта можна знайсці ў кніжцы, якую мы вам прапануем.
Разлічана на шырокае кола чытачоў.

**А $\frac{9470660000-017}{М316(03)-96}$ Дадат.- 96**

**ББК 63.3(4Беи)+85.113(4Беи)**

ISBN 5-343-01410-0

© Л. В. Аляксееў,
1996

*Светлай памяці даследчыка*
*беларускага мінулага і яго помнікаў,*
*натхнёнага змагара за Новую Беларусь*
*МІХАСЯ АЛЯКСАНДРАВІЧА ТКАЧОВА*
*прысвячаю*

*Я лічу мастацтва спрадвечным феноменам, які ні пры якіх абставінах не перастане існаваць, а мастака як форму быцця — бессмяротным....*

Томас Ман

# Уступ

Беларусь — краіна асаблівага народа, асаблівай гісторыі, асаблівага каларыту і асаблівых помнікаў мастацтва. Народ гэты склаўся ў глыбокай старажытнасці праз зліццё славянскіх плямёнаў, якія праніклі на сучасную беларускую тэрыторыю, з усходнебалцкімі абарыгенамі. На першых этапах яго лёс быў цесна звязаны з Кіеўскай Руссю, разам з ёй ён атрымаў хрысціянства (X ст.) і дзяржаўнасць (XI ст.). Далейшае развіццё апошняй прывяло да стварэння новай дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага. Пачалася эпоха барацьбы з Тэўтонскім ордэнам, татарамі, Маскоўскай дзяржавай, барацьбы з паланізацыяй, змагання сялянства супраць феадальнай эксплуатацыі. На беларускай зямлі мы ўбачым сведак той эпохі: магутныя ўмацаваныя замкі, цэрквы-крэпасці, крэпасці-касцёлы, рэшткі феадальных сядзібаў і палацаў. Само геаграфічнае становішча было прычынай таго, што і ў наступны час войны яе не міналі.

Беларусь — краіна не толькі цікавых помнікаў мастацтва, гэта і краіна (асабліва на захадзе) непаўторнага прыроднага каларыту! Мой першы прыезд на Гродзеншчыну адбыўся ў 1948 г. (я яшчэ не ведаў, што стану гісторыкам-археолагам Беларусі, звяжу з ёй усё сваё жыццё!). Але тое, што я ўбачыў, мяне ўразіла. Мой цягнік спяшаўся, працiскваўся паміж пагоркамі, пакідаючы рэдкі дымок, які павольна адплываў убок. Быццам у механізме вялізнага гадзінніка, адзін за адным паслухмяна накручваліся пагоркі, узбегшыя на іх напалоханыя елкі, трапяткія бярозы, ускудлачаныя адзінокія сосны — усе яны ўцягваліся ў кругазварот і павольна раставаліся ў далечы. Туды ж, назад, беглі маленькія вёсачкі, гаёчкі, палі, цэркаўкі, капліčкі, касцёлы, ветракі... Такой была Заходняя Беларусь пасля вайны. Запомніліся яшчэ разбітыя чыгуначныя станцыі, старыя абшарпаныя вагоны на рэйках з гнілымі шпаламі — рэшткі даваенных задворкаў панскай Польшчы!

Прайшло амаль 45 гадоў. Паравозы ўжо не дымяць на беларускіх дарогах, магутныя электравозы імчаць з грукатам гіганцкія саставы. Усюды сучасныя вакзалы. Мінулае адсунулася, змяніліся людзі... Застаўся толькі той дзівосны заходнебеларускі ландшафт — сярод маляўнічых гаёў — белыя цэркаўкі, касцёлы, капліцы, старадаўнія сядзібы — нямыя сведкі мінулых эпох — помнікі мастацтва! Яны і ёсць наша мэта!

У дарогу!

# З мінулага нёманскіх берагоў

Як паказалі археалагічныя раскопкі, чалавек прыйшоў сюды ў далёкую эпоху мезаліту, у X—IX тыс. да н. э. Ён пачаў жыць тут таму, што знайшоў радовішчы крэменю, неабходнага для вытворчасці прыладаў працы. Тады яшчэ людзі жылі родавымі калектывамі, аб'ядноўваліся ў плямёны, палявалі ў прынёманскіх лясах з лукам і стрэламі, лавілі рыбу, здабывалі агонь і варылі ежу ў грубым гліняным начынні — гэта была ўжо эпоха неаліту. У III тыс. да н. э. была вынайдзена бронза, наступіў "бронзавы век", у I тыс. да н. э. ён змяніўся "жалезным векам"— людзі навучыліся рабіць жалеза з балотнай руды. Інтэнсіўнасць жыцця адразу павялічылася. Чалавек гэтак жа паляваў у прынёманскіх лясах з лукам і стрэламі, лавіў рыбу, але цяпер у яго быў і другі занятак — земляробства. Намаганнямі родавага калектыву выпальваліся лясы, узрыхлялася глеба, на пажарышчах размяшчалі ворыва. Людзі размаўлялі на адной з галін балцкіх моваў, бо іхнімі продкамі былі балты.

Славянін прыйшоў сюды пазней, відавочна, у другой палове I тыс. н. э. Ён мірна жыў з абарыгенамі, паляваў, як і яны, у прынёманскіх лясах, лавіў рыбу ў рэках — месца хапала ўсім! Але ён не выкарчоўваў і не паліў лясоў для ўгнаення ворыва. Аднойчы расчысціўшы лясны ўчастак, ён дзяліў яго на часткі і адну з іх пакідаў пад папар. Ужо не патрэбна было цяжкай працы для расчысткі ўсё новых пляцовак. Славянскія плямёны ўзначальвалі правадыры, якія паступова збіралі багацце і з дапамогай дружыны пачалі прымушаць да даніны і суседнія плямёны. Пасля многіх міжусобных боек у IX ст. ва Усходняй Еўропе ўтварылася першае рускае дзяржаўнае аб'яднанне — Кіеўская Русь. У Панямонні ў XI—XII стст. былі ўжо свае, залежныя ад Кіева княствы: Гродзенскае, Слонімскае, Наваградскае.

У XIII ст. усходнеславянскіх князёў змяніла дынастыя літоўскага паходжання. Князь Міндоўг з Наваградка кіраваў

Полацкай і Віцебскай землямі і працягнуў ужо руку да Смаленска, але ў 1263 г. стаў ахвярай вераломнай змовы. Працяглай вайне паклаў канец Гедымін, які стаў вялікім князем і падпарадкаваў сабе рускія княствы ад Полацка да Кіева. Сваімі ўладаннямі ён кіраваў спачатку з замка Трокі, а пазней з Вільны. Справу прадоўжылі яго сыны. Кейстут (памёр у 1382 г.) валодаў усёй Літвой, Альгерд (1345—1377) — Усходняй Беларуссю, ёй жа пагражаў Ноўгараду і Пскову, падтрымліваў Цвер у барацьбе з Масквой. Саюз двух сыноў Гедыміна распаўся са смерцю Альгерда. Вялікі князь Кейстут з сынам Вітаўтам трапілі ў палон да сына Альгерда — Ягайлы і былі адпраўленыя ў замак Крэва, дзе "коморникі князя Ягайлы" задушылі Кейстута. Вітаўт, пераапрануўшыся ў жаночую вопратку, "утечеть во Немьцы, у Пруси", "нача воевати с помочью немецкою Литовскую Землю". Часова сцішыць яго ўдалося, перадаўшы "Луческ со всею Вольнскою Землею, а в литовской земли — отчину его" (Гродна). Неспакойна было ў гэты час і ў Польшчы. Маладая польская каралева Ядзвіга не магла спыніць смуты, аднак выйсце было знойдзена. Вялікі князь літоўскі Ягайла жаніўся на Ядзвізе, паганская Літва пераходзіла ў каталіцтва. Ягайла стаў польскім каралём пад імем Уладзіслава. Усё гэта знайшло адлюстраванне ў вядомай Крэўскай уніі (1385). Вітаўт, зразумела, не прызнаў уніі, рынуўся на заваёву Літвы, атрымаў там уладу (1392) і толькі фармальна ўвайшоў у ленную залежнасць ад караля, атрымаўшы Літву ў пажыццёвае ўладанне. Гэты князь быў надзелены надзвычайным розумам і здольнасцямі военачальніка. Свае ўладанні ён пашырыў ад Балтыкі да Чорнага мора. У канцы жыцця ён рыхтаваўся атрымаць каралеўскі тытул, але смерць перашкодзіла гэтай справе (1430).

Мясцовае насельніцтва (у XIV ст. ужо з‘явіўся тэрмін "беларусы") адчужана глядзела на барацьбу літоўскіх феадалаў, ва ўвядзенні каталіцызму бачыла страту спрадвечных сувязей з Руссю і не хацела змяняць праваслаўнае веравызнанне. У 1596 г. была створана Брэсцкая царкоўная унія, якая заснавала "прамежкавую" уніяцкую царкву, захаваўшую шмат што з праваслаўных абрадаў, але прызнаўшую ўладу папы. Барацьбу каталіцкай царквы з праваслаўем падтрымлівалі буйныя магнацкія роды, уперадзе якіх ужо з XV ст. стаялі знакамітыя роды Радзівілаў і Сапегаў, з якімі мы яшчэ не раз сустрэнемся на старонках гэтай кнігі. Іх багатыя

рэзідэнцыі, заснаваныя на працы прыгонных, у XVI ст. сталі асяродкамі культуры і асветы ў краі: туды запрашаліся лепшыя майстры сярэднявечнага Захаду. Побач з імі працавалі і мясцовыя таленавітыя майстры. Тут атрымлівалі пашану і плён самыя вытанчаныя мастацтвы.

Пасля аб'яднання Польшчы і Вялікага княства Літоўскага ў адзіную дзяржаву Рэч Паспалітую (1569) — саслоўную манархію з каралём, абраным сеймам,— пачалася ўзмоцненая паланізацыя краіны. Шмат пацярпела Беларусь пад час войнаў з рускімі, шведамі, усе яны праходзілі праз яе землі, спустошаючы іх.

У сярэдзіне XVIII ст. у Рэчы Паспалітай валадарылі каралі саксонскай дынастыі — Аўгуст II і яго сын Аўгуст III. Пасля смерці апошняга (1763) пад ціскам царскай дыпламатыі каралём быў абраны фаварыт Кацярыны II Станіслаў Аўгуст Панятоўскі (1764), які стаў апошнім каралём Рэчы Паспалітай. Пры Кацярыне II адбыліся тры падзелы Рэчы Паспалітай. Па першаму падзелу (1772) да Расіі адышла Усходняя Беларусь, па другому (1793) — уся цэнтральная яе частка, па трэцяму (1795) — уся Беларусь, Літва, Курляндыя. Рэч Паспалітая загінула, кароль быў вывезены ў Гродна і ў хуткім часе адмовіўся ад кароны.

У 1812 г. цераз Беларусь праходзілі войскі Напалеона. Рускія войскі адступалі з баямі, асабліва жорсткая сутычка адбылася каля Міра.

У Гродне меў водгук і рух дзекабрыстаў. У марозны зімні дзень 24 снежня 1825 г. — праз 10 дзён пасля паўстання ў Пецярбурзе — адмовіліся прысягаць новаму цару салдаты Піянерскага батальёна. Капітан К. Г. Ігельстром у знак адмовы вывеў сваю роту з карэ. Так ажыццявілася спроба выступу створанага ў Гродне тайнага "Таварыства ваенных сяброў". Да ваеннага суда было прыцягнута 13 чалавек, чацвярых прысудзілі да расстрэлу. Мікалай I замяніў расстрэл 10 гадамі сібірскай катаргі з наступным вечным пасяленнем у Сібіры.

Гродзенская зямля шырока адгукнулася на паўстанне супраць царызму ў 1863 г. Рэвалюцыйным камісарам губерні быў прызначаны ўраджэнец Гродзеншчыны знакаміты Кастусь Каліноўскі (1838—1864), які кіраваў паўстаннем у краі і выдаваў нелегальную беларускую газету "Мужыцкая праўда". Па прысуду ваенна-палявога суда ён быў пакараны смерцю ў Вільні 10 сакавіка 1864 г.

У 1915—1919 гг. Гродзеншчына была акупаваная нямецкімі войскамі, заплаціла немцам вялізную кантрыбуцыю і ў 1919 г. была прададзена імі Польшчы. Польскі ўрад мала спрыяў эканамічнаму развіццю заходнебеларускіх земляў. Праўда, польскія даследчыкі, як мы ўбачым, вывучалі і кансервавалі многія помнікі беларускай архітэктуры (называючы іх польскімі), стварылі некалькі краязнаўчых музеяў (у тым ліку ў Гродне). Краіна пакрылася сеткай новых касцёлаў, якія будаваліся ў стылі сярэднявечнай готыкі.

У 1939 г. землі Заходняй Беларусі былі ўз'яднаныя з БССР, але ўжо ў чэрвені 1941 г. яны зноў былі акупаваныя, на гэты раз немцамі. Па ўсёй Беларусі разгарнуўся партызанскі рух, увосень 1941 г. на Гродзеншчыне створаны першыя партызанскія атрады. Пасля вызвалення краю ў ліпені 1944 г. пачалося мірнае жыццё.

З 1991 г. Беларусь будуе сваю новую незалежную дзяржаву.



# Помнікі Гродна і яго наваколля

# 1 частка

*"Городен погоре весь и церквы каменная от блистания молнии и шибения грома..."*

Іпацьеўскі летапіс, 1183 г.

Гродна — адзін з самых старажытных і найлепш ацалелых гарадоў Беларусі. Заснаваны ён у канцы X ст. Ужо пад 1116 г. летапісы называюць гродзенскага князя Усеваладка, а пад 1127 (1128) г. гавораць і аб самім горадзе. Яго назва выводзіцца ад дзеяслова "гарадзіць", "агароджваць" у сэнсе ўмацоўваць. Гэта аб ім гаворыць "Слова пра паход Ігаравы":

"Унылы голоси,
Пониче веселие,
Трубы трубят городенские..."

З XIII ст. у Гродне пачынаюць кіраваць князі літоўскага паходжання. Умацаваў-

шыся ў Гродне ў 1376 г., князь Вітаўт змагаецца з Ягайлам. Бачыў горад і крыжакоў: з 1284 г. і да пачатку XV ст. 11 разоў яны асаджвалі яго і толькі з 1410 г. пасля Грунвальдскай бітвы Гродна атрымлівае магчымасць мірнага развіцця. Горад заняў другое месца ў дзяржаве пасля Вільні. Пасля Люблінскай уніі



Гродна. Старая частка горада

(1569) Гродна ўвайшло ў склад новай дзяржавы — Рэчы Паспалітай. Пры каралі Стэфане Баторыі (1576—1586) гэты горад быў улюбёнай каралеўскай рэзідэнцыяй (1585—1586), тут у адбудаваным замку распрацоўваюцца планы барацьбы з Іванам IV. У 1655 г. Гродна занялі рускія войскі на чале з ваяводам Я. К. Чаркаскім, а яшчэ праз пяцьдзесят гадоў, у 1705 г., рускі цар Пётр I як саюзнік караля Аўгуста II сабраў тут свае галоўныя сілы супраць шведаў. У студзені 1706 г. шведскі кароль Карл XII фарсіраваў Нёман, блакіраваў Гродна, але ў сакавіку рускія вырушылі да Кіева. Каралі саксонскай дынастыі Аўгуст II (1670—1733) і яго сын Аўгуст III (1696—1763) бывалі тут і збудавалі побач са Старым замкам Новы. Часта прыязджаў сюды і апошні кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі (1764—1795). Паводле сведчання сучаснікаў, ён меў “больш схільнасцяў, чым ведаў і добрага густу”, але быў утрапёным апекуном літаратуры і мастацтва, а таксама збіральнікам самых разнастайных калекцый мастацкіх вырабаў. За яго часам было

збудавана шмат выдатных помнікаў архітэктуры. Тут у Гродне ў 1795 г. Станіслаў Аўгуст выракся сваёй кароны. Кацярына II ажыццявіла трэці падзел Рэчы Паспалітай: Гродна адышло да Расіі.

У эпоху напалеонаўскіх войнаў у горадзе назіралася незвычайнае ажыўленне — збіраліся расійскія войскі, набіраліся валанцёры, рыхтаваліся паходы. У пакойчыку гродзенскай карчмы можна было бачыць тонкага "юнака", які прыбыў сюды, каб паступіць у полк. Гэта была знакамітая дзяўчынакавалерыст Надзея Дурава (1783—1866). Яшчэ нядаўна яна была сціплай дачкой рускага памешчыка, дзяўчынай-амазонкай на сваім нязменным кані Алкідзе. З сумам глядзіць яна на гродзенскую Беларусь, якую тады яшчэ называлі Літвой: "Які галодны край Літва! Жыхары такія бедныя, худыя і запалоханыя, што без жалю нельга на іх глядзець. Гліністая зямля дрэнна адплочвае за цяжкія намаганні ўгнойваць і апрацоўваць яе, хлеб іх такі чорны... і змешаны з нечым калючым..." Вядомая гродзенская пісьменніца Эліза Арэшка (па-польску Ажэшка — 1842—1910) бачыла тое ж і праз 50 гадоў, у часы сваёй маладосці. У Людвінаве, на "Палескай раўніне", "...усялякі раз, калі я, выйдучы за вароты дома, бачыла на полі сялян, якія ідуць у тумане за сошкай, і чула іх працяглае пакрыкванне на валоў, мне станавілася так сумна і так шкада гэтых людзей, што я не магла ўтрымацца ад слёз,— успамінае яна.— Я адчувала такое дзіўнае жаданне пайсці... на гэтыя палі, падысці да гэтых цёмных, сагнутых, цяжка ідучых за сошкай постацяў і зрабіць... Я сама не ведала, што? Сказаць нешта, паціснуць руку?"

Цяпер пара пераходзіць да разгляду тых старажытнасцяў, якія нам захавала гісторыя Гродна.

**Гістарычная планіроўка Гродна.** Як вырастаў старажытны сярэднявечны горад? Цэнтрам прыцягнення ўсіх яго частак быў звычайна так званы дзядзінец — найстаражытная і найбольш умацаваная яго частка. У Гродне — гэта Замкавая гара, абароненая з двух бакоў рэкамі (Нёманам і яго прытокам Гараднічанкай), а з трэцяга боку — прыродным ярам, пераробленым у роў. На гары размяшчаўся княскі замак, да якога знізу на "Падоле" прырастаў неўмацаваны пасад з рамеснікамі і гандлярамі. Тут жа быў гарадскі рынак. Пад час небяспекі ўсё насельніцтва пасада, захапіўшы з сабой самае неабходнае і жывёлу, ратавалася ў замку, дапамагаючы яго абараняць. Горад Гродна разрастаўся

канцэнтрычнымі дугамі на ўсход ад дзядзінца. Мяжу сярэднявечнага горада звычайна фіксаваў “горад памёрлых” — гарадскі некропаль, які па меры разрастання горада пераносіўся далей, а месца ранейшага могільніка засялялася. Такой была стыхійная планіроўка старажытных гарадоў; пазней за яе межамі ўзнікала рэгулярная планіроўка вуліц, што сведчыла ўжо аб забудове горада паводле спецыяльнага плана. Як жа было ў Гродне?

Гісторыю разрастання Гродна добра відаць на сучасных планах горада, а найлепш на планах XVIII ст. На плане 1780 г., які склала А. Д. Квітніцкая пасля напружанай працы ў архівах, бачна ўсё, аб чым мы толькі што гаварылі: і дзядзінец на высокай Замкавай гары, і радыяльна-кальцавая планіроўка гандлёва-рамеснай часткі, якая прырасла да яго, і, нарэшце, пазнейшая рэгулярная частка. У 650 м ад старажытнага дзядзінца яшчэ нядаўна існавала Курганная вуліца (!). Гэта азначае, што менавіта тут, на мяжы радыяльна-кальцавой забудовы і “рэгулярнай“, ”геаметрычнай”, было некалі курганнае ўрочышча, якое з‘яўлялася ўскраінай горада. Яно нават узгадваецца ў Пісцовай кнізе Гродзенскай эканоміі 1560—1561 гг. Курганны абрад пахавання існаваў на Русі да XII—XIII стст., а гэта азначае, што нават у XVI ст. у Гродне яшчэ зберагалі магілы продкаў і не забудоўвалі могільнік! Вызначэнне месцазнаходжання курганоў заўсёды вельмі важна: яно паказвае, дзе канчаўся сярэднявечны горад у XII—XIII стст. Можна меркаваць, што ў Гродне (як і ўсюды) курганны могільнік ахопліваў тагачасную тэрыторыю горада шчыльнай дугой і размяшчаўся ў раёне сучасных бернардзінскага і езуіцкага кляштараў.

Асноўнай гарадской магістраллю тут у тыя далёкія часы была Замкавая вуліца, якая падводзіла да замка-дзядзінца. Горад ад пачатку быў усходнеславянскім і не дзіўна, што ў гэтай яго стыхійна вырасшай частцы з тых часоў размешчаны “пояс” праваслаўных цэркваў — сабор Прасвятой Багародзіцы, так званая Малая царква, праваслаўны манастыр. Уся пасадская частка горада, бліжэйшая да замка, вырасла ў эпоху Кіеўскай Русі. Гэта была самая ажыўленая частка горада — тут працавалі і гандлявалі, грузілі і разгружалі нёманскія судны. У XII—XIII стст. тут, у гушчы драўляных дамоў з каменнымі храмамі, быў рынак — улюбёнае месца сярэднявечных гараджан. Рынак, з яго шумам і крыкамі на розных мовах, рынак, з нязменнымі лірнікамі,

спевамі жабракоў... У гэтым сярэднявечным "клубе" можна было заўсёды даведацца аб усіх навінах бліжніх і далёкіх земляў, пабачыць розных людзей...

У XVI—XVII стст. пад час узмоцненага акаталічвання тэрыторыю старажытных курганоў ахвяравалі для будаўніцтва бернардзінскага і езуіцкага кляштараў. Аднак адна з вуліц атрымала назву Курганнай. У той жа зоне ўзнік кляштар брыгітак, але ён размясціўся трохі далей.

XVIII ст. унесла новыя дапаўненні ў планіроўку Гродна. На поўнач ад цэнтра ў раёне в. Гарадніцы А. Тызенгаўз пачаў будаваць свае мануфактуры, аб якіх мы яшчэ будзем гаварыць.

Збольшага азнаёміўшыся з развіццём планіроўкі Гродна (дэталёва яна распрацавана ў спецыяльным даследаванні А. К. Краўцэвіча (1991)), пяройдзем да гістарычных помнікаў асобных частак горада.

**Гара "Стары замак"** ("Замкавая гара") размеш-



Гродна. Замкавая гара і палац Ст. Баторыя

чана на высокім беразе Нёмана пры ўпадзенні ў яго р. Гараднічанкі. Гэта высокі (32 м) непрыступны ў старажытнасці пагорак, дзе сама прырода стварыла ўмовы для будаўніцтва замка-дзядзінца. Замак Гродна быў ключом да беларуска-літоўскага Панямоння, таму на яго, як мы ўжо ўпаміналі, шмат разоў нападалі крыжакі. Упершыню яны захапілі яго ў 1284 г., праз здраду ў горадзе. У далейшым ён быў адноўлены і ўжо ў 1296 г. адбіў тэўтонаў. Яшчэ шмат разоў гродзенская залога адбівала аблогу нямецкіх рыцараў-крыжакоў. Як паказаў М. А. Ткачоў, гэта адбылося ў тых жа 1296, 1305, 1311, затым — у 1328, 1364, 1373, 1375, 1390 гг. і г. д.

Вітаўт, як мы памятаем, валодаў Гроднам як сваёй бацькаўшчынай і адбудаваў тут новы магутны замак. У XVI ст. яго змяніла яшчэ больш магутнае збудаванне Стэфана Баторыя. Што ж засталося зараз ад гэтых замкаў?

У пачатку 1930-х гадоў гродзенскія ўлады змагаліся з пастаянным падмываннем берага Нёманам пад час паводак. Для гэтага ля падэшвы Замкавай гары бераг аблямавалі каменем, а схілы было вырашана падсыпаць зямлёй, узятай зверху з пляцоўкі гары, дзе тады быў двор музея. Працы ўзначаліў (1932—1936) стваральнік музея, яго першы



Гродна. Замкавая гара

дырэктар, археолаг-энтузіяст Ю. Ядкоўскі. З пачаткам земляных прац выявіліся магутныя "гатычныя" муры ўмацаванняў, зробленых з радоў буйных камянёў уперамешку з радамі цэглы. Мяркуючы па памерах цэглы, равесніцай умацаванняў была ніжняя частка маленькай аднаапсіднай царквы, рэшткі якой удалося расчысціць усярэдзіне замка. Цэгла з усіх гэтых збудаванняў належыць да канца XIV — пачатку XV ст., г. зн. да тых часоў, калі гродзенскім князем быў Вітаўт (1350—1430).

Раскопкі Ю. Ядкоўскага аказаліся такімі цікавымі, а знаходкі настолькі шматлікімі, што фінансаванне гродзенскіх даследаванняў працягвалася да канца 1930-х гадоў. Іх спыніла толькі вайна (1939).

Далейшыя адкрыцці былі сапраўды ашаламляльнымі. Ніжэй слаёў эпохі Вітаўта выявіліся унікальныя збудаванні часоў Кіеўскай Русі. Аказалася, што ў часы ўпамянутага намі Усеваладкі і яго сыноў частка ўмацаванняў замка была выканана не з дрэва, а з вузкай і доўгай цэглы-плінфы, змацаванай характэрнай для XII ст. ружовай "цэмянкай" (вапна, змешаная з тоўчанай цэглай). Усярэдзіне замка былі раскрытыя рэшткі княскага цаглянага "церама" і унікальнага помніка — трохапсіднай трохнефавай царквы — усе збудаваныя ў адной тэхніцы.

Аб унікальных адкрыццях Ю. Ядкоўскага пачалі пісаць многія еўрапейскія газеты. Аднак у 1936 г. выбухнуў вялікі навуковы скандал. Віленскі прафесар Ліманоўскі, наведаўшы раскопкі, высветліў, што метады даследавання Ю. Ядкоўскага далёкія ад сучаснай навукі. Старажытныя напластаванні не фіксуюцца, знойдзеныя рэчы з імі не звязваюцца, змешваюцца паміж сабой і застаюцца бяспашпартнымі і, такім чынам, для навукі бескарыснымі. Горш за ўсё было тое, што аўтар раскопак абкапаў знойдзеныя пабудовы метровымі траншэямі, адрэзаўшы іх ад слаёў, у якіх яны былі збудаваныя. Гэта ўскладніла вызначэнне даты пабудоваў... Некалькі дзён у вялізнай зале замка Баторыя праходзілі паседжанні, буйныя варшаўскія археолагі выступалі з сур'ёзнымі абвінавачваннямі супраць метадаў даследавання Ю. Ядкоўскага. У выніку ён быў адхілены ад раскопак і ад'ехаў. Яго замяніў малады варшаўскі археолаг Здзіслаў Дурчэўскі, які працягваў працы на сучасным узроўні.

Гара "Стары замак" — унікальны запаведнік разнастайных археалагічных і архітэктурных старажытнасцяў, пачынаючы

ад часоў першых гарадзенскіх князёў і канчаючы збудаваннямі часоў Баторыя (XVI ст.). Да таго ж у яе нетрах захоўваецца незлічонае мноства бытавых рэчаў старажытнасці. Гэта, натуральна, працягвае хваляваць навукоўцаў і ў наш час. П. А. Рапапорта — археолага з Санкт-Пецярбурга, беларускіх археолагаў М. А. Ткачова, А. А. Трусава, А. К. Краўцэвіча ў апошнія гады тут чакалі новыя адкрыцці: высветлілася, што гродзенскі замак быў заснаваны на месцы паселішча X—XI стст., што першыя ўмацаванні ў горадзе былі драўляна-землянымі, іх знішчылі магутныя пажары і сцяна з плінфы была ўзведзена ў тым жа XII ст. непасрэдна на гэтым пажарышчы. Побытавыя рэчы з наслаенняў XI—XIII стст. дазваляюць вывучаць жыццё горада ва ўсёй яго разнастайнасці: вызначыць краіны, з якімі гандляваў горад, высветліць характар гарадскога рамяства, гандлю і г. д. Арыгінальных рэчаў мноства. Найбольш цікавыя знаходкі, звязаныя з рэлігіяй: бронзавыя накладкі ад алтарнай перагародкі (іканастасы з‘явіліся пазней) з гравіраванымі выявамі святых Паўла, Сімяона, літыя фігуркі Дзмітрыя Салунскага, Хрыста, пласціны з гравіраванымі арнаментамі, крыжы-энкалпіёны (складні), лампада і інш. Варта адзначыць унікальную касцяную шахматную фігурку ў выглядзе старажытнарускай ладдзі памерам у 5,5 см з маленечкімі фігуркамі воінаў і міндалепадобнымі шчытамі, павешанымі на бортах. “Форма і характар ладдзі цалкам адпавядаюць таму, што мы ведаем па крыніцах XII—XIII стст. аб рускіх рачных караблях асаблівага тыпу, якія прызначаліся для бою на вадзе” (М. М. Варонін). Сярод знаходак ёсць і рэчы з надпісамі: гэта ўжо названыя пласціны з імёнамі святых, кавалак звона з надпісам “рабоу”, прасліца з надпісам “Г(оспод)и, помози рабе своеи недан...” Гэты надпіс чыталі па-рознаму: “рабе своей и не дай” (загінуць у дзень судны?) — З. Дурчэўскі, “рабе своей Иелене” — В. Л. Янін. А. А. Медынцава апублікавала надпіс на шкатулцы Сафіі Ноўгарадскай — “Недан писал” і высветліла, што гэтае імя захавалася ў Польшчы. На рэдкіх вядомых прасліцах з надпісамі звычайна ставілася імя ўладальніцы, значыць, на Русі існавала жаночая форма імя Недан — Недана; яно і стаіць на гродзенскім прасліцы ў давальным склоне і яго апошняя літара “Ѣ” не ўдалася таму, хто пісаў надпіс. Значыць, трэба чытаць: “Г(оспод)и, помози рабе своеи Недане“.

Надзвычайныя адкрыцці на гродзенскім дзядзінцы прыцягнулі ўвагу і гісторыкаў архітэктуры. З 1936 г. тут пачаліся

гісторыка-архітэктурныя даследаванні вядомага навукоўца Яраслава Вайцэхоўскага. Іх вынікі таксама пераўзышлі ўсе спадзяванні: аказалася, што пад замкам Баторыя (XVI ст.) цалкам захаваліся ніжняя часткі палаца Вітаўта (XIV ст.), а некаторыя яго часткі ўвайшлі ў муры пабудовы часоў Баторыя.

Я. Вайцэхоўскі апублікаваў свае цікавейшыя даследаванні ў 1938 г., а працам З. Дурчэўскага лёс не спрыяў: у 1939 г. пачалася другая сусветная вайна, а ў 1944 г. даследчык загінуў пад час Варшаўскага паўстання. Шматлікія рэчы, знойдзеныя на замку, доўга ляжалі закінутыя. Да парадку іх прывялі ў другой палове 40-х гадоў польскія археолагі У. і А. Галубовічы, затым ваўкавыскі археолаг Г. І. Пех, а таксама аўтар гэтых радкоў.

У 1949 г. група маскоўскіх археолагаў на чале з М. М. Вароніным завяршыла раскопкі польскіх калегаў. У выніку з‘явілася кніга М. М. Вароніна “Древнее Гродно”.

Падымемся на гару “Стары замак”, пройдзем па арачным мосце, затым у праём варотаў палаца ў двор, пазнаёмімся з рэшткамі замка Вітаўта, падымемся на велічныя руіны замкавых сценаў. Вялікі горад тут амаль не чутны — вулічны шум



Гродна. Від на Нёман і Каложскую царкву XII ст. (Фота аўтара)

далятае сюды толькі аддаленым гулам. Грубы каменны мур сярэднявечных сценаў паказвае, якім магутным, суровым і непрыступным быў гродзенскі замак у XIV ст. і ў больш познім сярэднявеччы. А ўнізе ля падэшвы гары — поўная супрацьлегласць — мірны і спакойны Нёман з веку ў век нясе свае магутныя воды. Яму няма справы, чым на яго берагах займаецца чалавек — якія замкі, палацы, цэрквы будуе, якія вядзе войны... Вадзяное люстэрка кідае ўгору сонечныя зайчыкі, якія дасягаюць старадаўніх замкавых муроў. На двух далёкіх ад замка мастах, якія як бы нітачкамі працягнуліся праз раку вышэй і ніжэй замка, відныя дробныя сілуэты нячутных тут машын... Воддаль ад замка на нашым баку відаць сціплы будынак царквы, частка якой зробленая з дрэва, а другая — з цэглы. Гэта знакамітая Каложская царква XII ст. Мы яшчэ дойдзем да яе. Тут жа наверсе час спыніўся. Мы глядзім уніз з гэтага адхону і стараемся ўявіць той даўні замак са сценамі, вежамі, вартай на іх. Колькі разоў вось так у цішы, стараючыся не грымець зброяй — дзідамі, мячамі, падбіраўся сюды на золку вораг-крыжак, закаваны ў латы, прыкрыты шчытом! Колькі разоў поўз ён у начной цішы па гэтай кручы да сценаў, а ў замку раптам грымеў роў рагоў — варта на сценах трубіла трывогу!.. Колькі тут было сутычак, колькі людзей развіталася тут з жыццём!

Вось мы спускаемся ў замкавы, цяпер музейны, двор. Што тут засталося ад былых часоў? Шмат што! Вось тыя нізкія драўляныя збудаванні хаваюць рэшткі трох старажытных пабудоваў, раскапаных яшчэ Ю. Ядкоўскім і клапатліва захаваных для нас польскімі рэстаўратарамі ў павільёнах. Тут і рэшткі двух цэркваў, якія паслядоўна змянілі адна другую, і нават руіны княскага палаца-церама.

**Ніжняя царква.** Найбольш унікальным помнікам Гродна з‘яўляецца старажытная царква XII ст., названая па свайму размяшчэнню ў раскопках “Ніжняй”. Яе сцены — надзвычай рэдкі выпадак — па нейкай невытлумачальнай выпадковасці захаваліся на вышыню да 4 м! Гэта быў невялікі шасцістоўпны, трохнефавы аднакупальны храм з даволі плоскай сярэдняй і ўнутранымі бакавымі апсідамі. Звонку ён, несумненна, рабіў моцнае ўражанне на сучаснікаў: сцены паводле візантыйскай традыцыі не тынкаваліся, тонкія цагліны (плінфа), пакладзеныя на ружовай цэмянцы (вапна з тоўчанай цэглай), стваралі ўражанне мігатлівай паверхні. У ніжнія часткі сценаў уведзены вялізныя, гладка абчэсаныя звонку



Гродна. Ніжняя царква XII ст. Раскопкі Ю. Ядкоўскага і Зд. Дурчэўскага

дэкаратыўныя каляровыя камяні, што хоць і аслабляла мур, але вопытных майстроў не заклапочвала — рашчына, якая звязвала муры і каменні, дазваляла гэта. Вышэй размяшчаліся рознакаляровыя геаметрычныя кампазіцыі з маёлікавых плітак. Вузкія арачныя вокны асвятлялі інтэр'ер. Пабудова завяршалася свінцовым дахам, лісты якога перакрывалі яе па закамарах, вышэй патрэбна ўявіць главу храма з крыжам на макаўцы.

Інтэр'ер храма быў не менш імпазантны. Вернік, зайшоўшы ў храм, трапляў у шырокі сярэдні неф, які канчаўся алтарным паўкружжам. Уся падкупальная прастора падлогі кідалася ў вочы дзівосным дыванам, створаным з рознакаляровых маёлікавых плітак. Такія падлогі — рэдкая знаходка археолагаў (напрыклад, яшчэ Дабравешчанскі сабор XII ст. у Чарнігаве з выявай паўлінаў у раскопках Б. А. Рыбакова). "Маёлікавы дыван падкупальнай часткі падлогі,— пісаў М. М. Варонін, — па прыгажосці і складанасці пакуль не ведае сабе роўных у помніках іншых абласцей XII ст." Малюнак "дывана" ўдалося рэканструяваць археолагу М. У. Малеўскай. Па адрэзках плеценай ленты, якія ўтварылі квадраты і прамавугольнікі з упісанымі ў іх кругамі (ацалела 4), а таксама па

рэштках квадратных “шахматных” дыванкоў па кутах ёй бліскуча ўдалося аднавіць увесь складаны дэкор падлогі цэнтральнай часткі храма. Больш за ўсё плітак жоўтага, вішнёвага і зялёнага колераў. Гама “дывана” тонка кантраставала са светла-ружовай вымасткай астатняй часткі храма. Царква, відавочна, не была распісана фрэскамі, на яе сценах проста была заглажана рашчына са швоў паміж цаглінамі. У верхнія часткі сценаў, у скляпенні былі ўмураваныя спецыяльныя рэзанатары — збаны-галаснікі, выведзеныя адтулінамі ў сярэдзіну храма. Такім чынам дасягаўся выключны акустычны эфект. Кавалкі галаснікоў у вялікай колькасці знаходзяць пад час раскопак. У паўднёва-заходняй частцы помніка відаць памяшканне, у сярэдзіне якога размяшчалася вінтавая лесвіца, што вяла на хоры. Лесвіца была абгароджаная сцяной з плінфы. Ювелірныя раскопкі М. М. Вароніна дазволілі вызначыць, што, мяркуючы па фрагментах муроўкі і керамічных плітках, хоры былі скляпенчатымі, яны адкрываліся ў падкупальную прастору дзвюма аркамі, якія абапіраліся на васьміграннь прасценак. Мноства фрагментаў плінфы і будаўнічага смецця на поўнач ад помніка і адсутнасць іх з паўднёвага боку паказвае, што ўвесь будаўнічы матэрыял размяшчаўся на поўнач ад будаўнічай пляцоўкі.

Калі ж быў збудаваны храм? Калі ён загінуў? На першае пытанне адназначнага адказу няма. Аўтар раскопак М. М. Варонін вызначыў час будаўніцтва на другую чвэртку XII ст. Але гэта было ў 1949—1953 гг. (калі былі раскопкі і выйшла кніга аб іх). Цяпер жа П. А. Рапапорт, зыходзячы, відавочна, з характару плінфы, адносіць будаўніцтва да трэцяй чвэрці XII ст. Разбурыўся храм імгненна: пад час раскопак удалося расчысціць у сярэдзіне храма адзін са слупоў, які пры катастрофе ўпаў і накрыў сабой той дзіўны “дыван” маёлікавых плітак, аб якіх мы гаварылі. Стала зразумелым, што менавіта аб гэтай царкве гаворыць летапісец: у лета 1183 “Городен погоре весь и церквы каменная от блистания молнии и шибения грома“. Дата гібелі храма стала відавочнай — 1183 г.

**Княскі церам XII ст.** Трохі пазней за Ніжнюю царкву, на поўдзень ад яе ля краю замка, ля сцяны над Нёманам раскопкі Ю. Ядкоўскага адкрылі яшчэ адзін будынак з плінфы на цэмянцы — рэшткі княскага палаца-церама. Ён быў узведзены ў самай непрыступнай частцы замка. Як і Ніж-



Гродна. Рэшткі княскага палаца XII ст. на Замкавай гары.
Раскопкі Ю. Ядкоўскага

няя царква, палац з вонкавага боку быў упрыгожаны паясамі шліфаваных камянёў. Паколькі палац размяшчаўся ля сцяны над Нёманам, М. М. Воронін палічыў яго за абарончую вежу. Аднак новыя даследаванні, праведзеныя ў 1981 г. А. А. Трусавым і П. А. Рапапортам, высветлілі, што меў рацыю першы даследчык — Ю. Ядкоўскі: гэта рэшткі княскага палаца-церама. У меншым памяшканні церама выяўлена падлога з плінфы, у большым — маёлікавая. Збудаваны палац у другой палове XII ст.

**Умацаванні замка эпохі Кіеўскай Русі.** Яшчэ ў 1930-х гадах на захад ад палаца быў знойдзены невялікі ўчастак сцяны, які М. М. Воронін вызначыў як рэшткі кутняй вежы замка старажытнарускіх часоў. Беларускія археолагі А. А. Трусаў, М. А. Ткачоў, А. К. Краўцэвіч у 1985—1987 гг. прадоўжылі вывучэнне ўмацаванняў Старога замка. У 1985 г. удзел у даследаваннях прымаў ленінградскі археолаг Л. М. Бальшакоў. Акрамя іншага была даследавана і сцяна на мысе гары. Яна ацалела на даўжыню ў 12 м і складзена з плінфы на цэмяначнай рашчыне. Гэта пабудова не мае падмурка, а пастаўлена на тонкай праслойцы будаўнічага смецця. Сцяна не мае аналагаў ва ўсходнеславянскай архітэктуры. Узведзеная ў XII ст. на грэбні абарончага вала, яна,

такім чынам, мела абарончы характар, а таксама, на думку некаторых даследчыкаў (А. А. Трусаў), магла мець і пэўны дэкаратыўны характар.

Яшчэ адно загадкавае для нас збудаванне з плінфы выяўлена ва ўсходняй частцы Замкавай гары каля схілу за ўсходняй сцяной палаца XVI ст. Прызначэнне знойдзенай сценкі даўжынёй у 4 м і размешчанай перпендыкулярна схілу пакуль засталося не высветленым. Хутчэй за ўсё гэта рэшткі вежы, якая паказана на гравюры горада 1568 г., выкананай па малюнку Мацвея Цюндта, прыблізна на гэтым месцы. Аднак вежа на малюнку паказана круглай, а знойдзеная археалагамі — прамавугольная.

Аб названай вежы сведчыць і летапісец: пад 1277 г. ён паведамляе, што ў гродзенскім замку "столп(...) бе камен высок, стоя перед вороты города", і да іх вораг не мог наблізіцца — "побивають бо со столпа того..." Раскопкі паказалі, што "столп" знаходзіўся не каля самых гарадскіх варотаў, а



Гродна. Стары замак часоў Вітаўта (XIV—XV стст.).
Рэканструкцыя Я. Вайцэхоўскага

трохі ўбаку. Можна меркаваць, што ён быў разабраны пад час будаўніцтва замка Баторыя.

**Замак Вітаўта.** Лёс найстаражытнага гродзенскага замка (XII—XIII стст.) нам амаль невядомы. Мажліва, ён праясніцца пасля спецыяльных мэтанакіраваных даследаванняў беларускіх археолагаў. Зараз жа вядома, што частка абарончай сцяны была драўлянай.

Замак Вітаўта, вялікага князя літоўскага (1392—1430), быў, па ўсёй верагоднасці, магутным. Даследаванні археолагаў і вывучэнне яго фрагментаў, уключаных пазней у палац Стэфана Баторыя (XVI ст.), паказваюць, што ён быў збудаваны з вялізных валуноў, перакладзеных радамі вялікапамернай цэглы, меў пяць вежаў, тры з якіх стаялі па кутах, а дзве размяшчаліся з боку Нёмана. Вежа, упамянутая ў летапісе пад 1277 г., мяркуючы па згаданай гравюры, стаяла каля аднаго з кутоў палаца, была моцна высунутая вонкі і, такім чынам, ахоўвала не толькі палац, але і ўезд у замак.



Гродна. Стары замак часоў Ст. Баторыя (XVI ст.). Рэканструкцыя Я. Вайцэхоўскага

Палац князя прымыкаў да яе і злучаўся з вежай праз другі паверх. З другога паверха палаца меўся пераход таксама да брамнай вежы. На думку Я. Вайцэхоўскага, муроўка сценаў замка блізкая да муроў прыбалтыйскіх, а дакладней літоўскіх, замкаў. За панаваннем Баторыя палац Вітаўта быў амаль цалкам разабраны, толькі ў двух месцах часткі яго ўключылі ў новы палац, збудаваны паводле тагачасных новамодных архітэктурных павеваў. З тарца паўночнай сцяны палаца Вітаўта захавалася частка "гатычнай" вежы і невялікага акна, з паўднёвага тарца відаць пераход да брамнай вежы. Археолагі расчысцілі ніжнія часткі сценаў палаца Вітаўта, перакрытыя палацам Баторыя (намнога большым па плошчы), і яшчэ ў 1950-я гады гэтыя муры паказваліся наведвальнікам музея ў падвалах будынка. У апошнія гады я не аднойчы быў у Гродне і дапытваўся ў старых супрацоўнікаў: дзе ж гэтыя унікальныя рэшткі замка Вітаўта? Мне адказалі, што ў "часы застою" (1970-я гады) малакваліфікаванае кіраўніцтва не цаніла гэтыя руіны — сутарэнні палаца былі прыстасаваны пад... распранальню для наведвальнікаў (!), якая частка помніка пры гэтым загінула, ніхто сказаць не мог...

Мы ўжо хадзілі па сценах умацаванняў Вітаўта, бачылі, якіх значных высілкаў каштавала збудаванне такога замка — гіганцкай па тых часах цытадэлі. Здабыча і апрацоўка мноства валуноў, дастаўка іх ў горад на вазах, вытворчасць цэглы, вапны, само будаўніцтва — усё гэта было неабходна для дзяржаўнай абароны і ажыццяўлялася феадальна-залежным насельніцтвам, галоўным чынам селянінам-беларусам. У выніку быў збудаваны замак з пяццю вежамі (адна — брама), які прастаяў, супраціўляючыся ворагам, 150 гадоў, а яго абарончыя сцены выкарыстоўваліся і пазней.

**Верхняя царква.** У пачатку XV ст. пры Вітаўце руіны Ніжняй царквы, якія прастаялі неразабранымі шмат дзесяцігоддзяў, былі засыпаныя і на тым месцы ўзвялі новую, так званую Верхнюю царкву — унікальны праваслаўны помнік, збудаваны, на думку даследчыкаў, у модным тады стылі позняй готыкі (помнікі такога тыпу мы яшчэ ўбачым).

Да гонару польскіх даследчыкаў трэба сказаць, што каштоўнасць гэтага помніка была для іх відавочнай з самага пачатку. Але руіны Верхняй царквы перашкаджалі раскрыццю Ніжняй царквы, было вырашана перасунуць іх. Паводле арыгінальнага плана будынак распілавалі і перанеслі ў асобны



Гродна. Верхняя царква часоў Вітаўта (XIV ст.). Раскопкі Ю. Ядкоўскага. (Фота Ю. Ядкоўскага)

павільён у двары замка, дзе і можна зараз пабачыць помнік. Гэта невялікі квадратны ў плане храм без слупоў з адной вялікай апсідай і зрэзанымі кутамі. Квадратны план — характэрная рыса ўсходнеславянскіх помнікаў, падобныя маленькія капэлы Заходняй Еўропы маюць прамавугольныя формы. Скошаныя куты — своеасаблівасць гродзенскага помніка. У адрозненне ад Ніжняй царквы муры Верхняй складзены вельмі неахайна, выкарыстоўвалася вялікапамерная цэгла на вапнавай рашчыне. У муроўцы ўнутраных сцен апсіды выклікаюць цікавасць дзве арыгінальныя аркі.

**Замак Стэфана Баторыя** дажыў да нашых дзён, хоць і страціў свой велічны першапачатковы выгляд. Пад час узвядзення яго абарончых сценаў выкарыстоўвалі матэрыял часоў Вітаўта. Найбольш цікавай пабудовай замка з'яўляецца палац Баторыя (зараз гісторыка-археалагічны музей). Памеры палаца большыя за аналагічную пабудову Вітаўта — 60×21 м. Будынак стаіць на сценах палаца Вітаўта і ў некаторых месцах апошнія выкарыстаны ў якасці падмурка. На думку Я. Вайцэхоўскага, "план новай пабудовы як бы гвалтоўна ўціснуты ў раму гатычных сценаў". Побач з жылой част-



Гродна. Замак Ст. Баторыя (XVI ст.). (Фота Ю. Ядкоўскага)

кай палаца размяшчаліся нейкія флігелі, але слядоў ад іх не захавалася. Як мы ўжо ўпаміналі, ад старога палаца засталося толькі дзве часткі: з боку Гараднічанкі пакінулі вялікі блок абарончых сценаў з часткай квадратнай вежы, узмоцненай контрфорсам; у гэтай вежы захавалася адно акно (другое закладзена). Другая частка захавалася паблізу брамнай вежы.

Магутныя сцены замка XVI ст. трымаюць цяжар скляпенчатых перакрыццяў, таму таўшчыня іх дасягае 2,35 м. Частка іх, размешчаная з боку Гараднічанкі, была пашкоджана ў 1655 г. ад абстрэлу замка маскоўскімі гарматамі і ў XVIII ст. яны былі перакладзены. Тады ж у палацы збудавалі некалькі дадатковых перагародак. Палац Баторыя, збудаваны ў стылі палацаў эпохі Рэнесанса, меў свае асаблівасці. Доўгі і аднастайны фасад будынка прымусіў архітэктара адмовіцца ад традыцыйнага ганка з аркадамі і замяніць яго рызалітам, які выдзяляў сярэднюю частку фасада і хаваў у сабе лесвіцу на другі паверх. Першы паверх складаецца з дзесяці памяшканняў. З параднага квадратнага ў плане вестыбюля левыя дзверы вялі ў вялікую залу з сямю вокнамі і скляпеннямі на двух васьміграных слупах (зараз яны ўключаныя ў перагародкі). Усходні слуп пастаўлены на падмурку сцяны Вітаўта, заходні абапіраецца на ўласны падмурак. Дзверы з вестыбюля насупраць увахода вялі ў прамавугольнае памяшканне з двума вокнамі, дзе, мяркуючы

па вопісу 1653 г., захоўвалася сталовае срэбра. Памяшканне ў выглядзе няправільнай трапецыі каля службовай лесвіцы (з боку Гараднічанкі) адводзілася для архіва. Такая форма пакоя атрымалася ў выніку ўключэння часткі палаца Вітаўта ў баторыеўскі палац. На антрэсолях тут было памяшканне для вартаўнікоў. Астатнія пакоі ніжняга паверха прызначаліся для гаспадарчых і ваенных патрэб. Кардэгардыя каля ўезда была пабудаваная пазней (упамянутая толькі ў інвентары 1680 г.), і гарнізон пакуль размяшчаўся ў памяшканнях побач з ім. Другі паверх палаца займаў сам кароль, і вопіс замка 1653 г. дае магчымасць зразумець прызначэнне ўсіх размешчаных тут пакояў. Гэта і "ганак з вялікай лесвіцай", і вестыбюль, і сталоўка, і "маленькі вестыбюль", і "пакой з боку горада" з "вынасным алькежам", і "трэці бакавы пакой", і пакой для "драбантаў" (целаахоўнікаў), і "пакой на ўсход сонца з боку горада"— каралеўская спальня з эркерам, дзе 12 снежня 1586 г. памёр Стэфан Баторый. Усе пакоі караля — тыповая палацавая анфілада, якую ўдаецца аднавіць, галоўным чынам праз упамянуты вопіс.

Я. Вайцэхоўскаму ўдалося рэканструяваць і вонкавыя фасады пабудовы Баторыя. Яны не былі сіметрычнымі: цэнтрам кампазіцыі з боку горада быў алькеж. Цэнтрам кампазіцыі дваровага фасада з'яўляўся рызаліт у яго сярэдняй частцы, але ён быў значна пасунуты ў бок брамы. Як высветліў Я. Вайцэхоўскі, прапорцыі і ўпрыгожанні вокнаў фасада характэрныя для эпохі Рэнесансу, прычым вокны ніжняга паверха ўпрыгожанняў не маюць (у адрозненне ад верхніх, за якімі былі каралеўскія пакоі). Куты палаца былі ўзмоцненыя контрфорсамі, а на ўзроўні другога паверха — счасаныя пад вуглом у 45 градусаў. Да счасанай часткі прыстаўляўся алькеж васьміграннай формы. Яго восем арачных вокнаў падкрэсліваліся контурным арнаментам разьбы па каменю. Увесь будынак, мяркуе Я. Вайцэхоўскі, завяршаў высокі рэнесансны атык, дакладней ступенчаты франтон. У сваім першапачатковым выглядзе палац, несумненна, выглядаў вельмі ўнушальна, дэманструючы магутнасць і веліч караля.

Палац Стэфана Баторыя адыгрываў важную ролю ў дзяржаве. Яго сцены бачылі паслоў Івана Грознага і сеймаў Рэчы Паспалітай (XVII ст.). У 1705 г. тут адбывалася знакамітая сустрэча Пятра I з каралём Аўгустам II і ўзнік саюз двух манархаў супраць Карла XII. У 1708 г. шведскі кароль захапіў Гродна і разбурыў Стары замак. Адноўленую

пасля адыходу шведаў частку замка кароль перадаў ніжэйшым службовым асобам сваёй канцылярыі, а сам перайшоў у палац Сапегаў (насупраць езуіцкага касцёла). У Сапегаў палац адабралі, таму што яго гаспадар быў прыхільнікам партыі, варожай Аўгусту II.

**Новы замак** высіцца насупраць Старога — цераз роў з перакінутым праз яго мостам. У XIV—XV стст. пры Вітаўце тут размяшчаўся т. зв. Ніжні замак, які ўжо тады страціў сваё ваеннае значэнне. На яго месцы быў збудаваны "Дом караля" ("Domus regium"), пры ім капліца, а ў каменнай вежы — турма. Увесь Ніжні замак быў абведзены мураванымі сценамі. Да канца XVII ст. гэтых збудаванняў ужо не было. На месцы "каралеўскага дома" стаяў драўляны дом Асалінскага — важнага чыноўніка пры каралі. Мяркуючы па існуючых чарцяжах, пачатковы палац Аўгуста II быў задуманы невялікім. Аднак пры гэтым каралі ён не быў скончаны і толькі пры яго сыне Аўгусце III пасля доўгіх дыскусій, распрацоўкі некалькіх варыянтаў праекта будаўніцтва прадоўжылі. Яно закончылася ў 1742 г. узвядзеннем уязной брамы з дзвюма кардэгардыямі. Гэта быў самы вялікі палац на Беларусі. У 1768 г. сейм выдзеліў асобыя сродкі для падтрымання палаца, а новы гродзенскі архітэктар Дж. Сакка склаў дэталёвы вопіс "Гродзенскага замка з флігелямі, да яго прыналежнымі".

Гісторыя Новага замка цесна звязаная з апошнім каралём Рэчы Паспалітай Станіславам Аўгустам Панятоўскім. Мы памятаем, што па смерці Аўгуста III (1763) ён быў пасаджаны на трон з дапамогай Кацярыны II (1764). У канцы XVIII ст. часы змяніліся і пасля ўзяцця Варшавы Суворавым (6 лістапада 1794 г.) кароль пісаў да рускай імператрыцы: "Лёс Рэчы Паспалітай у Вашых руках, якім бы не быў лёс, які прызначаеце Вы мне асабіста, я не магу забыць свайго абавязку перад маім народам, умольваючы за яго велікадушнасць Вашай імператарскай вялікасці". Указваючы на небяспеку, якой быццам падвяргаўся кароль "сярод раскілзанага народа варшаўскага", руская імператрыца ў адказ патрабавала, каб ён "як мага хутчэй пераехаў з гэтага вінаватага горада ў Гродна". Так пачаўся двухгадовы ганаровы палон караля ў Новым замку. Урэшце, усё было абстаўлена з помпай: "Пры ўездзе яго вялікасці сюды,— прадпісваў начальніку гродзенскіх войскаў генералу Цыцыянаву генерал-губернатар Рэпнін,— павінны стрэліць сто адзін раз халастымі

зарадамі, а войска, як грэнадзёры, так і драгуны, пехам пры праездзе яго ў прыстойных месцах былі пастаўлены пад ружжо, аддаючы яму гонар, як належыць гаспадару з барабанным боем і нахілам сцягаў“. ”Для жыцця яго вялікасці з фамілiяй і світай вызначаецца тутэйшы палац з яго прыналежнасцямі,— пісаў Рэпнін прыстаўленаму да караля князю І. А. Безбародку.— ...Пры прыездзе яго вялікасці ў тутэйшы горад, Ваша сіяцельства, майце сустрэць яго ў палацы, дзе я роўным чынам буду і Вас яму прадстаўлю...“ Увесь горад быў пастаўлены на ногі. Доўгі поезд з некалькіх дзесяткаў карэт уехаў у Гродна 31 снежня 1794 г. Усё адбылося паводле патрабаванняў цыркуляра: гарматы і барабаны грымелі, сцягі былі ”нахіленыя“, перад палацам стаялі Рэпнін і Безбародка, у палацы чакала шматлікая прыслуга... Не было толькі Рэчы Паспалітай!.. Але кароль даволі хутка асвоіўся са сваім новым становішчам. Са штодзённых запісаў Безбародкі мы ведаем, як кароль бавіў свой час. Ён не меў дазволу сустракацца з іншаземцамі, але польскай (і рускай) знаці перабывала ў яго мноства. Госці таўкліся ў палацы з раніцы да позняй ночы. Акрамя сваёй прыхільнасці да мастацтва кароль яшчэ любіў прыроду і пачынаючы з зімы 1795 г. штодзённа выязджаў на прагулку верхам ці ў карэце (як правіла, двойчы ў дзень). Вось адзін з запісаў дзённіка Безбародкі. ”Лістапада 14. У 11 гадзін яго вялікасць выходзіў у замкавую капліцу слухаць імшу. Яго сіяцельства галоўнакамандуючы прыслаў свайго генерал-ад‘ютанта Інзава за сакратаром Фрызам. Абедалі ў караля: падскарбі Дзяконскі і пан Пачабут. Выязджалі з палаца: граф Мнішак, ген. Гаржынскі (і інш.). Пан Аксамітоўскі прыехаў з Варшавы, а ад‘ютант Грабоўскі з братам са сваёй вёскі...“ Безбародка не ўпамянуў, навошта ў караля быў расійскі галоўнакамандуючы і чаму спатрэбіўся сакратар Фрыз: у гэты дзень у іхняй прысутнасці, а таксама графаў Мнішка і Машынскага Станіслаў Аўгуст Панятоўскі — апошні кароль Рэчы Паспалітай падпісаў у гродзенскім Новым замку сваё адрачэнне ад кароны. Не дзіўна, што ў наступныя дні ён не выходзіў з палаца на прагулкі. Толькі за 19 лістапада стаіць запіс у дзённіку яго наглядчыка: ”Яго вялікасць (велічаюць па-ранейшаму!) у 11 гадзін раніцы са звычайным суправаджэннем выязджаў прагульвацца і вярнуўся ў першай гадзіне“. Пасля ад‘езду былога караля ў Пецярбург (15 лютага 1797 г.) ад‘ехаў і Безбародка, склаўшы поўны вопіс маёмасці, якая засталася ў

Старым і Новым замках. Улюбёны каралём езуіцкі касцёл быў ператвораны ў фарны, палацы і некаторыя дамы перайшлі ў ведамства расійскай казны.

Каштоўныя зборы архітэктурных чарцяжоў часоў Аўгуста II і Аўгуста III, якія захоўваюцца ў Галоўным Саксонскім архіве ў Дрэздэне, даюць магчымасць уявіць, як у тыя часы выглядаў гродзенскі Новы замак. Першым яго архітэктарам, як мяркуюць, быў ананімны аўтар. Пасля 1736 г. (пры Аўгусце III) над палацам працавалі Карл Фрэдэрык Пёпельман (1690—1750), якога часта блытаюць з яго бацькам Матэўшам Даніэлем (1662—1732), а таксама Іаахім Хрысціян Яўх (1684—1754). Пасля 1750 г. над замкам рупіліся Ян Фрэдэрык Кнобель (1724—1792) і той жа Яўх.

П-падобны ў плане палац быў характэрнейшай пабудовай позняга барока. За курданёрам па галоўнай восі размяшчаўся цэнтральны ўваход, за якім ішоў вялікі вестыбюль з трыма выйсцямі да параднай лесвіцы, у буфет, у авальную так званую Круглую залу — сталоўку на 60 чалавек. Гэта было шыкоўнае памяшканне з сіметрычнымі паглыбленнямі для дзвярэй і вокнаў. Там, дзе іх не было, іх імітавалі нішы з люстэркамі. Сярэднія дзверы вялі ў парк, левыя — у замкавую капліцу, правыя — у пярэдні пакой, звязаны з буфетам, сталоўкай (з двара) і салонам-пярэдняй для сенатараў. Далей (з вонкавага боку) размяшчаўся аўдыенц-зал караля з тронам, а за ім каралеўскія апартаменты: кабінет, сталоўка са спальняй, малы гардэробны пакой. У канцы крыла размяшчаліся пакоі каралевы (кабінет, аўдыенц-зал і інш.). Больш выкарыстоўвалася левае крыло палаца. Тут, за параднай лесвіцай, быў праход да залы сенатараў (каля вонкавага боку будынка), таксама да "канферэнцыйнай" і пасольскай залаў. Далей ішлі памяшканні, прызначаныя "для кухні і іншых гаспадарчых патрэбаў". Авальны салон, сенатарская і пасольская залы асвятляліся з двух бакоў. Асабліва шыкоўнай была сенатарская зала з зашклёнай галерэяй зверху, прызначанай для каралевы, яе атачэння і замежных паслоў. Не забудзем, што палац прызначаўся таксама для паседжанняў сеймаў і першы гродзенскі сейм Станіслава Аўгуста прайшоў у палацы ў 1768 г. Пры гэтым каралі ў архітэктуру палаца былі ўнесеныя некаторыя змены. Інтэр'ерам палаца займаўся ўжо вядомы нам архітэктар Джузэпе Сакка. На заканчэнне трэба сказаць, што першы варыянт палаца Новы замак (пры Аўгусце II і Аўгусце III) будаваўся пад моцным уплывам французскага ма-



Гродна. Брама Новага замка. (Фота аўтара)

стацтва эпохі Людовіка XIV і Людовіка XV. Аўгусты не выказвалі асаблівай цікавасці да гродзенскага палаца, усю сваю ўвагу яны аддавалі Дрэздэну і Варшаве, а апошні кароль Станіслаў Аўгуст быў улюбёны ў Лазенкі. Гэтым спецыялісты тлумачаць, што мастацкія вартасці палацаў у Гродне ўсё-такі ”ледзь пераўзыходзілі сярэдні еўрапейскі ўзровень“. Усё ж шкада, што палац не захаваўся ў сваім першапачатковым выглядзе. Некранутай засталася толькі парадная ўяздная брама са скульптурамі.

**Пабудовы ў наваколлі замкаў.** Перш чым пакінуць старажытную частку горада (побач з замкамі, са стыхійнай, як мы казалі, планіроўкай), паглядзім на самыя цікавыя будынкі з тых, што тут захаваліся. У павуціне старадаўніх вуліц прытуліўся стары праваслаўны, а потым уніяцкі манастыр. Яго сабор з высокім купалам і дзвюма вежамі-званіцамі ўзведзены уніятамі ў 1720—1751 гг. Гэта былі часы, калі уніяцкія каменныя храмы своеасабліва спалучылі рысы, характэрныя для каталіцкага каменнага і старажытнарускага (беларускага) драўлянага дойлідства: пры агульным вобліку, блізкім да каталіцкіх храмаў, захавалася цэнтрычная кампазіцыя старажытных праваслаўных драўляных цэркваў. Да таго ж гэта адна з самых вялікіх царкоўных пабудоваў. ”Змешчаная пасярод крывых і вузкіх вуліц на



Гродна. Сабор уніяцкага манастыра (1720—1751). (Фота аўтара)

месцы старой царквы-крэпасці, яна з'яўляецца адным з помнікаў, якія вызначаюць сілуэт горада не толькі сваімі памерамі, але і выразнасцю аб'ёмаў. Лаканічным масам збудавання адпавядае невысокі рэльеф дзяленняў..."— так у 1968 г. пісала вядомая знаўца архітэктуры Беларусі А. Д. Квітніцкая. Аднак даследчыцы не былі вядомыя факты, якія выявіліся праз 12 гадоў...

У 1980 г. навукова-рэстаўрацыйныя майстэрні Міністэрства культуры Беларусі пачалі даследаванні сабора базыльянскага манастыра, вынікі якіх перавысілі ўсе спадзяванні. Паблізу помніка былі раскапаныя рэшткі храма XII ст., складзенага з плінфы на цэмянцы. Гэта была першая Прачысценская царква, якая, паводле пісьмовых крыніц, стаяла тут да пабудовы больш позняга храма. Многія з даследчыкаў разумелі, што уніяцкаму папярэднічаў нейкі іншы храм, але ніхто не мог падумаць, што гэтая царква была збудаваная ў XII ст.! Пад ёй залягаў слой, пакінуты першымі жыхарамі пасёлка каля Замкавай гары. Відавочна, першым насельнікам гэтай мясціны ў XII ст. спатрэбіўся храм, збудаваны з цэглы. Знаходка кожнага храма тых часоў — буйная падзея ў навуцы. Зараз можна сказаць, што царква была шасціслуповай, трохнефавай, яе барабан абапіраўся на дзве заходнія пары

слупоў, цэнтральная апсіда мела ў плане прамавугольную форму. У вонкавую паверхню сценаў былі ўведзены буйныя каляровыя камяні (сцены захаваліся на вышыню да 1 м), падлога выкладзена з рознакаляровых маёлікавых плітак, дакладна такіх, як у Ніжняй і Каложскай цэрквах. У сценах, як і там, умураваныя галаснікі. Слядоў фрэсак і тынкоўкі не выяўлена. Памеры плінфы, характар муроўкі таксама вельмі блізкія да названых храмаў. Зразумела, што гэта адзіная архітэктурная школа, аб ёй мы яшчэ будзем гаварыць.

Храм быў адкрыты беларускім даследчыкам І. М. Чарняўскім, у працах прымаў удзел таксама М. А. Ткачоў. Высветлілася, што храм загінуў у выніку пажару, верагодна, у XVI ст., хоць яшчэ ў пачатку XV ст. яго капітальна рамантавалі буйнапамернай цэглай. У XVIII ст. храма ўжо не было, манашкі выкарыстоўвалі рэшткі царквы для пахавання нябожчыкаў.

**Царква Барыса і Глеба на Каложы.** Перш чым звярнуцца да помнікаў позняга сярэднявечча, разгледзім гэтую царкву XII ст., якая цудам захавалася ў Гродне. "Царква стаіць на высокай гары над Нёманам,— пісаў у 1738 г. адукаваны настаяцель храма, ігумен Каложскага манастыра (уніяцкага) і першы даследчык беларускіх старажытнасцяў Ігнат Кульчынскі.— Пясчаная гара з даўніх часоў пачала абсыпацца і цяпер абсыпаецца, ад чаго царкве пагражае небяспека. Каб папярэдзіць (...), я загадаў пабудаваць ля падэшвы плот, прываліць яго гноем, а таксама загадаў пасадзіць тут розныя дрэвы. (Яна) збудаваная дзіўным чынам. Наконт старажытнасці гэтай царквы я не бачыў ніводнага дакумента (...) я мяркую, што царква гэтая заснаваная і збудаваная прыблізна ад лета Гасподня 1200. Галоўны доказ у тым, што гэтая царква цэглай і вапнай падобная на кафедральную полацкую царкву..." Вучоны манах амаль не памыліўся: храм, як мы пабачым, быў збудаваны ў 1180-х гадах. Вельмі цікавы яго зварот да муроўкі як да датуючай прыкметы (што стала відавочным толькі цяпер). Трэба сказаць, што Полацкая Сафія, на якую ён спасылаецца, збудаваная не каля 1200 г., а ў 1060—1066 гг., але гэтага ігумен не ведаў, хоць і дакладна зразумеў: муроўка з плінфы ўласціва толькі для часоў Кіеўскай Русі!

Пасвячэнне храма Барысу і Глебу невыпадковае: гэтыя першыя рускія святыя лічыліся абаронцамі Русі. Старэйшых сыноў першага ўпамянутага ў летапісах гарадзенскага князя



Гродна. Каложская царква да яе частковага разбурэння ў 1853 г. (Малюнак М. Куляша)

Усеваладкі звалі Барыс і Глеб (упамінаюцца ў 1150—1169 гг.). Удаецца расшыфраваць і назву мясцовасці Каложа. Пскоўскія летапісы сведчаць, што ”В лѣто 6914 (1406) приде поганый отступник правыя вѣры, сын диаволь, князь литовский Витовтъ съ множствомъ ратныхъ (на Пскоўскую зямлю і) пришедъ град Коложе взя. А люди, сущая в граде и по волостем — овых изсече, а во пленъ сведе душь 11 тысящь”. Відавочна, гэтыя ”душы“ і былі паселеныя паблізу царквы Барыса і Глеба.

Царква гэтая унікальная, і мне хацелася б перадаць тое адчуванне, якое ахоплівае пры першым знаёмстве з ёю, нават звонку. Распытаўшы дарогу, я выйшаў да Нёмана, стаў падымацца па каменнай выгнутай сцежцы для прыхаджан. Кожны яе паварот усё больш адкрываў краявід за межамі горада, куды імклівa нёсся Нёман. Вакол мяне і вышэй і ніжэй у зяляніне цямнелі постаці людзей, якія кіруюцца да храма. Хутка зверху пачалі далятаць шматгалосыя спевы, а за паваротам на вышыні паказаўся сам храм. Я спыніўся перад гэтым відовішчам: здавалася, кожная плінфа, кожная маёлікавая плітка мігатлівай паверхні паласатай сцяны з непаўторнымі ўзорамі вымаўляе свой асаблівы гук і ўсе разам яны



Гродна. Каложская царква XII ст. (Фота Ю. Ядкоўскага)

ствараюць незвычайную гармонію гука і зрокавага ўспрымання... А цераз месяц ... я — захавальнік фондаў гродзенскага музея — змушаны быў прымаць новы "музейны экспанат" у епіскапа — храм забралі ў вернікаў.

Так, гэта храм XII ст. Ён збудаваны, высветліў М. М. Воронін, у 1180-я гады і, значыць, пазней за Ніжнюю царкву. Храм будавалі, верагодна, дзеці Барыса і Глеба Усеваладкавічаў. Падышоўшы бліжэй, мы бачым, што паверхня яго сценаў з незвычайнай раскошай упрыгожана ўстаўкамі буйных (унізе) камянёў — плоскіх неапрацаваных і паліраваных (валун асабліва цяжка паддаецца паліроўцы і шліфоўцы). Вышэй валуноў размешчаныя крыжовыя кампазіцыі, выкладзеныя з маёлікавых карычневых, жоўтых і зялёных плітак. Важным быў і колер каменя: яго падбіралі з дзвюх пародаў — гранітаў і гнейсаў і прытым розных адценняў, але ў строга акрэсленай гаме (чырвоныя, карычневыя, цёмна-малінавыя, шэравата-зялёныя, аліўкавыя). Як выглядаў звонку Каложскі храм у самым пачатку — пытанне складанае; верхнія яго часткі не захаваліся, як не захаваліся ўпаўшыя ў Нёман паўднёвая сцяна і часткі сцен, прылеглых да яе.

Інтэр'ер царквы таксама быў своеасаблівы і вельмі цікавы

”Высокія і падкрэслена зграбныя парталы ўводзілі ў сярэдзіну храма, — пісаў М. М. Варонін,— той, хто ўваходзіў цераз заходні ўваход, бачыў адразу ўсю глыбіню і вышыню прасторы. Хоры былі дастаткова высока, каб іх перакрыцці не стваралі паўзмроку і пачуцця прыціснутасці, як было ў многіх іншых храмах XII ст. (...) Уздоўж бакавых сценаў цягнуліся ад хораў да алтара вузкія драўляныя балконы...“ Гэтая дэталь



Гродна. Каложская царква XII ст. (Фота Босіна)

інтэр'ера да гэтага часу з'яўляецца надзвычайнай загадкай: справа ў тым, што ў тоўшчы бакавых сценаў размешчаныя вузкія лесвіцы, якія вядуць на вышыню 5 м і выходзяць на паўночную і паўднёвую сцены. Навошта яны патрэбныя? Відавочна, яны вялі да нейкага памяшкання ля сценаў, г. зн. на балконы, як і меркаваў М. М. Воронін. Балконы ішлі ўздоўж паўночнай, заходняй і паўднёвай сценаў храма, на іх, відаць, размяшчаўся хор. У Ніжняй царкве, мы памятаем, лесвіца на хоры была вінтавой і размяшчалася ў паўднёва-заходнім куце храма. Гэтае месца ў Каложскай царкве не захавалася (абрынулася ў Нёман), але наўрад ці тут была патрэбная трэцяя лесвіца. Разам з тым лесвіцы на балконы пачыналіся ў алтары, куды, як вядома, не дапускалі жанчын. Выснова напрошваецца адна: мужчынскі манастыр Барыса і Глеба існаваў тут не толькі ў познім сярэднявеччы, але і значна раней, з XII ст. Для яго і будавалася царква. Хор манахаў праходзіў за алтарную перагародку (іканастас з'явіўся ў канцы XIV—XV ст.) і падымаўся на балконы-хоры. У Каложскай царкве была, відавочна, цудоўная акустыка — яна амаль не мела фрэсак (можа быць, у алтары?), і ў яе сцены — мы бачым гэта і зараз — з вышыні чалавечага росту ў шахматным парадку ўмураваныя шматлікія галаснікі. У апошні час храм даследаваўся П. А. Рапапортам і А. А. Трусавым, якім удалося ўдакладніць многія пытанні, звязаныя з пабудовай і ўпрыгожаннем храма. Старажытная падлога помніка была расчышчаная на ўзроўні "верху квадратных асноваў слупоў". Яна зробленая з паліваных плітак на вапнавай рашчыне. У паўднёвай апсідзе захаваўся фрагмент падлогі XII ст. з квадратных і прамавугольных плітак. Як вызначыў яшчэ М. М. Воронін на матэрыяле раскопак мінулых гадоў, гродзенскія майстры падрыхтавалі пліткі, прызначаныя для падлогі царквы на Каложы ў колькасці 16 тыпаў, жоўтага, зялёнага і карычневага (вішнёвага) колераў. Значыць, падлога, як і ў Ніжняй царкве, была вельмі прыгожай.

Мы гаворым аб тым вялікім ўражанні, якое ў наш час стварае старажытная Каложа пад час набліжэння да яе. Можам сабе ўявіць, якое незвычайнае ўздзеянне на вернікаў рабіў храм у старажытнасці: вечар, паўцёмны інтэр'ер, золата паміж агнямі свечак і лампадак, малітоўныя фігуры на маёлікавай падлозе,чорны манастырскі хор па сценах агалошвае храм суровым мужчынскім унісонам... Як гэта было моцна!

Звернемся на заканчэнне да гісторыі нашага помніка, вядо-



Гродна. Галаснікі Каложскай царквы XII ст. (Фота Ю. Ядкоўскага)

май нам дзякуючы ўсё таму ж архімандрыту-уніяту І. Кульчынскаму (1707—1747), мясцоваму ўраджэнцу. Праглядаючы манастырскі архіў, ён склаў нават пералік усіх ігуменаў пачынаючы з XV ст. Разбурэнне храма пачалося ў хуткім часе пасля стварэння Вялікага княства Літоўскага. Звязана гэта было з частымі нападамі нямецкіх рыцараў. Храм апусцеў, насельніцтва разабрала мазаіку падлогі. Пры каралеўскім сакратары Богушы-Багавіціновічу, які пачаў рэстаўраваць помнік у XVI ст., храм быў у запусценні, скляпенні абваліліся, "службы Божай у ім не было". "Пабачыўшы Каложскую царкву вельмі разбуранай, (ён) перш за ўсё аднавіў сцены і зрабіў на царкве дах, а затым і ўсярэдзіне ўпрыгожыў дом Божы з належнай раскошай",— пісаў І. Кульчынскі. Прычыну разбурэння помніка ён бачыў у тым, што пад час літоўскай вайны Івана III Масква, штурмуючы замак у Гродне, быццам "знесла ўвесь верх (Каложскай царквы) і, насыпаўшы на царкву пяску, смецця, паставіла на ёй гарматы і страляла з іх у Замак". Як паказаў М. М. Варонін, гэта не больш чым легенда: ніякіх гармат тут не было. Паводле гравюры М. Цюндта XVI ст., алтарная частка храма была пакрытая на два схілы, а астатняя частка — высокім шатром з макаўкай. У XVII ст. царква была зноў пашкоджана войскамі: "царква

стаяла пустой, без дзвярэй і вокнаў, а летам служыла стойлам для жывёлы..."— запісаў І. Кульчынскі. У пачатку XVIII ст. храм па-ранейшаму "не мае даху, але толькі 4 сцяны..." У 1720 г.— новая бяда: Нёман падышоў занадта блізка, сцяна нахілілася — яе і ўмацоўваў І. Кульчынскі. Апаўзанне берага было спынена пасадкай на схіле дрэваў. Па інвентару 1738 г. царква "не вельмі даўно пакрытая дахам, які яшчэ трывалы, зверху — 3 купалы", слядоў скляпенняў у той час ужо не заставалася. У ноч з 1 на 2 красавіка 1853 г. паўднёвая сцяна і частка заходняй абрынуліся ў Нёман. Гэтым і тлумачыцца тое, што гэтыя сцены зараз замененыя драўлянымі. Такая вось сумная гісторыя гэтага выдатнага помніка Беларусі.

**Гродзенская школа старажытнага дойлідства.** XII ст. было часам росквіту эпохі феадальнай раздробленасці. Большасць княстваў імкнулася да самастойнасці, у многіх з іх з'явіліся свае мясцовыя школы дойлідаў, жывапісцаў, рамеснікаў. Адной з самых ранніх такіх школ дойлідства была полацкая, узнікшая ў сярэдзіне XII ст. Тут быў свой таленавіты архітэктар Іаан, які распачаў свае першыя доследы храматворчага мастацтва ў полацкім Бельчыцкім манастыры. Заўважаны геніяльнай асветніцай знакамітай Ефрасінняй Полацкай, ён быў запрошаны ў яе манастыр і збудаваў там у 1150-х гадах арыгінальную царкву Праабражэння з шэрагам канструкцыйных асаблівасцяў, якія дазволілі надаць ёй цэнтрычна-вежападобную кампазіцыю. Доследы і першыя дасягненні былі падхопленыя полацкімі паслядоўнікамі Іаана, цэнтрычныя вышынныя кампазіцыі былі імі выкарыстаныя ў Полацку, Смаленску. Ідэі гэтага будаўніцтва пашырыліся і па другіх гарадах (Ноўгарад, Разань і г. д.).

Пытанне аб гродзенскай школе дойлідства ў свой час паставіў яшчэ М. М. Варонін. Ён паказваў, што мураванае будаўніцтва ў Гродне пачалося пры князі Усеваладку Давыдавічу і, "канешне, было звязана з дзейнасцю прыбылых майстроў". Майстры гэтыя, на яго думку, найверагодней прыйшлі з Уладзіміра-Валынскага, "аднак наступныя будынкі ўзводзілі, відавочна, мясцовыя майстры". "Другая архітэктурная школа,— падхапіў гэтую думку П. А. Рапапорт,— (...) была больш лакальная, чым полацкая, і менш паўплывала на агульны працэс развіцця старажытнарускай архітэктуры", разам з тым яе творчасць была вельмі арыгінальнай і, як ён адзначыў далей, "для гродзенскага дойлідства не знаходзіцца

блізкіх аналагаў у архітэктуры іншых земляў таго часу". Школа гэтая функцыяніравала ў 80-х гадах XII ст. на працягу 12—15 гадоў. Перад сваёй смерцю П. А. Рапапорт на грунце летапісаў і тэхнікі будаўніцтва тагачасных храмаў у Луцку, Тураве, Оўручы і Гродне прыйшоў да высновы, што іх рабіў дойлід Пётр Міланег, які парваў з традыцыямі кіеўскага дойлідства і ўзводзіў даволі арыгінальныя храмавыя пабудовы. На жаль, даследчык не паспеў дэталёва абгрунтаваць гэтыя важныя высновы.

Асаблівасцю гродзенскай школы было шырокае ўжыванне ў дэкоры вонкавых сценаў храмаў вялікіх, абцясаных з аднаго боку камянёў, а таксама кампазіцый з маёлікавых плітак, а ў інтэр'еры — шырокае ўжыванне керамічных галаснікоў. Акрамя Гродна паліхромнае ўпрыгожванне вонкавых сценаў камянямі выкарысталі ў царкве канца XII ст., збудаванай у Оўручы (Пётр Міланег?).

**Плошча рынку.** Мы пакідаем самую старажытную (і, магчыма, самую яркую) частку горада з характэрнай хаатычнай планіроўкай яе наваколля і ідзём да другой, узнікшай у эпоху ўжо развітога сярэднявечча. Тут мы бачым ужо параўнальна рэгулярную вулічную планіроўку. Пакідаючы вузкую і крывую Замкавую вуліцу, выходзім на вялікую цэнтральную плошчу з каталіцкімі кляштарамі і касцёламі, залітую асфальтам, поўную людзей і машын. Нам зразумела, што такой велічыні ў старажытнасці плошча мець не магла. Непасрэдна перад намі на дальнім яе баку ўзвышае свае барочныя вежы магутны касцёл езуіцкага калегіума (зараз фарны). З правага боку воддаль відны касцёл бернардзінскага кляштара з адной грацыёзнай вежай. Квадратная прастора перад фарным касцёлам напярэдадні апошняй вайны замыкалася будынкам гарадской ратушы, была забудаваная і ўся астатняя частка плошчы да самай ракі. Плошча перад фарным касцёлам называлася плошчай рынку — прызначэнне яе зразумела з самой назвы. Плошча ўзнікла ў XIV—XV стст., відавочна, пасля перанясення сюды торгу ад замка. Пазней тут на мяжы горада XII—XIII стст. узніклі касцёлы, ратуша і карчма. Плошча рынку з нязменнай ратушай і дамамі магнатаў заўжды заставалася самай параднай у горадзе. Торг быў у яе цэнтры, ад яго да перыферыі горада цягнуліся вуліцы, якія выводзілі на дарогі да другіх гарадоў. Пазней многія будынкі на гэтай плошчы былі замененыя.

У заходняй частцы плошчы на куце вуліц Замкавай і Ві-

ленскай (Савецкая) да нядаўніх часоў узвышаўся стары шмат'ярусны прыходскі касцёл з васьміграннай вежай над галоўным уваходам. У XIX ст. храм быў перароблены ў праваслаўную царкву з шатровай званіцай на старой вежы, у эпоху буржуазнай Польшчы ён быў рэканструяваны ў неагатычным стылі і пачаў называцца гарнізонным касцёлам. Храм узарвалі ў 1961 г.

Акрамя кляштараў і касцёлаў на плошчы рынку ў XVIII ст. стаялі палацы магнатаў: на ўсходнім баку — Бжастоўскага, Сапегі (там пэўны час жыў Аўгуст II). Лепшым, па сведчанню нямецкага падарожніка (1752), быў палац Сапегаў. Ён "двухпавярховы, у карынфскім стылі, багата ўпрыгожаны і цудоўны. Дах на ім плоскі". Палац быў звязаны з езуіцкім касцёлам асобым пераходам над Брыгіцкай вуліцай. Пры каралі палац пашырылі з дапамогай драўляных прыбудоваў. Акрамя караля там жыла ўся яго абслуга, збіраўся сейм (мелася спецыяльная "Сенатарская зала"). Паўднёвы бок рынку займаў трэці палац — Радзівілаў, па сведчанню В. Шмюлера, "вялікі сіметрычны прыгожы будынак".

Гарадская ратуша, мяркуючы па планах 1655 і 1705 гг., была ў заходняй частцы плошчы, але ў канцы XVIII ст. яе перабудавалі (з комплексам прылеглых лавак) і паставілі ў цэнтры плошчы рынку разам з гандлёвымі радамі ў стылі класіцызму. Ратуша мела шасцікалонны аднапавярховы порцік. Увесь комплекс утвараў прамавугольнік з унутраным дваром і крамамі па перыметры. На жаль, у апошнюю вайну ўсё гэта загінула.

**Е з у і ц к і (ф а р н ы) к а с ц ё л.** Гэта першая на нашым шляху пабудова езуітаў. Манаскі ордэн езуітаў ("Таварыства Ісуса") быў заснаваны ў Парыжы рэлігійным фанатыкам Ігнатам Лайолай (1491—1556) у 1534 г. і зацверджаны папай у 1540 г. Яго мэтай была абарона інтарэсаў каталіцкай царквы і барацьба з ерасямі. Езуіты распачалі шырокую місіянерскую дзейнасць і ўжо ў 1542 г. дасягнулі Індыі, у 1563 г.— Кітая, у 1594 г.— нават Філіпінаў. Асаблівую ўвагу езуіты надавалі рэлігійнаму выхаванню. У спецыяльных езуіцкіх школах з шырока пастаўленай адукацыяй выхаванцаў навучалі прынцыпам знешняга гуманізму, якія напаўняліся схаластычным зместам у духу сталага каталіцызму. У манастырскіх калегіумах вучні займаліся ў вялікіх светлых класах, кабінетах фізікі, геаграфічных картаў і перамежвалі заняткі навукамі з гімнастыкай на адкрытым паветры, прагулкамі

(пры калегіумах заўжды быў сад). Гарманічнаму развіццю разумовых здольнасцяў езуіты надавалі вялікае значэнне.

На Беларусь езуіты праніклі ў год утварэння Рэчы Паспалітай, у 1569 г., з марнай надзеяй акаталічыць усё беларускае насельніцтва.

Езуіцкі кляштар і касцёл у Гродне некалі былі самымі багатымі ў Рэчы Паспалітай і займалі ў горадзе разам з аптэкай, калегіумам, бібліятэкай, гаспадарчымі пабудовамі цэлы квартал. Вялізны будынак касцёла з яго дзвюма магутнымі вежамі і зараз узвышаецца над дрэвамі сквера ва ўсходняй частцы плошчы рынку. Заснаваны яшчэ ў 1647 г. разам з калегіумам і аптэкай, ён будаваўся надзвычай доўга (у 1655—1661 гг. горад быў акупаваны войскамі рускага цара Аляксея Міхайлавіча). Скончылі будаваць храм толькі ў 1663 г. і ў 1667 г. асвяцілі яго ў гонар святога Францыска. Вырашальную ролю ў будове фасада адыгралі, як мы бачым, дзве масіўныя вежы. Паходжанне іх недастаткова яснае. Магчыма,



Гродна. Езуіцкі касцёл (1647)

формы запазычаныя непасрэдна з Італіі, але магчымыя і іншыя меркаванні. Мяркуючы па карціне, якая захавалася ў касцёле, першапачатковы фасад быў намнога прасцейшым, а вежы мелі на ярус больш. Сучасны выгляд фасад набыў толькі ў XVIII ст. На фасадзе кідаюцца ў вочы шматлікія спараныя пілястры, якія ўпрыгожваюць усе ярусы і паказваюць дзяленне помніка на тры нефы. Ярусы змяншаюцца па



Гродна. Езуіцкі касцёл. Галоўны алтар. (Фота І. Пятраўскаса)

вышыні, самы верхні з іх мае складана выгнутыя формы і ў выніку масіўны фасад будынка не здаецца груваскім. Уявім сабе святочную плошчу рынку, людскі гоман на ёй. У пэўны час усё сціхае: пад музыку са светавога акна з глыбокай нішай (там сядзяць музыканты) разыгрываюцца рэлігійныя сцэны...

Уваходныя дзверы храма малыя і цесныя, тым большым выглядае інтэр'ер, дзе кожны крок рэхам аддаецца пад купалам (вышыня — 50 м). Галоўнае тут — цэнтральны алтар (1736). Паміж тонкімі калонамі ў некалькі вертыкальных радоў размешчаны выразныя драўляныя фігуры святых вышынёй у чалавечы рост. Усе — у маляўнічых паставах: некаторыя зацікаўлена размаўляюць, другія нешта паглыблена абдумваюць, твары ва ўсіх вельмі натхнёныя. Цікавыя і алтары каля прамежкавых апораў: правы — у гонар святога Казіміра, левы — святога Станіслава з шыкоўнай крапільніцай з цэлага каменя. Уражвае дэкор амбона, з якога ксёндз чытае казанні. Гэта сапраўдны шэдэўр ракако. "Насуперак усім законам фізікі ён знаходзіцца быццам падвешаны ў прасторы,— пішуць спецыялісты,— на выступе тонка прамаляванага карніза ў манерных паставах лунаюць скульптуры евангелістаў..." (А. М. Кулагін, 1989). "Манерныя позы евангелістаў" — гэта не той тэрмін, які дакладна характарызуе скульптуры ў хрысціянскім храме, нават калі гаворка ідзе аб ракако. Тут хутчэй патрэбна казаць аб "зграбнасці" і "грацыі". Зграбная кансоль ў выглядзе ракавіны, якая падтрымлівае амбон, грацыёзна лунаючыя анёлы... і г. д. Роспісы храма (XVIII ст.), усе яго дэкаратыўныя элементы ўяўляюць сабой вялікую мастацкую каштоўнасць.

Выйдзем з храма, павернем на Брыгіцкую вуліцу (зараз Маркса), пройдзем 10 дамоў і аглянёмся. Сярод двухпавярховых будынкаў касцёл — гіганцкі гмах: за выцягнутай апсідай высокі цэнтральны купал, а далей — вежы. Нават у наш час вышынных пабудоваў ён здаецца грандыёзным, якое ж уражанне на прыхаджан рабіў гэты гігант у мінулыя эпохі!

Але ж менавіта гэтае збудаванне не так даўно, у т. зв. "эпоху застою", мясцовыя ўлады хацелі зачыніць і перадаць помнік іншаму ведамству! Пагаварыце з людзьмі сталага веку, яны вам раскажуць, як доўга прыхаджане змагаліся з уладамі, адстойвалі храм. У дзень прыезду камісіі для перадачы касцёла ў яго набілася столькі людзей, што камісія не змагла ўвайсці. Ад касцёла адключылі электрычнасць, тады вернікі перайшлі на свечкі, а паветра для аргана, як даўней, пампавала моладзь.

У 1975 г. я быў у Гродне і наведаў "Фару". Прыход ужо пазбавілі ксяндза, але ўсе лаўкі аказаліся занятымі: службы не было, прыхаджане спявалі самі... Так удалося абараніць касцёл. Цяпер ён адрамантаваны і прымаў нават польскага архібіскупа Глемба... Народ перамог застой.

Злева ад касцёла захаваўся невялікі будынак езуіцкай аптэкі — адной з першых на Беларусі. Дом двухпавярховы, пастаўлены тарцовым бокам да плошчы. Зараз ён адрэстаўраваны і хутка, паводле чутак, ператворыцца ў музей-аптэку. Ніжні паверх яго дэкарыраваны сціпла, затое верхні аздоблены надзвычай разнастайна: тонкі малюнак фігурнага франтона, аблямоўка вокнаў, невялікага балкона, карнізныя цягі — усё гэта сведчыць аб эпосе сталага барока.

**Кляштар бернардзінаў.** Па агромністай плошчы зараз ідзе інтэнсіўны рух: тралейбусы, двайныя "Ікарусы", грузавыя машыны з фургонамі, шматлікія легкавыя... Усё гэта безупынна і шумна рухаецца, скрыгочача тармазамі ля светафораў, і вы міжволі ловіце сябе на думцы: хіба ж нельга было гэты дзівосны сярэднявечны цэнтр горада вызваліць ад транспартнай навалы? У многіх гарадах да такога цэнтра адносяцца, як да святыні, ладкуюць пешаходныя вуліцы, а тут усё яшчэ квітнее прага да гігантаманіі! Вось машыны выстройваюцца ля светафора, усе мігаюць для паварота ў адзін бок — уніз на мост цераз Нёман. Гледзячы на гэты "цуд" цывілізацыі, не адразу заўважаеш, што зверху на пагорку ўзвышаецца яшчэ адзін помнік цудоўнай архітэктуры — бернардзінскі кляштар і касцёл.

Касцёл зусім не такі, як фарны,— значна больш вытанчанай архітэктуры, хоць і збудаваны ў тым жа XVII ст. Сам кляштар быў заснаваны ў 1595 г. Вярнуўшыся пасля войнаў з Масквой, кароль Жыгімонт I Ваза (1587—1632) даў дазвол сваім васалам збудаваць тут касцёл на іх добраахвотныя сродкі. Вядома, што ў першай палове XVIII ст. фасад яго быў моцна пераробленьі: дэкор наблізілі да аздобы знакамітага храма Іль Джэзу ў Рыме, а побач з уваходам збудавалі велічную і вытанчаную званіцу — адну з самых прыгожых на Беларусі (А. Д. Квітніцкая). Гэты грандыёзны трохнефавы храм-базылік яўна прызначаны на галоўную ролю ў сілуэце горада. Ён і пры сучаснай забудове мае вялікае значэнне ў панараме горада, як бы дыхае веліччу, горда ўзнёсшы зграбную свечку шмат'яруснай званіцы. Спецыялісты знаходзяць у помніку як рысы готыкі (стрэльчатыя праёмы



Гродна. Бернардзінскі касцёл (XVII ст.)

бакавых фасадаў, далёка выступіўшыя контрфорсы), так і рысы барока з некаторымі элементамі рэнесансу (плоскаснае вырашэнне сцяны фасада са слаба выступаючымі пілястрамі, тонкая аблямоўка вокнаў, нішаў і г. д.). Нягледзячы на ўсю разнастайнасць асобных частак храма, гэта адзіная кампазіцыя вялікай мастацкай сілы. Справа да касцёла прымыкаюць карпусы кляштара.

**Брыгіцкая вуліца і кляштар брыгітак.** Старажытная Брыгіцкая вуліца (зараз К. Маркса) — адна з найбольш захаваных. Яна служыла працягам Замкавай вуліцы, вяла ад плошчы рынку ў накірунку да мястэчка Азёры і калісьці называлася Азёрскай. У XVII ст. на ёй збудавалі кляштар брыгітак і назвалі вуліцу Брыгіцкай. У XVII—XVIII стст. гэта была адна з самых арыстакратычных вуліц горада. Тут знаходзіўся вуглавы палац Сапегаў, у сярэдзіне XIX ст. стаяў дом, у якім вялікую дзевяціпакаёвую кватэру займала ўдава Паўлоўская з семнаццацігадовай дачкой — будучай пісьменніцай Элізай Ажэшкай (пазней пісьменніца купіла сабе дом на вуліцы Раскоша). Мы ўжо былі на Брыгіцкай вуліцы, калі аглядалі езуіцкі касцёл, а зараз пройдзем далей да брыгіцкага кляштара. Вуліца зачароўвае сваімі двухпавярховымі старажытнымі домікамі, якія шчыльна прыляпіліся адзін да другога па абодвух баках. Кожны з іх у сярэдняй частцы другога паверха забяспечаны мініяцюрным балкончыкам. Зараз, калі па вуліцы з шумам і пылам нясецца транспарт, балкончыкі пустуюць, а калісьці гэта была неад‘емная частка жыцця

гараджан: з іх так лёгка было абменьвацца навінамі, глядзець, што вязуць на рынак і што з рынку!

У адрозненне ад папярэдніх мужчынскіх кляштараў брыгіцкі быў жаночым, і ад нясціплых мужчынскіх вачэй манашак хавалі высокія глухія сцены з вежамі па кутах і мастацкімі, тыпова барочнымі брамамі. Парталы гэтых брамаў вельмі эфектна выглядаюць на фоне суровых гладкіх сценаў агароджы. Званіца касцёла (не захавалася) знаходзілася на процілеглым баку вуліцы. За сценамі размешчаны не толькі храм, але і сталоўка, двор, сад. У цэлым ансамбль кляштара паказвае цікавы прыклад ранняга барока.

Працуючы над вывучэннем архітэктуры брыгіцкага кляштара, А. Д. Квітніцкая ў 1961 г. знайшла ў падвале касцёла кляштарны архіў, з якога высветлілася, што фундацыя яго прыходзіцца на 1642 г. Тут жа ў лёхах мастацтвазнаўца А. В. Аладава знайшла партрэты фундатара — маршалка Вялікага княства Літоўскага Крыштапа Весялоўскага (1636), яго жонкі і дачкі. Відавочна, гэтыя партрэты ўсе тры стагоддзі правіселі ў касцёле і толькі нядаўна нехта зняў іх адтуль і паклаў у падвале. Партрэты напісаныя рукой вялікага, але, на жаль, невядомага майстра. Яны былі адрэстаўрыраваныя ў Дзяржаўным Рускім музеі (Санкт-Пецярбург) А. Брындаравым і дэманструюцца ў Дзяржаўным мастацкім музеі Беларусі ў Мінску. Дабравешчанскі касцёл брыгіцкага кляштара быў асвечаны праз дзесяць гадоў пасля фундацыі — у 1651 г. У адрозненне ад двух папярэдніх помнікаў касцёл аднанефавы і не мае слупоў. У яго заходнім — галоўным фасадзе мы не ўбачым імкнення да грандыёзнасці, як у касцёле езуітаў, ні вытанчанага малюнка сілуэта, як у касцёле бернардзінаў. Тут усё выглядае намнога сціплейшым, хоць фасад і раздзелены пучкамі карынфскіх пілястраў, мае развіты атык, шырокі шчыпец з франтонам, дзве дэкаратыўныя аднаярусныя вежкі і нават фрыз вакол усяго будынка, упрыгожаны дэкаратыўным роспісам. Тут, у гэтым жаночым кляштары, відавочна, ставіліся цалкам іншыя задачы, чым у двух папярэдніх, і спецыялісты лічаць, што ў трактоўцы дэталяў будаўнікі далёка адышлі ад дэкаратыўных канонаў заходнееўрапейскага барока. Інтэр‘ер касцёла быў багата ўпрыгожаны яшчэ праз самога фундатара кляштара. У бакавых алтарах вісела серыя карцін і абразоў, выкананых віленскім мастаком І. Шрэтэрам і Якавам з Тыкоціна.

Пабудовы кляштара арганізуюцца вакол унутранага двара.



Гродна. Касцёл кляштара брыгітак (1651)

Дзверы аднастайных келляў выходзяць у светлыя калідоры, якія апаясвалі двор з сярэдзіны. У будынку на процілеглым касцёлу баку размяшчаліся буйныя памяшканні: на першым паверсе сталоўка, перакрытая цыліндрычным скляпеннем, на другім — бібліятэка. Асаблівую цікавасць выклікае адна з драўляных пабудоваў брыгіцкага кляштара, т. зв. лямус— арыгінальнае спалучэнне амбара і жылога памяшкання. Галоўны фасад лямуса мае арачную галерэю на два паверхі. Дах высокі на чатыры схілы і пакрыты гонтам. Мяркуецца, што гэта быў інтэрнат для манашак да таго, як быў збудаваны мураваны кляштар, або што там спачатку жылі манашкі, потым "абслуга", ніжні паверх выкарыстоўваўся для гаспадарчых патрэбаў. Словам, гэта — арыгінальная драўляная пабудова XVII ст., якіх не так шмат засталося на Беларусі.

**Вуліца Гарадніца і пабудовы А. Тызенгаўза.** Цяпер мы выйдзем за межы горада XVII ст. і накіруемся на поўнач, у даліну ракі Гарадніцы (Гараднічанкі),



Гродна. Брама кляштара брыгітак



Гродна. Званіца кляштара брыгітак (не захавалася)

дзе ў XVIII ст. на тэрыторыі вёскі Гараднічанкі былі ўзведзены вельмі своеасаблівыя пабудовы, значная частка якіх існавала яшчэ ў 1950-я гады, а зараз засталося толькі некалькі дамоў. Вуліца Гарадніца (зараз вул. Ажэшкі) — першая, куды трапляе прыезджы з вакзала. У 1948 г. я застаў яе яшчэ забудаванай дамамі XVIII ст. Ад вакзала на пагорку дарога вяла ўніз і ўлівалася ў чыстую доўгую вуліцу. Па баках — цэлы шэраг драўляных аднапавярховых дамкоў з мураванымі фасадамі і высокімі барочнымі фігурнымі франтонамі на іх. Я праходзіў адзін, а за ім ужо выступаў другі, трэці, яшчэ больш пакошаны, але з такім жа франтонам і кожны быццам падміргваў: а мяне бачыў? ”Што гэта за дзівосныя пабудовы?”— здзіўляўся я.

Імкнучыся падняць эканоміку Рэчы Паспалітай, надворны падскарбі каралеўскіх маёнткаў і гродзенскі стараста Антоні Тызенгаўз (1733—1785), маючы поўны давер караля, пачаў шырокую рэфарматарскую дзейнасць. Палепшыў дарогі, у Гродне стварыў тэхнічныя і спецыяльныя школы для навучання сялян, медінстытут з музеем, бібліятэкай і вялікім батанічным садам, заснаваў тэатр, абсерваторыю, фундаваў першую ў Гродне газету. У самай буйной каралеўскай эканоміі — Гродзенскай — ён арганізаваў серыю прамысловых прадпрыемстваў, заснаваных на прыгоннай працы. З Галандыі, Бельгіі, Францыі, Швецыі былі выпісаны настаўнікі-майстры. Меркавалася, што прадпрыемствы будуць працаваць на прывазной сыравіне і сваёй прадукцыяй пакрыюць страты на іх арганізацыю. Узніклі фабрыкі: ткацкія, металічных вырабаў, галантарэйных тавараў, экіпажаў і заводы: паташны, дзягцярны, піваварны і інш. Да заканчэння дзейнасці А. Тызенгаўза ў Гродне было 21 прадпрыемства з 3 тыс. рабочых, 400 вучнямі, 70 настаўнікамі і наглядчыкамі.

Для ажыццяўлення сваіх будаўнічых планаў Тызенгаўз абраў, як мы казалі, зямлю паблізу горада на берагах ракі Гарадніцы (Гараднічанкі). Патрэбны быў толькі добры архітэктар і ён хутка з‘явіўся.

Гэта быў час, калі найвялікшай славай карысталіся італьянскія архітэктары. Лёсы гродзенскай архітэктуры другой паловы XVIII ст. трывала звязаныя з адным з іх — Джузэпе Сакка. ”Усё станіслаўскае Гродна (часоў Станіслава Аўгуста — 1764—1795) (ён) быў у Гродне і Гродзенскай зямлі адзіным надзвычай вядомым і прызнаным архітэктарам. Гродзенскі класіцызм — гэта класіцызм Сакка“. Ураджэнец

Вероны Дж. Сакка каля 1768 г. быў запрошаны да Варшавы, дзе супрацоўнічаў з каралеўскім архітэктарам Якубам Фантана і праектаваў пахавальню Марыі Ляшчынскай. Працы Сакка хутка набылі вядомасць. У 1773 г. прымас рэкамендаваў яго ўсёмагутнаму А. Тызенгаўзу, і з тых часоў Сакка назаўсёды пераехаў у Гродна і ўсё жыццё выконваў заказы на гарадскія пабудовы і пабудовы ў іншых частках Беларусі (палац Храптовіча ў Шчорсах і г. д.). Пасля падзення, а потым і смерці А. Тызенгаўза Дж. Сакка не пакінуў Гродна і працягваў там працаваць над архітэктурнымі заказамі да самай смерці. Творчасць гэтага выдатнага дойліда цанілася вельмі высока: маючы чын маёра, званне каралеўскага архітэктара, у 1775 г. ён атрымаў яшчэ і шляхецтва. Дж. Сакка шмат працаваў і ў суседняй Літве, у прыватнасці ў Шаўляйскай эканоміі.

Будоўля А. Тызенгаўза на Гарадніцы займала правы бераг ракі каля дарогі, якая звязвала Гродна з мястэчкам Азёры. Цэнтрам быў палац А. Тызенгаўза. З боку дарогі да яго прымыкала сажалка (рака Гарадніца была перакрыта плацінай), з супрацьлеглага боку — разлеглы Батанічны сад. За садам у пэўным геаметрычным малюнку стаялі жаўнерскія казармы, далей — стайні, карэтныя хлявы і побач, на дарозе, знаходзіліся 20 ”басняцкіх дамкоў“ (для рабочых) з тарцовымі ўпрыгожваннямі — тыя самыя, якія я ўбачыў у 1948 г. На захадзе з боку горада кампазіцыя завяршалася размешчанымі ў ярах рознымі заводзікамі (піваварным і інш.), млынам, бойняй, домам віцэ-адміністратара. На ўсходзе за мостам была размешчана карчма ”Раскоша“, назву якой прыняла вуліца (зараз Ажэшкі). Зараз, калі казаць аб гэтым будаўніцтве, з жалем павінны адзначыць, што А. Д. Квітніцкая мела рацыю: ”Паступовае знікненне пабудоваў Тызенгаўза працягваецца, пачынаючы са смерці заснавальніка і амаль да гэтых дзён. Ужо на плане 1849 г. на Гарадніцы не пазначаны 30 дамоў тызенгаўзскай пабудовы“, а палац самога магната, ”ператвораны пазней у губернатарскі палац, згарэў у 1915 г. пад час першай сусветнай вайны“.

Шыкоўны палац А. Тызенгаўза (архітэктары Ю. Мезер, Дж. Сакка, мастакі П. Гежыдовіч, А. Грушэцкі) займаў галоўнае месца ў гэтым цудоўным ансамблі. Ён быў аднапавярховым з далёка выступаючымі крыламі (іх канцы мелі два паверхі). Цэнтрам кампазіцыі з‘яўлялася тонка прамалёваная вежка-бельведэр, у ніжняй частцы якой размяшчаўся

ўваход. Будынак быў узведзены ў стылі позняга барока, але меў і асобныя элементы ракако (апрацоўка фасадаў рустам, прыбранне інтэр'ера залы і г. д.). Увогуле інтэр'еры палаца былі шыкоўнымі. Злева ад увахода — прыёмная зала, справа — апартаменты ўладальніка, у крыллях размяшчаліся канторы эканоміі. Апартаменты былі ўпрыгожаныя карцінамі і скульптурамі, створанымі лепшымі еўрапейскімі майстрамі. Асабліва прыгожы выгляд мелі каміны з карарскага мармуру.

Сваім парадным дваром палац быў звернуты да плошчы з яе двума флігелямі, пастаўленымі адзін насупраць другога, і незвычайным паўкруглым домам (т. зв. "крывая афіцына")— музычным флігелем. Адзін з флігеляў захаваўся, ён належаў да рэзідэнцыі віцэ-адміністратара і прызначаўся для яго канторы. Характэрна вельмі сціплая апрацоўка фасадаў (строгія плоскія пілястры). Можна думаць, што незахаваны флігель, які стаяў насупраць, быў такім жа "парным". Паўцыркульны музычны флігель быў задуманы як будынак, фланкіруючы плошчу. Праўда, ёсць меркаванне, што пачатковая задумка была зменена, ансамбль не атрымаў закончанага выразу і "крывая афіцына" засталася не звязанай кампазіцыйна з суседнімі будынкамі. Гэтая пабудова прызначалася для музычнай школы. Тут былі невялікія класы і залы для заняткаў, вучні і выкладчыкі жылі ў мансардзе.



Гродна. Музычны флігель "крывая афіцына" ансамбля А. Тызенгаўза

Паблізу быў размешчаны (зараз перабудаваны) тэатр. Ззаду палаца А. Тызенгаўза ўзвышаецца яшчэ адзін будынак — медыцынская школа, дзе ў тыя часы мясціўся і кадэцкі корпус. Пазней будынак належаў Чацвярцінскім і называўся іх палацам. Ён быў моцна перабудаваны, але фасад захаваў два бакавыя вежападобныя выступы, характэрныя для мясцовых палацаў.

Цікавыя таксама гаспадарчыя і вытворчыя пабудовы Тызенгаўза, многія з якіх мы яшчэ можам пабачыць: былы пакгаўз, зараз, праўда, моцна перабудаваны (вул. Дзяржынскага, 1а), будынак "ляснох адміністрацыі" (вул. Леніна, 45), "кухня і дом служкаў" (вул. Акадэмічная — захавала сваю назву з часоў А. Тызенгаўза) і, нарэшце, гэтыя цудоўныя "басняцкія домікі", якія яшчэ на маёй памяці стаялі па вуліцы Ажэшкі з высокімі франтонамі на тарцах. Тут быў пасёлак для рабочых у ліку 20 аднолькавых домікаў, адна сцяна якіх (парадная), складзеная з цэглы, была высокай і мела барочны франтон, а тры астатнія будаваліся з дрэва і тынкаваліся. Такім чынам спалучалася таннасць пабудовы з рэпрэзентатыўным выглядам. У будынку было тры нізкія пакоі для жылля, пад дахам мясцілася яшчэ мансарда. Падсобная частка складалася з кухні і вітальні. Зараз захаваўся толькі адзін з гэтых незвычайных дамоў. Цікавым будынкам была карчма "Раскоша" на той жа вуліцы Ажэшкі, бліз вакзала. Гэта таксама аднапавярховы будынак з мансардай за высокім



Гродна. Дом віцэ-губернатара ў Гарадніцы



Гродна. Будынак медыцынскай школы ў Гарадніцы

авальным барочным франтонам. Да асноўнага будынка прымыкаюць бакавыя крылы. Такія вось фрагменты грандыёзнага ансамбля Тызенгаўза, якія яшчэ можна пабачыць. Што тычыцца агульнай задумы гэтага энтузіяста, то яна не ўдалася. Для рэалізацыі такога дарагога эксперымента кароль узяў пазыку ў Галандыі (10 млн. злотых), але насуперак спадзяванням апраўдаць траты на прадпрыемства не ўдалося. Злейшы вораг Тызенгаўза Ржавускі ўзяўся аплаціць даўгі, але з Тызенгаўза спагналі 4 млн. злотых, прадпрыемства закрылі, рабочых разагналі (1780). Той жа лёс чакаў аналагічнае прадпрыемства А. Тызенгаўза ў Паставах. Агаломшаны крахам сваёй справы, ідэаліст энтузіяст-рэфарматар Антоні Тызенгаўз у 1785 г. сканаў (пахаваны ў фамільным склепе ў Жалудку (Шчучынскі раён)).

**Францысканскі кляштар і касцёл.** Нам засталося агледзець Занёманне з францысканскім кляштарам і касцёлам (XVII ст.). Там яшчэ часткова захавалася планіроўка старога патрыярхальнага горада: драўляныя прыватныя дамкі з садкамі займаюць увесь схіл левага берага Нёмана. Гэты маленькі астравок мінулага быццам пасунуты сюды сучаснымі пяціпавярховымі скрынкамі, якія засланяюць яму сонца і далягляд (дрэнна будавалі мы ў 50—60-х гадах!). Вечарам,



Гродна. Склад А. Тызенгаўза ў Гарадніцы

пасля службы ў касцёле, тут у цёмных завулках Занёмання, як і некалі, мільгаюць постаці і, як і раней, чутна беларуска-польская гаворка вернікаў, якія разыходзяцца па хатах. Аб чым гавораць? Аб касцёле, аб Богу? Не, часцей аб самых звычайных бытавых справах! Францысканскі касцёл збудаваны ў стылі барока ў 1635 г. У XVIII ст. у ім здарыўся пажар; аднавілі храм у іншым выглядзе. Гэта звычайны для тутэйшых мясцін базілікальны храм з паўкруглай апсідай, са званіцай, прыбудаванай збоку. Яна яўна пазнейшая за храм. У адрозненне ад касцёлаў цэнтра гэты не мае такога тонкага сілуэта.

**Дом Элізы Ажэшкі.** Сярод помнікаў мінулага стагоддзя мы спынімся каля дома вядомай польскай пісьменніцы Элізы Ажэшкі (1842—1910). У сваіх творах яна апісвала цяжкае жыццё мясцовых сялян (”Малюнак з галодных гадоў“, 1866, ”Хам“, 1888), гарадской беднаты (”Юліанка“, ”Шэраньская ідылія“ і інш.), казала аб бяспраўным становішчы польскай жанчыны (”Марта“, 1873). Творчасць Э. Ажэшкі заўжды была блізкай чытачу ў Расіі. Яна сама шмат што чытала з рускай літаратуры, перапісвалася з М. Я. Салтыковым-Шчадрыным. Палітыка царскага ўрада ў адносінах да Польшчы і Літвы яе абурала. У лістах яна скардзілася на цэнзуру, на неабходнасць пастаянна пераносіць дзеянне з Віль-

ні і Гародні ў фантастычныя Анвіль, Анград і г. д. У сваім лепшым рамане ”Над Нёманам“ (1887), дзе яна крытыкавала зямельную арыстакратыю і супрацьпастаўляла ёй сялянскіх працаўнікоў, пісьменніцы ўдалося толькі цьмяна згадаць аб паўстанні 1863 г. ”Акрамя вельмі цяжкіх асабістых момантаў,— пісала яна перакладчыку В. Лаўрову,— цяпер я перажываю больш цяжкі, чым калі-небудзь, агульны момант. У Вільні аднавілі помнік (Мураўёва-вешальніка.— Л. А.), які нас кожны дзень б‘е па твары. Мой дом у Гродне апынуўся на Мураўёўскай вуліцы... Мы жылі ў чаканні і сустрэліся з аплявухай“. Вуліца, на якой стаіць дом Э. Ажэшкі, цяпер носіць яе імя. Дом гэты яшчэ нядаўна стаяў каля самай праезджай часткі, цяпер ён перанесены далей ад яе: рэстаўратары зрабілі дакладную копію дома з новага матэрыялу (захаваныя толькі металічныя часткі — дзвярныя ручкі, аконныя замкі і г. д.). Цяпер у доме Э. Ажэшкі працуе музей пісьменніцы, побач размешчаны яе помнік. У мясцовым гісторыка-археалагічным музеі захаваліся некаторыя яе рэчы, улюбёныя ёю гравюры з карцін Рафаэля — вялізныя, у чорных рамах, фотаздымкі інтэр‘ера пакояў яе дома, зробленыя пасля смерці пісьменніцы.

**Н е к а л ь к і  с л о ў  а б  г р о д з е н с к і м  м у з е і.** Мы азнаёміліся з гістарычнымі помнікамі Гродна. Цяпер прый-



Гродна. Дом Элізы Ажэшкі



Кабінет у доме Э. Ажэшкі

прыйшоў час пайсці ў яго цудоўны музей, які мы ўпаміналі, калі апісвалі замак Баторыя. Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей па складу калекцый з‘яўляецца адным з лепшых на Беларусі. Яго фонды налічваюць больш за 110 тыс. экспанатаў. Музей ствараўся паступова, пачынаючы з 1922 г. і напачатку туліўся ў маленькім памяшканні ў цэнтры горада. Арганізатарам яго быў археолаг Юзаф Ядкоўскі, які яшчэ да рэвалюцыі скончыў Маскоўскі археалагічны інстытут і быў вядомы праз вялікую навуковую працу аб Мірскім замку XVI ст. У 1924 г. яму ўдалося дамагчыся вызвалення для музея часткі палаца Баторыя (там знаходзіліся афіцэрскі гатэль і казіно). У 1925 г. ён змясціў тут сваю, тады яшчэ невялікую калекцыю этнаграфічных і археалагічных прадметаў. Сродкаў у мясцовых улад атрымаць было амаль немагчыма, і камплектаванне музея ішло з вялікімі цяжкасцямі. Яго штат складаўся з трох чалавек: дырэктар Ю. Ядкоўскі, сталяр Н. Я. Улейчык і вартаўнік. Дырэктар знаходзіўся ў пастаянных раз‘ездах за экспанатамі, наведвальнікаў вадзіў ... вартаўнік! Часам шанцавала: на хорах бернардзінскага касцёла, напрыклад, знайшліся унікальныя царскія вароты уніяцкай царквы XVIII ст., умела зробленыя з саломкі (!) з шасцю абразкамі (1924). Значна ўзбагацілася калекцыя музея пасля таго, як Ю. Ядкоўскі распачаў раскопкі на Замкавай гары (1932). Ён вёў працы пяць гадоў; як мы казалі, у 1936 г. пасля

спецыяльнага пасяджэння ў замку Баторыя варшаўскіх археолагаў яго адхілілі з-за недасканалай раскопачнай методыкі. Пакрыўджаны Ядкоўскі з‘ехаў з Гродна, яго змяніў варшаўскі археолаг Здзіслаў Дурчэўскі (1937—1939), а ў 1949 г. работы заканчваў маскоўскі археолаг М. М. Варонін.

Трэба сказаць, што даваенная экспазіцыя Ю. Ядкоўскага не была дастаткова аб‘ектыўнай, эпоха Кіеўскай Русі ў гісторыі Гродна была прадстаўлена ў музеі сціпла і называлася нават... ”візантыйскай“ (!). Сучасная экспазіцыя больш дакладная, але і яна мае шэраг недахопаў і ў значнай ступені вызначаецца антыгістарызмам — хваробай многіх музеяў эпохі т. зв. ”застою“. Гэта відаць з размеркавання матэрыялаў па залах: эпохам палеаліту, мезаліту, неаліту, бронзавага веку, жалезнага веку (т. зв. ”першабытнаабшчынны лад“), якія існавалі на працягу тысячагоддзяў, выдзелена ўсяго, мяркуючы па даведніку 1986 года, палова (!) залы, другая яе палова адведзена для эпохі Кіеўскай Русі і ўзнікнення Гродна... Гісторыя Гродзеншчыны другой паловы XIII—XVI ст. уціснутая ў наступную залу і г. д., затое 10 залаў займае экспазіцыя ”гісторыі савецкага грамадства“ (№ 6—15)! Разам з тым гродзенскі музей носіць назву ”Гісторыка-археалагічны“, яго фонды запоўнены вялікімі калекцыямі старажытных рэчаў, сабраных на археалагічных раскопках, перш за ўсё Гродна, таксама і Гродзеншчыны, і ўся гэтая калекцыя магла б скласці асобны музей. Каштоўнейшай часткай экспазіцыі ў Гродне з‘яўляюцца рэшткі пабудоваў з плінфы, знойдзеныя на музейным двары Ю. Ядкоўскім, З. Дурчэўскім і М. М. Варонінам — Ніжняя і Верхняя цэрквы, ”церам“, а таксама рэшткі абарончых умацаванняў, выяўленыя нядаўна беларускімі археолагамі М. А. Ткачовым, А. А. Трусавым, А. К. Краўцэвічам. Большая частка гэтых знаходак захоўваецца ў спецыяльна збудаваных павільёнах, але пабачыць гэтыя сапраўды унікальныя экспанаты, на жаль, нельга: павільёны патрабуюць перабудовы. Не даводзіцца сумнявацца, што гэта — часовая з‘ява, экспазіцыя музея будзе карэнным чынам перабудаваная, павільёны адрамантуюць, выдатныя ўмацаванні замка Вітаўта, выяўленыя пад час раскопак (на іх зараз глядзяць, як на музейную агароджу, і нават збудавалі тут такую пабудову, месца якой у самым далёкім куце!), зоймуць ганаровае месца ў экспазіцыі, аб іх будуць распавядаць экскурсаводы і г. д. Багацейшыя археалагічныя і гістарычныя фонды музея — гарантыя яго абнаўлення!



Адзін са стваральнікаў Гродзенскага музея майстар Н. Я. Улейчык (1881—1965)

Акрамя таго, вельмі цікавая гісторыя самога музея, якую патрэбна шырока ўвесці ў экспазіцыю. Сваім узнікненнем і былой славай музей абавязаны шматгадовай працы яго адзіных двух супрацоўнікаў: дырэктара Юзафа Ядкоўскага і чырванадрэўшчыка-ўмельца Нестара Яфімавіча Улейчыка (1881—1965), умелымі рукамі якога былі зробленыя ўсе вітрыны і стэнды, уся стылізаваная пад XVI ст. (па малюнках Ю. Ядкоўскага) мэбля. Яна і зараз тут. Ю. Ядкоўскага я, зразумела, у музеі не застаў, але Н. Я. Улейчык, які працаваў у музеі з моманту яго стварэння і да самай сваёй смерці, стаіць перада мной як жывы. Беларус з-пад Індуры, паўнаваты (сэрца!), са знешнасцю, быццам створанай для рэпінскага запарожца, з жывымі разумнымі вачамі. Я заспеў яго на сярэдзіне шостага дзесятка і яму было на што аглянуцца. Кінуўшы погляд паверх акуляраў, ён адкладваў фуганак і пачыналася доўгая гісторыя музея... Не мог зразумець стары Нестар гэтага вучонага суда

над Ядкоўскім: "Панаехалі з Варшавы! Вучоныя паны! Ганьбілі чалавека — не так вядзе раскопкі, тое — не так, гэта — не так! Ну, так скажы, як? Папраў чалавека, калі ён памыляўся (ён жа, як і я,— з народа). Дык не! Звольнілі, выгналі, не паглядзелі, што стварыў музей!"— "А самі вы былі там?"— "Хе! Гэта за польскім часам хіба сталяра бы пусцілі!.." Пераходзіў Нестар на 1939 г.: "Як чакалі мы, беларусы, нашых! Як плакалі ад радасці, атрымаўшы з ваенных грузавікоў рускія газеты!" Цямнеў яго твар пры аповядах аб акупацыі... "Што было! Што было!" — захінаў ён твар рукамі, ціха хістаў галавой. "Былі выпадкі, калі жыхары, сутыкнуўшыся з немцамі, абтрасалі вопратку — "запэцканае" месца... Аднойчы немец стрэліў, але абтрасаць працягвалі..." Дух у Нестара жывы, вось ён бярэ з варштата газету і тыркае ў яе пальцам — важнае месца... Усё чытаў, аб усім мае ўласную думку.

"Нестар Яфімавіч,— кажу я,— калі б вы вучыліся, былі б прафесарам!" (Усміхнуўся: "Ведаю!") Ён і дасціпнічае неяк па-свойму — тонка і разумна, і смела, спыняючы на суразмоўніку паверх акуляраў смяшлівыя добрыя вочы і прыгаворваючы: "Хе, хе!"

Так, Нестар-самародак амаль не вучыўся, жыццё склалася не так, як ён заслугоўваў па сваіх прыродных даных, але апошнія 40 год цалкам аддадзеныя музею. Ці ёсць у гэтым музеі куточак, прысвечаны старэйшаму супрацоўніку, умельцу, энтузіясту-сталяру? На жаль, не! Мы павінны схіляць галаву перад людзьмі, якія бескарысна аддалі сваёй справе ўсё жыццё! Усё сваё майстэрства гэты чалавек аддаў на карысць тым, хто будзе жыць пасля яго!

**Свяцк.** Праехаўшы 18 км у бок Сапоцкіна, у 100—200 м ад дарогі мы трапляем у стары запушчаны, некалі, відаць, пейзажны парк і, прайшоўшы сістэму сажалак, трапляем да выдатнага архітэктурнага ансамбля. Перад намі палац Валовічаў, пабудаваны ўжо вядомым нам Дж. Сакка ў 1779 г. У гэты час эпоха барока ўжо адышла ў мінулае, у моду ўваходзіў класіцызм з яго строгасцю і рэгулярнасцю. Палац Валовічаў — цудоўны ўзор пераходнага часу ад барока да класіцызму.

Увесь будынак сіметрычны, складаецца з трох аб'ёмаў — уласна палаца і двух флігеляў па баках, злучаных з ім паўцыркульнымі галерэямі. Нашу ўвагу прыцягвае перш за ўсё галоўны двухпавярховы корпус з яго эфектным парадным



Свяцк. Паркавы фасад палаца Валовічаў

фасадам. Ніжні паверх апрацаваны рустам, сярэдні, з высокімі вокнамі паводле тагачаснай моды, дзеліцца трыма рызалітамі. За іх франтонамі ён выглядае трэцім ярусам, і ўвесь будынак з шырокім пандусам надзвычай эфектны. Флігелі сціплейшыя, яны пастаўленыя на паніжаным рэльефе, галерэі злучаюць ніжні паверх палаца з іх верхнім. Як і ў цэнтральным будынку, галоўным у флігелях з'яўляецца, відавочна, верхні паверх. Яго вокны выцягнутыя і маюць тонка прамалёваную аблямоўку, квадратныя вокны ніжняга паверха такой аблямоўкі пазбаўленыя. Вуглы верхняга паверха і сцяна над уваходам у флігель у цэнтры руставаныя.

Зразумела, што інтэр'ер гэтага манументальнага палаца павінны быць шыкоўным. У яго афармленні прымалі ўдзел мастакі Т. Манькоўскі і А. Смуглевіч і патрацілі на гэтую працу шмат часу. Перш за ўсё багата ўпрыгожылі парадную лесвіцу і залу, дзе выявіліся як рысы барока, так і класіцызму. Сам Джузэпе Сакка зрабіў эскізы панэляў сценаў, камінаў, рамаў, люстэрак, кансоляў, вазонаў, нават мэблі і назіраў за іх выкананнем. Зала ўпрыгожвалася калонамі, глыбокімі нішамі са скульптурамі. Усюды было шмат насценнага жывапісу і скульптуры. На жаль, жывапіс да нас не дайшоў, яго можна вывучыць толькі па рэдкай манаграфіі В. Татаркевіча.



Свяцк. Паркавы фасад палаца Валовічаў. Выгляд збоку



Свяцк. Правы флігель палаца Валовічаў

Палац эфектна далучаны да паркавага пейзажу. На яго паркавым фасадзе, як і на парадным, няма лішніх упрыгожанняў, рызаліты вельмі сціплыя, але ёсць цікавы тыповы для папярэдняй эпохі барока пяцібаковы выступ сярэдняй часткі — эркер галоўнай залы палаца. Адміністрацыя бальніцы, якая зараз размешчана ў палацы, дрэнна разумее, чым яна валодае. Па няведанню, напрыклад, засадзілі цудоўны курданёр палаца не кветкамі, а дрэвамі (малакаштоўны ясеня-лісцевы клён), закрыўшы тым самым галоўную перспектыву і г. д. Такіх ”ляпсусаў“ тут мноства. Што тычыць парку, то ён патрабуе кваліфікаванага аднаўлення.

**І н д у р а.** Не адкажам сабе ў задавальненні праехаць за 20 км на поўдзень ад Гродна, каб паглядзець маленькі старажытны гарадок Індуру. Першапачатковая Індура знаходзілася на пагорку, акружаным зверху кальцавым валам. За межамі вала відна яе пляцоўка, таксама абведзеная валамі; рэшткі трэцяга вала добра прасочваюцца ў паўднёва-заходняй частцы гэтага помніка. Гарадзішча Індура, такім чынам, некалі было ўмацавана магутнымі валамі і драўлянымі абарончымі



Індура. Квартал беднаты ў 1930-х гадах. (Фота Ю. Ядкоўскага)

сценамі зверху. Раскопкі гродзенскага археолага К. Т. Кавальскай выявілі на гарадзішчы культурны слой, і стала відавочным, што першыя насельнікі тут з‘явіліся ў X—XI стст. Цікава, што, па назіраннях Ф. Д. Гурэвіч, старажытная Індура па сваму характару была ідэнтычнай іншым паселішчам ваколіцы, у прыватнасці такому выдатнаму гарадзішчу, як Муравельнік у Ваўкавыску.

У познім сярэднявеччы Індура належала Давойнам, потым Кішкам, Радзівілам, Пацам і, нарэшце, Валовічам. Троіцкі парафіяльны (прыходскі) касцёл у стылі ампір збудаваны ў 1825 г. пробашчам Радзіевічам, у 1901—1904 гг. яго моцна перабудавалі.

Цікава, што да апошняй вайны многія кварталы Індуры захоўвалі аблічча тыповага сярэднявечнага мястэчка, населенага яўрэйскімі беднякамі. Фотаздымак, які мы тут прыводзім, зроблены Ю. Ядкоўскім у 1930-х гадах і добра гэта ілюструе. Ні яўрэйскіх мястэчак, ні такіх кварталаў цяпер ужо не знайсці. Іх фотаздымкі захоўваюцца толькі ў музеях.



2 частка

# На Росі, Зяльвянцы і Свіслачы

Гэтыя невялікія левыя прытокі Нёмана не на ўсіх мапах можна знайсці, названыя рэкі маюць адносна невялікую працягласць (адпаведна 99, 170 і 121 км), іх берагі маляўнічыя і густа заселеныя. Тут ёсць некалькі старажытных гарадоў і проста вёсак з цікавымі помнікамі мастацтва. Самым буйным з'яўляецца раённы цэнтр Гродзенскай вобласці Ваўкавыск, з яго мы і пачнём.

**В а ў к а в ы с к** — старажытны горад на невялікай рэчцы Ваўкавыі — прытоку ракі Рось. Летапісы ўпамінаюць яго разам са Слонімам пад 1252 г. (Даніла Галіцкі пасылае сюды свайго сына). Такія ж кароткія згадкі маюцца ў летапісах і ў наступныя часы. Пакідаючы свае ўладанні шматлікім сынам, Гедымін аддаў Навагрудскае княства, Ваўкавыск і Мсцібогаў Карыяту (1323).

У 1386 г. тут вяліся перагаворы аб жаніцьбе вялікага князя Ягайлы на польскай каралеве Ядвізе. У год разгрому крыжакоў пад Грунвальдам (1410) Ваўкавыск быў захоплены і спалены крыжацкім войскам, шмат жыхароў трапіла ў палон. У 1500 г. горад увайшоў у Наваградскае ваяводства, затым атрымаў Магдэбургскае права і лічыўся буйным цэнтрам (плаціў падаткі нароўні з Наваградкам і Слонімам). Па трэцяму падзелу Рэчы Паспалітай ён адышоў да Расіі (1795). У пачатку рускага паходу Напалеона тут размяшчаўся штаб Другой арміі пад камандаваннем П. І. Баграціёна. 17 ліпеня 1812 г. горад захапілі французы, але былі выбітыя генералам Сакенам 2 лістапада.

Рэшткі летапіснага Ваўкавыска захаваліся на паўднёва-ўсходняй ускраіне горада, дзе ўзвышаецца ”Шведская гара“ (на захад ад яе — гара ”Замчышча“ і на ўсход — ”Муравельнік“). Раскопкі гэтага комплексу Ю. Ядкоўскім (1925), а пасля беларускімі археолагамі Г. І. Пехам і Я. Г. Зверуга прынеслі важныя вынікі. Высветлілася, што раней за іншыя была заселена ”Шведская гара“ (X ст.), а пазней (XI ст.) — астатнія дзве. Гэта былі, на думку Я. Г. Зверуга, ”крэпасць, потым феадальны замак і, нарэшце, горад“ паблізу земляў ваяўнічых яцвягаў і іншых балцкіх плямёнаў. Тут вывучаны рэшткі жылых паўзямлянак, магутных гарадскіх умацаванняў, знойдзены шматлікія побытавыя рэчы, некаторыя з іх, безумоўна, высокамастацкія вырабы: шахматныя фігуры, вапняковая плітка з выявай звера, цудоўнае касцяное навершша заходнееўрапейскай работы, арнаментаваныя пласціны калчанаў.

Аднак самым значным адкрыццём у Ваўкавыску з‘яўляецца знаходка храма XII ст., будаўніцтва якога было чамусьці спынена пасля закладкі падмуркаў. Храм гэты пачалі будаваць на ”Замчышчы”, відавочна, у першай палове — сярэдзіне XII ст. Мяркуючы па рэштках, гэтая царква задумана даволі блізкай да гродзенскай Ніжняй царквы. Храм меўся быць шасцістоўпным, трохнефавым, трохапсідным, прычым бакавыя апсіды, як і ў Гродне, былі ўнутранымі. Непадалёк ад падмуркаў былі знойдзены вялікія гранітныя і гнейсавыя валуны з адной ці дзвюма гладка адшліфаванымі гранямі, побач расчышчаны яшчэ і ”склад“ плінфы, з якой меркавалася ўзводзіць сцены. Камяні прызначаліся для дэкаратыўных уставак у муроўку, як гэта было ў гродзенскіх храмах, вялікая яма з вапнай — для замешвання рашчыны. Аднак будаўніцтва



Ваўкавыск. Гістарычная забудова горада (канец XVIII — першая палова XIX ст.)



Ваўкавыск. Касцёл (XVIII ст.)



Ваўкавыск. "Дом Баграцёна" (пачатак XIX ст.)

на гэтым было спынена. Цікава, што да паўднёва-заходняга кута храма прымыкалі падмуркі квадратнай у плане вежы, дзе, відавочна, меркавалася размясціць лесвіцу на хоры. Чаму гэты цікавы помнік не дабудавалі, мы не ведаем.

Сучасны Ваўкавыск захаваў некалькі больш позніх помнікаў. Прайшоўшы вакзальную плошчу, мы адразу бачым знаёмыя нам па Гродне абрысы "тарцовых" дамкоў з высокімі франтонамі, якія будаваліся ў XVIII—XIX стст. на гандлёвых плошчах і прылеглых да іх вуліцах. З культавага дойлідства захаваўся фарны касцёл св. Мікалая, збудаваны ў XVIII ст. Ён двухвежавы, базілікальны, дзейнічае і зараз. Цікавым помнікам з'яўляецца і т. зв. "дом Баграцёна", дзе ў 1812 г. быў штаб Другой арміі, цяпер — музей. Пабудова гэтая своеасаблівая праз чатырохкалонны мураваны порцік з арыгінальным франтонам крывалінейных абрысаў. Дом з'яўляецца тыповай правінцыйнай гарадской сядзібнай пабудовай пачатку XIX ст.

**Помнікі ў Гнезна.** З Ваўкавыска лёгка трапіць у Гнезна: патрэбна праехаць да канца маршрута аднаго з гарадскіх аўтобусаў, а потым рухацца спачатку справа ад аднакалейнага чыгуначнага палатна, потым перайсці раку па чыгуначнаму мосту і далей — сцежкамі ўздоўж невялікай рачулкі праз лугі ісці яшчэ тры кіламетры.

Гісторыя сяла Гнезна яшчэ не вывучаная. Мяркуючы па назве, яно, відавочна, старажытнае. Як ужо пісаў акадэмік М. Н. Ціхаміраў, гэтая назва звязваецца з паняццем "гнязда", па-старажытнаруску — роду. Верагодна, такое ж паходжанне мае назва аднаго са старажытнейшых польскіх гарадоў — Гнезна. Польскія гісторыкі з гэтым згодныя. На самай справе на нашай тэрыторыі, у Польшчы і ў іншых славянскіх краінах сустракаюцца тапонімы ад слова"Гнезна" і звычайна суправаджаюцца археалагічнымі рэшткамі вельмі старажытных часоў. Гэта знакамітае Гнёздава пад Смаленскам (відавочна, старажытны Смаленск) з яго вялікім (16 га) селішчам IX — пачатку XI ст. і побач буйнейшы ў свеце курганны могільнік таго ж часу (каля 5 тыс. насыпаў!). Гэта Гняздзілава ў Волга-Окскім міжрэччы са старажытным курганным могільнікам, дзе знойдзеныя манеты X ст., Гняздзілава ў Курскай вобласці, дзе выяўленыя нават манеты VIII ст., нарэшце, упамянутае Гнезна — сталіца старажытнапольскай дзяржавы, дзе знаходзілі манеты каля 1000 г., Гнежджэва каля Луцка (Польшча) і г. д. Усе гэтыя назвы звязаныя з месцазнаходжаннем старажытнейшага родавага калектыву — "гняздом", ад якога пачыналася засяленне ваколіцы па меры росту колькасці насельніцтва. Цікава, што вядомы гісторык Т. Нарбут (1784—1864) адносіў узнікненне Гнезна да паганскіх часоў! Як бы там ні было, Гнезна існавала ў канцы XIV — пачатку XV ст.: яго ўпамінае Літоўская метрыка як вёску вялікага князя, якую ён даваў у трыманне, напрыклад, Манівідам, а ў 1449 г. вялікі князь Казімір перадаў "палац Гнезна" Мікалаю Вашылавічу. Стаўшы прыватнаўласніцкім валоданнем (XV ст.), Гнезна належала шляхецкаму роду Шамятовічаў. У 20-х гадах XVI ст. яны фундавалі тут касцёл. Пасля смерці Г. Хадкевіча (жанатага на Ганне Шамятовіч) Гнезна належала некалькім уладальнікам, з 1814 да 1939 г. тут гаспадарылі Тарасовічы.

Каля невялікай рэчкі Нятупы, у якую глядзяцца нахіленыя вербы, размясцілася вёска Гнезна з яго невялікім цёмна-чырвоным касцёлам Архангела Міхаіла. Дэкаратыўныя стрэльчатыя нішы касцёла, паніжаныя контрфорсы з прыступкавымі кансолямі, кілепадобныя аркі... Перад намі адзін з помнікаў правінцыйнай "позняй готыкі"! Стыль гэты выдзеліўся ў Еўропе ў другой палове XIV—XV ст. У гэты час базілікальныя храмы саступаюць месца невысокім будынкам зальнага тыпу, знікае такі характэрны для готыкі вертыкалізм, сіметрыя



Гнезна. Рака Нятупа



Гнезна. Касцёл Архангела Міхаіла (1524)



Гнезна. Касцёл Архангела Міхаіла. Фрагмент



Гнезна. Касцёл Архангела Міхаіла. Фрагмент

на фасадах і ў інтэр'ерах усё часцей падкрэсліваецца гарызантальнымі элементамі. "Упартая барацьба з крыжакамі і адсутнасць цесных эканамічных і культурных сувязяў з краінамі Сярэдняй і Заходняй Еўропы былі прычынай таго, што да канца XIV — пачатку XV ст. готыка не распаўсюдзілася ў архітэктуры Вялікага княства Літоўскага",— пісала вядомы спецыяліст па позняй готыцы А. С. Янкавічэне. Толькі ў другой палове XV ст. готыка ў сваім познім варыянце пачала пранікаць на гэтыя землі і набывае (у прыватнасці, на Беларусі) свае асаблівыя рысы. Самым ранніма помнікам гэтага стылю з'яўляецца касцёл у Ішкальдзі (1472), яго мы яшчэ пабачым.

Касцёл у Гнезна, збудаваны ў 1524 г. Шамятовічамі, замяніў больш раннюю драўляную пабудову. Гэта параўнаўча нізкі, прыземісты помнік з высока ўзнятым дахам і высокай шмат'яруснай вежай спераду. Рысы готыкі відныя ўсюды: паніжаныя контрфорсы дзеляць будынак па перыметру, стрэльчатыя аркі нішаў, высокі шчыт фасада... Тут мы можам убачыць і тыя рысы, якія адрозніваюць помнікі беларускалітоўскай позняй готыкі. Падобна касцёлу св. Гертруды ў Каўнасе, вежа касцёла выступае за межы фасада цэнтральнага шчыта, знізу яна чатырохвугольная, зверху — васьміграннная. А. С. Янкавічэне схільная бачыць тут (напрыклад, у

размяшчэнні вежы) нават аддалены ўплыў рускай архітэктуры. Аднак у касцёле адчуваюцца і рысы новага стылю. Паглядзіце на тонкія гарызантальныя цягі на сценах, на вежы, паглядзіце на аркі над вокнамі другога паверха, на характар карнізаў. Гэта ж ўсё — рысы новага стылю — рэнесансу! Касцёл у Гнезне тым і цікавы, што ён з'яўляецца помнікам пераходнага перыяду ад готыкі да рэнесансу. У больш раннім Ішкальдскім касцёле падобных рысаў мы яшчэ не ўбачым.

Гісторыя гнезненскага касцёла даволі цікавая і падрабязна разглядаецца ў кнізе аб помніках Гнезна У. М. Пярвышына (1991). Шамятовічы перадалі касцёлу землі, па асобнаму фундушу за ім замацоўваліся сяляне з выплатай штогод з двух двароў дзесяціны даходаў. Аднак праз некалькі дзесяцігоддзяў новыя ўладальнікі храма, прыхільнікі Рэфармацыі Хадкевічыператварылі касцёл у кальвінскі збор. Разам з тым каталікі-прыхаджане перасталі хадзіць у храм і ён стаяў амаль увесь час пусты. У часы Контррэфармацыі (канец XVI — пачатак XVII ст.) гнезненскі касцёл вярнулі ў каталіцтва, а плябан волпенскага касцёла пры падтрымцы віленскага біскупа падаў на ўладальнікаў у суд (1640), які і закончыўся перамогай плябана. У 1678 г., як сведчыць адзін з дакументаў, "з вялікай цяжкасцю адрамантавалі" храм. Моцна пацярпеў касцёл пад час войнаў Паўночнай і 1812 г. У сцяну галоўнага фасада ўмуравана каменнае гарматнае ядро і відны след ад яшчэ аднаго такога ж ядра. Беларускі рэстаўрацыйна-праектны інстытут у апошнія гады праводзіў дэталёвыя натурныя абследаванні касцёла. Высветлілася, што помнік першапачаткова быў задуманы без вежы, узвялі яе неўзабаве пасля пабудовы храма і першы час яна была двух'яруснай. Яшчэ высветлілася, што храм напачатку меў два ўваходы: акрамя галоўнага — яшчэ бакавы ў паўднёвым фасадзе, што партал паўднёвага ўвахода быў значна багацей упрыгожаны, што вокны існавалі толькі на паўднёвым фасадзе, а дах быў пакрыты, па сведчанню У. М. Пярвышына, плоскай дахоўкай. У 1787 г. каля бакавога ўвахода збудавалі рызніцу. Мяркуючы па пісьмовых дакументах, храм у сярэдзіне быў абшыты дрэвам, столь падтрымлівалі 12 слупоў, усё астатняе таксама было драўляным. У кнізе У. Пярвышына можна знайсці цікавыя даныя аб спробах у XVII ст. перазахаваць з гнезненскага склепа ўладальнікаў-кальвіністаў і тым самым вызваліць месца для ўладальнікаў-каталікоў (праўда, гэта не адбылося). Апошнія ўладальнікі Гнезна Тарасовічы рамантавалі касцёл

пасля пажару 1838 г. У пачатку XX ст. быў замураваны апошні ўваход у падзямеллі, выклалі падлогу керамічнай пліткай, а драўляныя хары замянілі цаглянымі. Адбудовы рабіліся ў касцёле і ў 1920—1930-х гадах.

Звернем увагу і на маёнтак уладальнікаў Гнезна, які ўпамінаецца ўжо ў XV ст. З дакументаў XVII ст. мы ведаем, што ён быў абнесены сценамі з брамамі і вежай, якая бараніла ўезд. Ад старых часоў тут захаваўся рэгулярны, перароблены ў пейзаж парк. У цэнтры двара размешчаны панскі дом (30—40-я гады XIX ст.), збудаваны, як высветліў У. Пярвышын, па праекту А. Гарадзецкага. Дом будаваўся яўна з прэтэнзіяй на параднасць, але без дастатковага густу (высокі цяжкі порцік з масіўнымі чатырохграннымі апорамі). Справа і злева — аднапавярховыя часткі, да паўночнага тарца прыбудаваны пяціграння алькеж. Сярод іншых пабудоў сядзібы варта адзначыць корпус стайні з арачным праёмам уезда. У тым жа стылі збудаваная лядоўня са стрэльчатымі (як і стайня) праёмамі вокнаў і дзвярэй. Уяўляецца верагодным, што ўсе гэтыя пабудовы належаць аднаму архітэктару (магчыма, таму ж А. Гарадзецкаму). Пакідаючы сядзібу, кінем позірк на руіны старой брамы, на рэшткі агароджы вакол яе — рэдкія слупы, якія цягнуцца ўздоўж дарогі... Ад усяго гэтага павявае



Гнезна. Лядоўня (30—40-я гады XIX ст.)

рамантыкай даўніны... Не захаваліся тут і іншыя старыя пабудовы: карчма за ракой, вадзяны млын, пажарная каланча ў самым мястэчку. Мінулае прайшло беззваротна!

Назад да Ваўкавыска можна праехаць цягнікам, але ходзіць ён ноччу і лепш выйсці на шашу да аўтобуса.

**Падароск, Поразава, Свіслач.** Да іх мы дабіраемся аўтобусам з Ваўкавыска. Дарога да Падароска выключна маляўнічая — вялізныя сосны, бярозы, прыгожыя далягляды. Вось праязджаем мястэчка Ізабелін з характэрнай прамавугольнай "Плошчай рынку" і простай беленай царквой. Аб вялікім і некалі багатым маёнтку Падароск вядома вельмі мала. У свой час у Віленскім архіве мне сустрэўся акт аб продажы ў 1750 г. Дамінікам і Схаластыкай Аўсянымі гэтага маёнтка Ігнату Сцыпіо-дэль-Кампо і запіс аб увядзенні яго ў спадчыну (там жа ёсць і іншыя дакументы па Падароску). Зразумела адно: у другой палове XVIII ст. уладальнікам сядзібы быў Ігнат Сцыпіо-дэль-Кампо і, відавочна, ім было праведзена будаўніцтва, аб якім мы будзем гаварыць.

Сярод старога парку з манументальнай брамай стаіць аднапавярховы панскі дом. Яго сярэдняя частка мураваная і ўпрыгожаная чатырохкалонным порцікам з прыстаўленай знізу паўратондай. Калоны порціка і ратонды тонкія, абак на кожнай з іх моцна выступае — яўна мясцовая рыса (гл. "дом Баграціёна" ў Ваўкавыску). Бакавыя крылы збудаваны з дрэва ў адзін паверх, яны атынкаваныя і пакрытыя двух-



Падароск. Панскі дом



Падароск. Панскі дом. Порцік з паўратондай

схільным дахам, зрэзаным па тарцах. Фасады будынка выглядаюць вельмі парадна, тонка прадуманая пластыка на фасадзе сведчыць аб вопыце дойліда. За домам — традыцыйная сажалка, з вокнаў яна добра відная, як і вялізныя клёны вакол яе і шырокія далягляды за імі.

Дарога ў Поразава іншая. Яна брукаваная і праходзіць па бясконцых вёсках. Наш аўтобус толькі выходзіць з адной, каб тут жа за невялікім полем уехаць у другую. Хаты стаяць зусім блізка адна да адной і патанаюць у садах і кветніках. Жыццё кожнага двара за плотам навідавоку, усе ўсё бачаць і ўсе ўсё ведаюць. Расклад добра вядомы, і быццам у вялікім горадзе жыхары карыстаюцца аўтобусам, каб праехаць ад адной вёскі да недалёкай суседняй. Тут ідзе сваё асаблівае жыццё — усе знаёмыя між сабой, прыветлівыя, вітаюцца, развітваюцца, жартуюць.

Вось справа ад нашага шляху мільгануў указальнік "Краскі" і за ім — алея са старых таполяў. Тут сярод парку плошчай у 6 га, створанага ў "натуралістычным" стылі, стаіць вялікі дом пана Сегліца, збудаваны ў пачатку XX ст. у стылі "англійскай готыкі". Гэта цікавы прыклад правінцыйнай архітэктуры, калі дойлід, які не мае вялікага таленту, імкнецца пераняць усе выкрунтасы сталічнай архітэктуры новага моднага стылю "мадэрн". Тут і "замкавая" вежа з зубчатым верхам і дзівосны атык на цэнтральнай частцы



Краскі. Дом пана Сегліца

пабудовы, і шырокія вялікія вокны, што адно з другім не вяжацца. Дом абвіты вінаградам, і гэта ў значнай ступені хавае хібы архітэктара. Усё-такі архітэктура дома Сегліца відная. Нельга пагадзіцца з архітэктарам, які эфектным вежам замкавага тыпу ў трактоўцы ўвахода супрацьпастаўляе вежы і зубцы немаштабна маленькія, дэкаратыўныя, у выніку будынак не ўспрымаецца адзіным маналітным аб'ёмам.

"Натуралістычныя" паркі ўвайшлі ў моду ў сярэдзіне XIX ст. на змену пейзажным. Творчы пачатак у садовым мастацтве замянілі простым капіраваннем прыроды. Стваральнікі паркаў XIX ст. механічна пераносілі раслінныя групы, якія сустракаюцца ў прыродзе, у паркавы ландшафт. Яны лічылі, што расліны заўсёды будуць прыгожымі, калі глеба ўрадлівая і дастаткова вільгаці. Была інтрадуцыравана вялікая колькасць замежных гатункаў раслін. З дапамогай батанікаў многія паркі зрабілі падобнымі на батанічныя сады. Вось і ў Красках ускраіна парку аформленая шэрагам экзотаў. Ля дома растуць і сасна Веймутава, і лістоўніца еўрапейская, і ломнас вінаградаліставы, і магонія падубаліставая, і скумпія і інш. Парк напоўнены дзіцячымі галасамі: палац Сегліца заняты цяпер дзіцячым касцёватуберкулёзным санаторыем.

**П о р а з а в а** стала вядома Еўропе праз трагічныя падзеі, якія адбыліся тут у 1858 г. Як вядома, у 1839 г. па загаду

Мікалая I уся уніяцкая Беларусь гвалтоўна была звернута да праваслаўя. У 1850-х гадах жыхары Поразава парвалі з праваслаўем і вярнуліся да уніі. У выніку ўсе хрысціяне мястэчка (каля 1000 чалавек) былі падвергнутыя салдацкай порцы (!), аб чым з абурэннем пісаў А. І. Герцэн у ”Колоколе“. Поразава ляжыць у 30 км ад Ваўкавыска на рацэ Росі. З яго помнікаў вядомы Міхайлаўскі касцёл, збудаваны ў 1825 г., і, галоўнае, выдатны драўляны (!) дом багатага пана першай паловы XIX ст. Да яго мы і пяройдзем.

Сядзібны дом у Поразаве я ўпершыню ўбачыў у архіве на цудоўных фотаздымках знакамітага віленскага фатографа Яна Булгака і гарэў жаданнем хутчэй туды накіравацца. Сядзіба знаходзіцца ў 2—2,5 км ад мястэчка і да яе трэба ісці праз палі. Ужо здалёк відаць яе высокія паркавыя дрэвы. Брама не захавалася. Галоўная алея сярод старых ліпаў вядзе прама да курданёра, а за ім відаць і сам драўляны дом. Асаблівую цікавасць у ім выклікае характэрная для некаторых багатых сядзібных дамоў гэтага часу складаная планіроўка будынка, пры якой з бакоў ён фланкіраваны прыбудовамі-”алькежамі“,ператворанымі тут у два павільёны з шатровым пакрыццём, люкарнамі ў іх і з самастойнымі ўваходамі. На Беларусі маецца ўсяго чатыры такія пабудовы. Характэрны і дах дома — ”двух‘ярусны“ ў выніку двайнога рада крокваў, што дазваляла рабіць вялікія пралёты перакрыццяў, а таксама



Поразава. Панскі дом



Поразава. Панскі дом. Паркавы фасад

будаваць тут мансарду. Рысы неабарока ў поразаўскім будынку несумненныя. Ён вельмі святочны і дасягнута гэта зусім не простымі сродкамі (дэкаратыўнае ўбранне порціка, складаныя эркеры паркавага фасада). У порціку прыгожа спалучаюцца разное ўпрыгожанне верхняй часткі акна з точанымі балясінамі дэкаратыўнай балюстрады. На рызалітах і порціку — своеасаблівыя драўляныя кубышкі. Паркавы фасад не мае выхадаў, але ён выглядае не менш шыкоўна: цэнтральны эркер з фальшывай балюстрадай з точаных балясін больш масіўны, чым астатнія, над ім складаны дах з невялікім акном, аблямаваным разнымі валютамі, бакавыя эркеры прасцейшыя. Над усімі вокнамі цягнецца масіўны карніз са складанай прафіліроўкай. Дах дома пакрываўся дранкай, сляды якой яшчэ бачны на вежах-алькежах і на сярэднім эркеры. Толькі дзіву даешся, якога эфекту можна было дасягнуць у дрэве, пераймаючы эпоху барока, пры наяўнасці таленту і тонкага густу архітэктара. Высокамастацкая каштоўнасць гэтага будынка несумненная. Будынак зараз заняты пад бальніцу, кіраўніцтва якой, відавочна, разумее яго мастацкія вартасці і абыходзіцца з ім беражліва. Нельга, нарэшце, не адзначыць і рэшткі прыгожага пейзажнага парку Поразава.

Ад Поразава да **С в і с л а ч ы** ўжо недалёка. Тут мы ўступілі ў вобласць т. зв. "паўторнай тапанімії", распаўсюджа-

най на Беларусі, што звязана, відавочна, з нейкімі перамяшчэннямі насельніцтва ў глыбокай старажытнасці. Так, у Дняпроўскім і Нёманскім басейнах ёсць дзве Бярэзіны, дзве Свіслачы і г. д. У навуцы яшчэ не вызначана, якія славянскія плямёны ў старажытнасці пакінулі гэтыя назвы і ў які бок яны рухаліся. Тут прыйдзе на дапамогу сумесная праца тапанімістаў і археолагаў.

Гарадок Свіслач (нёманскі) размешчаны ў Гродзенскай вобласці на аднайменнай невялікай рэчцы. Ён невялікі, але акуратны. Час узнікнення яго невядомы, але, мяркуючы па магільнаму каменю, які існаваў яшчэ ў XIX ст. на месцы ліквідаваных могілак у цэнтры горада: "Року 1652 тут пакладзена цела Льва (Я)цкевіча, дзіцяці", можна думаць, што ён ужо існаваў у XVII ст. Ёсць таксама сведчанні гісторыкаў, што свіслацкі касцёл заснаваны ў 1666 г. У XVIII ст. Свіслач належала Крышынам, якія, паводле даных гісторыка Свіслачы Я. Ф. Арлоўскага, збудавалі там з дрэва уніяцкую царкву Троіцы (упамянутая ў 1768 г.). У сярэдзіне XVIII ст. горад быў куплены графам Антоні Тышкевічам — генерал-лейтэнантам войскаў Вялікага княства Літоўскага, і па яго смерці перайшоў сыну — Вікенці Тышкевічу (1757—1816). Пераехаўшы ў Свіслач, малады граф вырашыў поўнасцю рэфармаваць гарадок і зрабіць яго цэнтрам гандлю і асветы. Мястэчка было перапланавана, у ім правялі пяць вуліц, некалькі з іх пачыналіся мураванымі брамамі. Будынкі на гэтых вуліцах перараблялiся адпаведна тым тыпам дамоў, якія выпрацаваў уладальнік маёнтка. Частка жыхароў высялялася ў іншыя месцы. У цэнтры гарадка на месцы старых могілак вырас гасціны двор з тэатрам і танцавальнай залай. Неўзабаве ў Свіслачы быў заснаваны яшчэ адзін тэатр. Відавочна, пры графе Вікенці быў адбудаваны свіслацкі палац (не захаваўся) і добраўпарадкаваны цудоўны парк з весяленнямі для гараджанаў (арэлі, каруселі і г. д.). Свіслач стала буйным гандлёвым цэнтрам з кірмашамі, і яе ўладальнік разлічваў, што пад час кірмашоў паркавыя весяленні прывабяць у горад яшчэ больш прыезджых. У 1806 г. на свае сродкі Вікенці Тышкевіч адчыніў тут першую свецкую навучальную ўстанову ў губерні — гімназію. У летні час клапатлівы граф запрашаў гімназістаў у сваю летнюю рэзідэнцыю Сімфоны (зараз Клепачы) у 9 км ад Свіслачы, дзе ў шыкоўным парку ўстройваліся лодачныя катанні, на астравах дазвалялася ганяцца за зайцамі і трусамі. Вядома, што пад час наступ-

лення французаў у 1812 г. палац у Свіслачы быў імі заняты, а стары граф быў змушаны туліцца ў людской. Фадзей Тышкевіч, атрымаўшы ўладанне свайго сваяка пасля смерці В. Тышкевіча, абавязаўся збудаваць новы будынак гімназіі. Новая гімназія была адчынена ў 1827 г. (аўтар праекта К. П. Падчашынскі). Аднак доўга праіснаваць пачынанням Тышкевіча не давялося. Пад час расследавання прычыны "беспарадкаў" у Віленскім універсітэце (1823) камісія Навасельцава даведалася аб існаванні тайных таварыстваў навучэнцаў свіслацкай гімназіі. У 1825 г. пяць гімназістаў былі аддадзеныя ў салдаты. Дух вызваленчага руху ў гэтай навучальнай установе не быў выпадковым: сам Фадзей Тышкевіч за актыўны ўдзел у паўстанні 1830—1831 гг. быў у выгнанні і скончыў свае дні ў Парыжы. Свіслач перайшла да казны. Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў загадала перавесці выкладанне ў гімназіі з польскай на рускую мову, а ў 1845 г. увогуле яе зачыніла, размясціўшы ў будынку Дваранскае вучылішча. У 1851 г. яно было ператорана ў прагімназію, а ў 1864 г. пасля паўстання 1863 г. зачынілі і яе. Толькі ў 1876 г. у тым жа будынку адчынілі настаўніцкую семінарыю. Будынак свіслацкай гімназіі захаваўся. Ён знакаміты тым, што ў ім вучыліся пісьменнікі Л. Зянкевіч, П. Крашэўскі, а ў перыяд існавання Дваранскага вучылішча яго скончыў знакаміты дзеяч беларускага вызваленчага руху Кастусь Каліноўскі.

Самы цудоўны помнік старажытнасці ў Свіслачы — стары французскі (рэгулярны) парк, якіх не так шмат захавалася на Беларусі. Парк знаходзіцца на ўскраіне горада, на левым беразе ракі Свіслачы, якая тут больш падобная да ручаіны. Парк мае падоўжаную форму і складаецца з некалькіх вялікіх тэрасаў, якія спускаюцца да сажалкі. Уражваюць некалькі ліпавых алеяў з дрэвамі незвычайнай таўшчыні — кожнаму каля 250 гадоў. Ёсць і гіганцкія сосны, таполі. У больш позні час побач з паркам пасадзілі, па вызначэнню В. Г. Анціпава, бальзамічную і сібірскую піхты, шэрую і шызую псеўдатсугу амерыканскую (вышынёй 25 см, дыяметрам 60 см), еўрапейскую, сібірскую і курыльскую лістоўніцы, маньчжурскі арэх, белую шаўковіцу і г. д. Парк перасякаюць дзве прамавугольныя сажалкі, злучаныя са Свіслаччу. Паміж вадаёмамі — пагорак, на якім некалі, верагодна, знаходзілася альтанка.



# 3 частка

# На правым беразе Нёмана

З Ваўкавыска нам трэба перабрацца на правы бераг Нёмана. Аўтобус ідзе па мала цікавай дарозе праз вёску Пескі (навокал, сапраўды, пяскі і сосны) да Мастоў. Масты — на правым беразе, да іх перакінуты вялікі мост, пад якім далёка ўнізе імкліва коціць свае магутныя мутна-зялёныя воды шырокі Нёман. У Мастах — невялікім сучасным гарадку — можна пераначаваць у зручным новым гатэлі, пахадзіць па берагах ракі, паглядзець, як ідзе пагрузка лесу на чыгуначныя платформы, перайсці па падвеснаму пераходнаму мосціку на левы бераг у "Паркавую зону адпачынку". Аднак наш шлях ляжыць далей у раён Шчучына, Ліды і Іўя.

**Шчучын** — невялікі гарадок на ўрадлівых раўнінах, прыблізна на сярэдзіне дарогі з Ваўкавыска ў Ліду. Некалі



Шчучын. Палац (другая палова XVIII ст.)

гэта было прыгожае ўладанне Сцыпіёнаў, заснаваўшых тут школу і калегію піяраў. Бібліятэка кляштара піяраў налічвала 1469 тамоў, у асноўным па медыцыне і матэматыцы, шмат было і твораў класікаў — Гамера, Гарацыя, Плутарха, Ціта Лівія, французскіх энцыклапедыстаў і г. д. У 1742 г. Тэрэза Сцыпіён, як сведчаць дакументы, арганізавала ў Шчучыне шпіталь. Сам па сабе гарадок быў гандлёвым, і да яго збіралася вялікая колькасць прыезджых людзей.

Сярод старадаўняга рэгулярнага парку ўзвышаецца даволі кампактны двухпавярховы шчучынскі палац, збудаваны ў другой палове XVIII ст. у пераходным стылі ад барока да класіцызму па праекту архітэктара Ю. Піёлы. Архітэктура помніка вельмі своеасаблівая і даволі строгая. Сіметрычная кампазіцыя з двух даволі блізка пастаўленых двухпавярховых аб'ёмаў, паніжаная лоджыя між імі і дзве канеліраваныя калоны ствараюць уваход. Ён такім чынам падкрэслены не павышэннем, як звычайна, у помніках класіцызму, а паніжэннем, прычым, падобна да пабудоў барока канца XVIII ст., на пілястрах і калонах выкарыстаны іанічны ордэн. Яшчэ адна цікавая падрабязнасць: развітыя карнізы з невысокай балюстрадай наверсе абодвух аб'ёмаў тонка апрацаваныя



Шчучын. Касцёл-ратонда

сухарыкамі — так падкрэсліваўся пераход да балюстрады сярэдняй часткі.

Цікавай асаблівасцю касцёла-ратонды, размешчанага ў цэнтры Шчучына (1827), з'яўляецца спалучэнне "манументальнай формы (...) з драўлянымі элементамі (вежка над уваходам, ліхтар купала, гонтавае пакрыццё)". Царква Міхаіла Архангела другой паловы XIX ст., збудаваная насупраць касцёла, асаблівай увагі не заслугоўвае: яна збудаваная ў псеўдарускім ("мураўёўка") стылі, які ўвялі тут пасля разгрому паўстання 1863 г.

Варта звярнуць увагу на стары панскі дом, збудаваны ў пачатку XIX ст. на ўскраіне горада каля ўскрайку лесу. Гэта аднапавярховая пабудова, у плане — выцягнуты прамавугольнік; адзіным упрыгожаннем з'яўляецца порцік з чатырма спаранымі калонамі па баках ад увахода (дарычны ордэн) і франтонам. "Гэты помнік архітэктуры класіцызму,— сведчаць спецыялісты,— належыць да рэдкага тыпу пабудоваў, якіх засталіся адзінкі".



Шчучын. Панскі дом

**М а л о е М а ж э й к а в а, М у р а в а н к а.** Да гэтых вёсак мы набліжаемся па маляўнічай шашы: па пагорках ідзе алея з вербаў, бяроз, соснаў, а за імі радуюць вока прыгожыя далягляды. Мінуем Вялікае Мажэйкава з цудоўным французскім (рэгулярным) паркам, закладзеным у 1787 г. на плошчы ў 10 га (палац — у 1914 г.), які і зараз добра захаваўся. І вось мы ля мэты: аўтобус спыняецца каля вёскі Малое Мажэйкава.

Па дарозе да знакамітай царквы ў вёсцы Мураванка (да яе 3 км) звернем увагу на маламажэйкаўскую панскую сядзібу, збудаваную ў стылі класіцызму. Вельмі просты аднапавярховы дом з мезанінам, упрыгожаны чатырохкалонным порцікам вялікага ордэра (сярэдзіна XIX ст.), фасады руставаныя лапаткамі, а побач — невялікія стайні з арыгінальнымі маленькімі двухкалоннымі порцікамі і паўцыркульнымі вокнамі. Цікава, што і ў ферме, і ў стайні выкарыстаныя ўсё тыя ж улюбёныя тут абакі. З паўночнага ўсходу ад дома захаваліся рэшткі рэгулярнага парку з прамымі алеямі, дзвюма аднолькавымі квадратнымі сажалкамі (цераз пратоку паміж імі быў перакінуты масток). Парк невялікі, моцна запушчаны, але прыгожы да гэтага часу — над вашымі галовамі варушацца верхавіны вялізных двухсотгадовых ліпаў...

Падобна да храма ў Гнезна, царква ля вёскі Мураванка (у гісторыях мастацтва мінулых часоў яна вядомая як царква ў Маламажэйкаве) — таксама цудоўны помнік беларускай



Малое Мажэйкава. Панскі дом (сярэдзіна XIX ст.)



Малое Мажэйкава. Гаспадарчыя пабудовы (сярэдзіна XIX ст.)



Царква ў сяле Мураванка

готыкі. Па сведчанню Ю. Ядкоўскага, храм збудаваны паміж 1516 і 1542 гадамі. Пад час вайны Маскоўскай дзяржавы з Рэччу Паспалітай ён быў моцна пашкоджаны (1654 г.). У ходзе Паўночнай вайны Карл XII звярнуў увагу на абаронча характар помніка і загадаў яго абстраляць. Царква адноўлена толькі ў 1822 г. Істотныя "выпраўленні" ўнеслі ў будынак рамонтныя працы 1871—1872 гг., калі асабліва моцна быў зменены заходні фасад (павялічана вышыня вежаў, адна з іх стала званіцай, быў дададзены прытвор, зняты герсы — жалезныя дзверы, якія апускаюцца. Аднак помнік захаваў шматлікія глухія нішы, вельмі характэрныя для позне-

гатычных пабудоваў Беларусі (Гнезненскі касцёл, касцёл у Ішкальдзі, замак у Міры, храм у Сынкавічах і інш.). Звернем увагу на інтэр'ер: скляпенні тут не проста крыжовыя, нервюры ў цэнтральным нефе ўтвараюць складаны сетчаты арнамент, які ў бакавых нефах пераходзіць у сотавыя сутарэнні.

Такія скляпенні былі распаўсюджаныя ў Чэхіі, Прусіі, Польшчы, Літве, а ў Лівоніі яны вядомыя толькі ў замку горада Рыгі (А. Янкавічэне). Мяркуецца, што падлога тут была выкладзена цэглай. У вежах першапачаткова былі зробленыя вінтавыя лесвіцы, па якіх падымаліся да байніц. Над скляпеннямі храма знаходзілася абарончая галерэя, некалі байніцы былі і на паўночнай, і на паўднёвай сценах храма (захаваліся па тры з кожнага боку). Два ярусы байніц былі ў шчыце храма. Так ахоўваўся ўваход! Увогуле, як і сынкавіцкая царква (якую мы ўбачым), помнік стварае моцнае ўражанне сваёй выключнай манументальнасцю.

**Л і д а.** Як і большасць старажытных назваў ў Цэнтральнай Беларусі, тапонім "Ліда" мае балцкае паходжанне, бо, як мы ведаем, абарыгенамі гэтых мясцін былі ўсходнія балты. Lydimas — тэрмін (блізкі да "ляда"), які абазначае па-літоўску высечку. Менш верагодна, як мяркуюць лінгвісты, сувязь з літоўскім lydas — бег, цячэнне, увогуле дзеянне, якое працягваецца. Паселішча, відавочна, і ўзнікла калісьці на расчышчаным ад лесу месцы. У пачатку XIV ст. тут быў збудаваны мураваны замак. Відавочна, гэтае будаўніцтва дало штуршок да росту паселішча.

XIII—XIV стст.— час жорсткіх баёў беларускіх земляў з Тэўтонскім ордэнам. Немцы рваліся сюды, каб захапіць новыя землі і пакарыць мясцовае насельніцтва. У канцы XIII — першых трох дзесяцігоддзях XIV ст. зарэгістравана не менш васьмі іх апустошальных набегаў: у 1295, 1296 гг. яны спустошылі горад Гродна, у 1304, 1306, 1311, 1314, 1324 і 1328 гг. — усю Гродзенскую зямлю. Каб умацавацца на заваяваных тэрыторыях, крыжакі будавалі там свае апорныя пункты — замкі. Заваяванае мясцовае насельніцтва было абавязана дастаўляць у замкі ўсё неабходнае. Прататыпам гэтых збудаванняў былі, як высветліў М. А. Ткачоў, рыцарскія замкі тыпу "кастэль", якія будаваліся ў еўрапейскіх краінах ужо ў XII ст. Для іх узвядзення выбіралі прамавугольныя ўчасткі ў цяжкадаступных месцах.



Ліда. Замак

У цэнтры горада Ліды мы бачым рэшткі такога ж прамавугольнага збудавання, але ўзведзенага для абароны ад саміх крыжакоў. Захаваліся руіны некалі непрыступных сценаў, вежаў і г. д., якія абводзяць вялікі прамавугольнік... Разумеючы неабходнасць мець у сваіх землях умацаванні, якія б адпавядалі сучаснай яму тэхніцы абароны, вялікі князь Гедымін у 1323 г. загадаў закласці каменны замак у Лідзе. Замак будаваўся больш пяці гадоў. Найлепш была ўмацаваная паўночная сцяна, не прыкрытая прыроднымі воднымі перашкодамі. Перад ёй быў вялікі роў, запоўнены вадой. Падыходы да замка прыкрывалі балоцістыя берагі рэк Каменкі і Лідзеі. Сцены двухмятровай таўшчыні мелі дзве ўнутраныя кутнія вежы, пастаўленыя ў паўночна-ўсходнім і паўднёва-заходнім кутах. Раскопкі А. А. Трусава падцвердзілі выснову М. А. Ткачова, што паўночна-ўсходняя вежа збудаваная пасля 1384 г. (можа быць, на мяжы XIV—XV стст.). У яе кутах удалося прасачыць рэшткі крыжовага нервюрнага скляпення з вялікапамернай цэглы. У сценах вежы А. А. Трусаў выявіў глыбокія нішы, якія, на думку даследчыка, выконвалі функцыю печаў і ацяплялі верхнія паверхі. Абедзве вежы былі пакрытыя дахоўкай. У паўночна-ўсходняй вежы было два выйсці, у сценах — байніцы. У замку ў адной з вежаў мелася свая царква, у 1533 г. перанесеная ў горад. Па падліках М. А. Ткачова для ўзвядзення замка выкарысталі 23 тыс.

кубаметраў валуноў, каля паўтара мільёна штук цаглін. Нарыхтоўка каменняў, цэглы, пяску, вапны і гліны была, несумненна, цяжкай павіннасцю для ўсяго мясцовага насельніцтва, але ў цяжкім XIV ст. замак быў неабходны для ўсіх. А. А. Трусавым у двары замка было знойдзена два калодзежы. А. К. Краўцэвічам выяўлены рэшткі каменных падмуркаў драўлянага будынка XIV—XVII стст. Што гэта было — яшчэ не зразумела, магчыма, тут жылі жаўнеры. Канструктыўнай асаблівасцю замка з'яўляецца яго не вельмі магутны падмурак, які залягае ўсяго на 1,1 м і складзены з груба абчэсаных камянёў на вапнавай рашчыне.

Гедымін памёр у 1341 г. Ліда перайшла да Альгерда, а горад стаў цэнтрам удзельнага княства. Пры яго сыне Ягайле (1350—1434)— заснавальніку дынастыі Ягелонаў — пачалася міжусобная вайна князёў за ўладу, чым скарысталіся крыжакі, і замак неаднаразова цярпеў ад іх нападаў. У 1397 г. Ліда стала прыбежышчам для выгнанага з Арды Тахтамыша. Горад спаліў у 1434 г. Свідрыгайла, калі ад пажару ацалеў адзін касцёл. Замак таксама ацалеў і на 9 гадоў быў аддадзены хану Хаджы-Гірэю разам з усёй лідскай ваколіцай (1434—1443). Трагічныя падзеі адбыліся ў Лідзе ў 1506 г., калі кароль і вялікі князь Аляксандр аб'явіў пагоню супраць наступаўшых татараў, а сам, цяжка хворы, загадаў везці сябе з Ліды ў Вільню. Вялікага князя вынеслі і ўмацавалі на насілках паміж двума коньмі, але ён быў ужо мёртвы, і да Вільні прывезлі толькі цела гаспадара. Моцна разбурылі замак рускія войскі пад камандай князя Мікіты Хаванскага (1659). Дадаў разбурэнняў Карл XII, пад час яго паўторнага паходу ў 1708 г. Пасля яго замак ужо не ўзняўся.

Горад Ліда разросся на поўнач ад замка. Як звычайна, яго цэнтрам быў рынак, да якога падводзілі дарогі з іншых гарадоў. Адпаведна вуліцы называліся: Віленская, Каменская (выводзіла да Каменкі і Васілішак), былі і іншыя вуліцы з характэрнымі сярэднявечнымі назвамі: Замкавая, Крывая і г. д. Першы лідскі касцёл атрымаў назву ў гонар Дзевы Марыі. Мураваны касцёл збудавалі ў 1747 г. па ініцыятыве віленскага біскупа Міхала Зянкевіча. У горадзе ўзвялі таксама і царкву "для ўсходніх вернікаў".

**Іўе.** Гэты гарадок — даўняе ўладанне Кішкаў. Паводле легенды, ён заснаваны Евай — жонкай Гедыміна. Гэта яна быццам збудавала на некалі непраходных балотах ракі Гаўі замак, рэшткі якога відныя ў горадзе і цяпер. У Іўі мы зноў



Іўе. Касцёл (1631)

бачым тыя ж невялікія ”тарцовыя“ дамкі, як і ў іншых гарадах. На плошчы за валам узвышаецца двухвежавы бернардзінскі касцёл Пятра і Паўла, збудаваны разам з кляштарам на іўеўскім Замчышчы ў 1631 г. уладальнікам мястэчка каштэлянам троцкім і літоўскім падскарбіем князем Мікалаем Кішкай. Гэты аднанефавы двухвежавы зальнага тыпу храм з пяцібаковай апсідай мае сціплы, але не пазбаўлены мастацкай выразнасці галоўны фасад. Кідаецца ў вочы супрацьпастаўленне гладкай, моцна выцягнутай у шырыню сцяны ніжняга яруса, быццам бы пакарочанаму верхняму ярусу з тонкімі шырока пастаўленымі вежамі і фігурным шчытом паміж імі.

Пры бернардзінскім касцёле некалі існавала ”Іўеўская арыянская акадэмія“, заснаваная Янам Кішкай (памёр у 1592 г.). У акадэміі было пяць класаў, і ад езуіцкіх і нават кальвініснкіх школаў яна адрознівалася большым лібералізмам, верацярпімасцю (там вучыліся дзеці арыянаў, праваслаўных і католікаў). Акрамя багаслоўя ў ёй вывучаліся: філасофія, гісторыя, права, логіка, рыторыка, этыка, фізіка, музыка, медыцына, а таксама пяць моваў: беларуская, латынь, грэцкая, стараяўрэйская, польская. Пры манастыры працавала бібліятэка, якой карысталіся навучэнцы акадэміі, яна налічвала 489 кніг. Каля 1587 г. рэктарам акадэміі быў прагрэсіўны гуманіст, педагог і паэт, аднадумец Сымона Буднага Ян Немыслоўскі. Яго пяру належаць некалькі падручнікаў для арыянскіх акадэмій, надрукаваных у друкарнях Нясвіжа, Любчы і Лоска.

Упамянём яшчэ два іўеўскія помнікі: сінагогу (XVII ст.) у цэнтры горада — нізкі амаль квадратны ў плане будынак — і мячэць — драўляную, адзіную зараз дзейсную на Беларусі — чатырохвугольнае збудаванне з мінарэтам.



# Навагрудак і ваколіцы

## 4 частка

**Н е к а л ь к і  с т а р о н а к  з  г і с т о р ы і  Н а в а г р у д к а.** У кожнага пры слове ”Навагрудак“ узнікае перш за ўсё асацыяцыя з Адамам Міцкевічам (1798—1855). Так, менавіта тут, у гэтым некалі буйным сярэднявечным цэнтры, а ў XIX ст. ціхім правінцыйным гарадку, правёў сваё ранняе дзяцінства вялікі паэт. Тут ён слухаў старажытныя народныя паданні і казкі, тут старая няня спявала яму народныя песні, тут хлопчыкам бегаў ён па завулках старажытнага горада, гуляў сярод руінаў замка Вітаўта. Тут жа ён напісаў сваю першую оду...

Навагрудак сапраўды старажытны горад: ён узнік у канцы X ст. У XIII ст. Навагрудак — цэнтр невялікага ўсходнеславянскага княства, на стол якога быў запрошаны князь балцкага паходжання

Міндоўг. У 1253 г. ён, заснавальнік Вялікага княства Літоўскага, каранаваўся ў Навагрудку, прыняўшы карону, прысланую папай Інакенціем III. Пляменнікі Міндоўга — полацкі, віцебскі і смаленскі князі — адмовіліся яму падпарадкоўвацца і былі сагнаныя з пасадаў. Пасля вераломнага забойства Міндоўга (1263) яго сын Войшалк захапіў Навагрудак (1265), але і ён урэшце быў забіты. Пераходзячы з рук у рукі, горад пасля смерці Гедыміна стаў уладаннем Кейстута, затым яго сына Вітаўта. Апошні збудаваў тут магутны замак, заснаваў незалежную ад Масквы праваслаўную епіскапскую кафедру, дзе ў 1415 г. нават абіраўся кіеўскі мітрапаліт (!). У 1511 г. кароль Жыгімонт I дараваў гораду Магдэбургскае права на самакіраванне. Па загаду караля Стэфана Баторыя з 1581 г. у Навагрудку праводзіў пасяджэнні Вярхоўны трыбунал, і ў выніку да горада пачало з'язджацца шмат шляхты, жыццё тут значна ажывілася. У 1654 г. пачалася працяглая і ўпартая вайна Маскоўскай дзяржавы з Рэччу Паспалітай. Цар вярнуў Смаленск, Севярскія землі, Кіеў і левабярэжную Украіну (1667). Часова быў заняты і Навагрудак (1654—1660). Па трэцяму падзелу Рэчы Паспалітай ён трапіў у Расійскую імперыю (1795) і ўвайшоў у Слонімскую (з 1802 г. — Гродзенскую) губерню як уездны горад.

**Дзядзінец і вакольны горад Навагрудка.** Дзякуючы археалагічным раскопкам, якія на працягу 20 гадоў вяла ў Навагрудку ленінградскі археолаг Ф. Д. Гурэвіч, гісторыя гэтага горада цяпер праяснілася. У X ст. на двух суседніх пагорках у дрымучых лясах з рэдкім славянскім насельніцтвам утварыліся два славянскія паселішчы. У другой палове XI ст. паселішча, размешчанае на меншай гары (сучасная назва ”Замкавая гара“), было ўмацавана валам і, верагодна, драўлянымі сценамі — утварыўся так званы дзядзінец. У пачатку XII ст. умацаванні гэтыя былі ўзмоцненыя, а ў 60—70-я гады XIII ст. у паўночнай частцы ўзвялі мураваны данжон, байніцы якога былі аблямаваныя цэглай. Неўмацаваны пасад на другой гары (”Малы замак“) у XII ст. быў таксама абнесены валам і такім чынам пераўтварыўся ў ”вакольны горад” (горад в а к о л дзядзінца). Але і гэтых умацаванняў нав248градчанам было мала: у канцы XII — пачатку XIII ст. ля падэшвы пагорка быў насыпаны шасціметровы ніжні вал для абароны падыходу да горада з паўночна-ўсходняга боку.

Магутныя ўмацаванні спатрэбіліся ў пачатку XII ст. таму, што паселішча стала горадам (новым горадам — Наваградкам) — у ім сканцэнтравалася значнае па тых часах гандлёва-рамеснае насельніцтва, якому стала неабходным умацаваць месца свайго жыхарства. Калі пачатковыя паселішчы выглядалі даволі сціпла, то цяпер малюнак карэнным чынам змяніўся. На дзядзінцы жыў князь і, відавочна, усе тыя несвабодныя людзі, якія яго абслугоўвалі,— чэлядзь, замкавыя рамеснікі, можа быць, некаторыя найбольш блізкія да князя дружыннікі. У вакольным горадзе жылі багатыя купцы, рамеснікі (свабодныя), баяры. Многія з баяраў, верагодна, уваходзілі ў дружыну князя. У раскопках выяўлены рэшткі дамоў, якія належалі багатым жыхарам гэтага горада. Сцены некаторых дамоў былі атынкаваныя і нават пакрытыя фрэскамі. Сярод рамеснікаў вакольнага горада асабліва выдзяляліся ювеліры. У XII—XIII стст., мяркуючы па раскопках, Навагрудак быў развітым гандлёва-рамесным цэнтрам. Археалагічныя знаходкі дазваляюць казаць аб сувязях (можа быць, апасродкаваных) старажытнага Навагрудка (XII—XIII стст.) з Цэнтральнай і Паўночнай Еўропай, Арабскім Усходам, Візантыяй, не кажучы ўжо аб землях Русі і перш за ўсё аб сувязях з Кіевам. Па сведчанню Ф. Д. Гурэвіч, ”у XII—XIII стст. Навагрудак быў літаральна напоўнены імпартнымі вырабамі“. Не даводзіцца сумнявацца, што горад быў ласым кавалкам для ворагаў і меў патрэбу ў магутных абарончых умацаваннях. У 1214 г. замак не змаглі ўзяць татары, у 1314, 1391, 1394 гг.— крыжакі.

Мы ідзём па Замкавай гары — дзядзінцу старажытнага Навагрудка, аглядаем рэшткі замка Вітаўта (канец XIV — пачатак XV ст.). Ад некалі непрыступнай цытадэлі засталіся вартыя жалю рэшткі. Яшчэ захаваліся фрагменты трох вежаў: самай высокай і магутнай — Шчытоўкі, менш высокай — ля Фарнага касцёла (так званая касцёльная) і ніжняя частка яшчэ адной, якую часам памылкова лічаць жыллём князя. Дваццаціпяціметровы данжон з эркерам уверсе — вежа Шчытоўка — падобна да заходнееўрапейскіх данжонаў мела браму. Квадратная ў плане вежа мела сцены таўшчынёй 2,6—2,7 м, цалкам выкладзеныя з цэглы (без дабаўлення камянёў). Да гэтай напачатку адзінай мураванай вежы прымыкалі драўляныя сцены. Але барацьба з ордэнам патрабавала больш надзейнай абароны і ў хуткім часе Вітаўт прыбудаваў да вежы



Навагрудскі замак. Рэканструкцыя (мастак Я. Кулік)

новыя ўмацаванні таксама з цэглы. Так узнікла Касцёльная вежа — трохпавярховая, выкладзеная на чатыры метры з каменя, а вышэй— з цэглы. На ўсход ад яе ішла васьмідзесяціметровая цагляная абарончая сцяна таўшчынёй 2,5 м да так званай Малой брамы — трохпавярховай вежы, якая злучала замак з горадам. Яе рэшткі выяўленыя пад час раскопак 1924—1925 гг. і закансерваваныя. Далей на захад цягнулася самая магутная сцяна, якая злучалася з Пасадскай вежай.



Навагрудак. Касцёльная вежа замка

Раскопкамі высветлена, што на дзядзінцы Навагрудка стаяла і невялікая мураваная царква, падобная да Верхняй царквы ў Гродне. Аўтар раскопак М. У. Ма-

леўская лічыць, што храм у Навагрудку быў збудаваны раней за гродзенскі: калі другі датуецца канцом XIV — пачаткам XV ст., то першы патрэбна аднесці да сярэдзіны — другой паловы XIV ст. Тая ж даследчыца выявіла на дзядзінцы мураваную квадратную ў плане пабудову, выкладзеную ўсярэдзіне цэглай з цэнтральным слупам і ўнутранымі перагародкамі,— палац другой паловы XIV ст., некалі перакрыты крыжовымі скляпеннямі. Гэта адзіная такая пабудова на Беларусі.

**Царква Барыса і Глеба.** Вакольны горад Навагрудка закончыў сваё існаванне ў 1274 г., калі князь Леў Данілавіч (Галіцкі) ”утаився Мьстислава и Володимира, взя околний град с татары, детинец остася...“ (Іпацьеўскі летапіс). Аднак ужо тады насельніцтва Навагрудка жыло і за межамі ўмацаванняў, што пацвярджае існаванне там некалі царквы XII ст. Сапраўды, за тэрыторыяй вакольнага горада размешчаны пагорак, дзе зараз узвышаецца знакамітая царква Барыса і Глеба. Храм быў збудаваны на сродкі літоўскага гетмана князя Канстанціна Астрожскага і мітрапаліта Іосіфа Солтана ў 1519 г. у стылі ўжо вядомай нам позняй готыкі. Аднак да гэтага часу месца не было пустым. Раскопкі прафесара М. К. Каргера паказалі, што храм 1519 г. стаіць на рэштках храма XII ст. з мазаічнай падлогай, а яго сцены былі распісаныя фрэскамі. Гэта быў невялікі чатырохстоўпны трохапсідны храм, выкладзены з радоў чэсанага белага каменя, якія перамежваліся з радамі цэглы. Падобны прыём — спалучэнне квадраў і плінфы — быў да нас занесены ў пачатку XII ст. з візантыйскай правінцыі. У гэтай тэхніцы муроўкі ва Усходняй Еўропе была збудаваная толькі адна царква — Дабравешчанская ў Віцебску. Відавочна, майстры, будаваўшыя ў Віцебску, былі запрошаныя ў Навагрудак для ўзвядзення царквы Барыса і Глеба. Тыя ж раскопкі паказалі, што праз чвэртку стагоддзя навагрудскі храм быў з трох бакоў акружаны галерэяй. Аднак будавалі галерэю ўжо не віцебскія майстры, а полацкія: галерэя выкладзена з плінфы ”са схаваным радам“ (што характэрна было для Русі канца XI ст., а ў XII ст. захавалася толькі ў Полацку). Храмы часоў Кіеўскай Русі ўсе лічаныя-пералічаныя; адкрыццё кожнага новага помніка ў раскопках — падзея ў навуцы! Нельга не шкадаваць, што існаванне зараз у царкве памяшкання для архіва з цэментнай падлогай не дало магчымасці такому



Навагрудак. Гістарычная забудова (XIX ст.)

буйному даследчыку, якім быў М. К. Каргер, цалкам даследаваць гэты цікавы помнік.

Існуючая зараз Барысаглебская царква таксама выклікае вялікую цікавасць. Храм збудавалі ў 1519 г. трохнефавым, чатырохстоўпным (скляпенні ўсіх трох нефаў былі размешчаныя на адной вышыні) з высокімі вокнамі і нервюрнымі скляпеннямі. З усходу знаходзілася трохсценная апсіда. Высокі дах быў абмежаваны вострымі шчытамі. Па традыцыі будынак не тынкаваўся, яго фасады пакрытыя грацыёзным аркатурным спляценнем — вертыкальныя цягі, якія зверху заканчваюцца трыма радамі глухіх стрэльчатых арачак. Гэтаксама быў арнаментаваны і заходні фасад да яго пераробкі ў 1632 г. Можна думаць, што, як і ў царкве ў Сынкавічах і ў касцёле ў Ішкальдзі, шчыт будынка, відавочна, меў дэкаратыўныя нішы і быў тут галоўным упрыгажэннем, але да нас не дайшоў з-за названай пераробкі. Вельмі цікава, што на гарышчы царквы каля заходняга фасада выразна відныя некрануты пераробкамі верхні рад арачак і ніжняя частка шчыпца. Нам зразумела, што храм Барыса і Глеба 1519 г. — яшчэ адзін беларускі помнік, збудаваны першапачаткова ў стылі ўсё той жа позняй готыкі. Гэта ўсё той жа род архітэктурных помнікаў, што і абарончыя касцёлы і цэрквы ў Сынкавічах, Мураванцы, Ішкальдзі, што і кафедральны храм у Вільні (які згарэў у 1530 г.), царква Супрасльскага

манастыра (зараз на тэрыторыі Польшчы). Пяройдзем цяпер да цэнтральнай часткі горада Навагрудка, да помнікаў эпохі позняга сярэднявечча.

* * *

Познесярэднявечны Навагрудак — той самы, па цэнтру якога мы зараз ходзім, як і яго гістарычная планіроўка, вывучаны яшчэ мала. Мы выходзім на вялікую трохвугольную плошчу і разумеем, што гэта і ёсць галоўны цэнтр сярэднявечнага горада: плошча рынку, да яе сыходзіліся восем вуліц, якія злучалі цэнтр горада з дарогамі да іншых суседніх гарадоў. Як і звычайна, усе яны мелі назвы, звязаныя або з храмамі, якія на іх стаялі, або са старажытнымі ўмацаваннямі, або, нарэшце, з гарадамі, да якіх гэтыя вуліцы выводзілі. Гэта Бернардзінская (Гродзенская), Базылянская (Паштовая), Траецкая (Мінская), Зямкоўская (Савецкая), Сеняжэцкая (Свярдлова), Валовая (Леніна), Слонімская (Міцкевіча). Вакол гэтай плошчы ўзвышаліся шматлікія будынкі, з якіх галоўнейшымі былі ратуша, Дамініканскі кляштар з касцёлам св. Міхаіла, палац Радзівілаў, гандлёвыя рады і асобныя прыватныя дамы.

**Міхайлаўскі касцёл.** У цэнтры горада, на тым месцы, дзе раней быў Дамініканскі кляштар, мы заўважаем высокі выцягнуты будынак, тарцовы фасад якога дзеліцца на два ярусы складанымі карнізамі і завяршаецца трохвугольным франтонам. Перад намі касцёл Дамініканскага кляштара, збудаваны ў першай палове XVIII ст. Ён неаднойчы перабудоўваўся пасля шэрагу пажараў (1751, 1831 гг. і інш.). Своеасаблівасць гэтай звычайнай трохнефавай базілікі надаюць прыступкавыя атыкі, якія закрываюць тарцы дахаў паніжаных бакавых нефаў. Яшчэ нядаўна ў касцёле з абваленым дахам знаходзілася шмат драўлянай скульптуры, частка якой трапіла ў Мастацкі музей Беларусі. Гэта цудоўныя скульптуры: Марыя, Ян Багаслоў, св. Себасцьян, св. Рох, святыя Дамінік і Давід. Кожная фігура трактаваная ў руху і індывідуальная. Лірычная, напрыклад, фігура св. Роха. Твар яго задумёны, левая рука быццам міжвольна адведзеная ўбок. Сціплыя шырокія адзенні ствараюць адчуванне спакою. Зараз у касцёле працуюць рэстаўратары.

**Дом Міцкевіча** — апошні помнік, з якім мы будзем знаёміцца ў Навагрудку. Геній вялікага паэта адлюстраваў у тонкіх натхнёных вершах душу і гумар народа, сярод якога

прайшло яго юнацтва. Многія з яго лепшых твораў звязаны з Навагрудкам. Адам Міцкевіч нарадзіўся на хутары Завоссе, а з вясны 1804 г. пераехаў з бацькамі ў Навагрудак, дзе яго бацька, адвакат і землямер Мікалай Міцкевіч, атрымаў месца пры гарадскім судзе. ”Той, хто хоча зразумець паэта, павінны ісці ў яго край“, — сказаў Гётэ. І вось мы тут, у цэнтры горада ля дома Міцкевіча, дзе ён рос ”ва ўбогім, але яскравым свеце дробнапамесных сядзібаў, якія жылі традыцыямі шляхецкіх наездаў і суседскіх звадаў. Ён чуў аповяды аб знатных родах, якія некалі кіравалі лёсамі Літвы. Ён бачыў свет, які адыходзіў у мінулае, але захапляў сваёй разнастайнасцю, багаццем чалавечых тыпаў. З ранняга дзяцінства яму быў блізкі беларуска-літоўскі люд, ён ведаў яго звычаі, паданні і песні, яго горкую долю...“

У далёкай змушанай эміграцыі вобразы дзяцінства, праведзенага ў ціхім беларускім горадзе, не пакідалі паэта:

З‘яві свой цуд, каб зноў сустрэцца з родным краем,
Дазволь душы маёй, ахопленай адчаем,
Пераляцець туды, дзе поясам блакіту
Над Нёманам лясныя ўзгоркі апавіты,
Дзе прозеленню жыта ў полі серабрыцца
І залаціцца поўным коласам пшаніца,
Дзе ў ярыне свірэпа — россыпам бурштыну,
На ўзмежках дзяцельнік — румянамі дзяўчыны,
А ўпрокідку ў палетках, быццам вартаўнічкі,
Стаяць і ціха шэпчуцца ігрушы-дзічкі.

*”Пан Тадэвуш“*

У 1804 г. адвакат Мікалай Міцкевіч купіў у Навагрудку сядзібу і збудаваў драўляны дом. Праз тры гады пажар знішчыў пабудову, але знайшоўся багаты мясцовы аптэкар, які збудаваў для сям‘і адваката новы, цяпер ужо мураваны, лепшы ў горадзе дом. Бацькі братоў Міцкевічаў памёрлі, старэйшы брат паэта Францішак пакінуў горад пасля паўстання 1831 г., дом запусцеў і яго прадалі. Новы гарадскі адвакат, які купіў будынак, здаваў яго ў арэнду. У 1881 г. дом пацярпеў ад пажару, у 1887 г. быў адноўлены і зноў здаваўся ў арэнду.

Паводле Рыжскай дамовы 1921 г., Навагрудак адышоў да Польшчы. У 1931 г. на будынку ўмацавалі мемарыяльную дошку з надпісам: ”Тут на пачатку жыцця разгарнуў крылы для паэтычнага палёту Адам Міцкевіч“. Толькі ў 1938 г. у доме

быў арганізаваны музей. У вайну дом-музей Міцкевіча быў разрабаваны... Пасля вайны яго аднавілі, зараз музей дзейнічае ў нанова адрэстаўраванай сядзібе.

Мы ходзім па доміку Міцкевічаў, глядзім экспазіцыю, спрабуем уявіць яго выгляд... той, які быў тут у дзяцінстве паэта... Вечарамі ў адваката Міцкевіча збіралася мясцовая шляхта, гаварылі аб бягучых падзеях, абмяркоўваліся чуткі аб набліжэнні Напалеона — ён павінен быў даць палякам і ліцвінам свабоду! Спявалі знаёмыя Адаму з ранняга дзяцінства народныя песні... Паход Напалеона не ўдаўся, надзеі зніклі, усё гэта глыбока запала ў душу будучага паэта і пазней адлюстравалася ў многіх яго творах. Тут у школьныя гады Адам піша першыя вершы (у 12 гадоў, па сведчанню брата Францішка, аб навагрудскім пажары). Непаўторныя шляхецкія тыпы! Колькі бачыў іх Адам у доме бацькі ў Навагрудку! Большасць з іх ён увекавечыў у сваім знакамітым "Пане Тадэвушы". Малюнкі адступлення французаў праз Беларусь знайшлі адбітак у "Конрадзе Валенродзе" (уцёкі арміі крыжакоў). Цяпер мы пакінем Навагрудак і едзем у яго ваколіцы.

**Сядзіба ў Шчорсах.** З Навагрудка шлях ляжыць да сядзібы старажытнага магнацкага роду Храптовічаў-Буценевых — Шчорсы. Дарога туды не ўражвае разнастайнасцю: на працягу гадзіны наш рэйсавы аўтобус перакатваецца з пагорка на пагорак, на працягу гадзіны ў яго вокнах мільгаюць рудога колеру пагоркі, сіне-зялёныя долы, шызыя ўзгорыстыя далягляды. Пасля цеснай і шумнай язды прыемна ўглядзецца ў шырокую прастору, удыхнуць паветра палёў, паслухаць звонкія спевы жаваранкаў, гоман конікаў у травах... Ісці трэба ў бок вёскі, каля якой мы заўважаем вялізныя дрэвы старажытнага парку. Мы ў Шчорсах, дзе шмат разоў бываў Міцкевіч.

Яўхім Храптовіч (1729—1812)— канцлер Вялікага княства Літоўскага — пабудаваў у Шчорсах шыкоўны палац "у французскім стылі", акружыў яго "службамі", заклаў цудоўны парк. Тут працавалі ў 1770—1776 гг. выбітнейшыя архітэктары таго часу — ужо знаёмы нам Дж. Сакка, К. Сімпані (склалі праект), Я. Габрыэль — непасрэдна кіраваў усім будаўніцтвам. То быў час, калі стыль барока павольна саступаў месца класіцызму, і не дзіўна, што абодва гэтыя стылі выразна прасочваліся ва ўсіх палацавых пабудовах.



Шчорсы. ”Карэ“ (службовыя пабудовы)

Уезд у сядзібу ўяўляў сабой парадную двухкалонную браму (рэшткі яе бачныя і цяпер) з адмысловай металічнай рашоткай. Пры ўездзе ў сядзібу злева знаходзіцца ”карэ“ (назва захавалася)— замкнуты квадратны ў плане будынак — службовы двор з глухімі вонкавымі сценамі, усе вокны і дзверы якога выходзяць унутр. ”Грубае“ жыццё абслугі было, такім чынам, не відаць Храптовічам, да таго ж са службовага двара было толькі адно выйсце. Справа — доўгі карэтны хлеў і вялікія стайні, якія зараз не захаваліся.

Палац мы можам разгледзець толькі на старых гравюрах. Гэта ўтульны аднапавярховы будынак эпохі позняга барока з плоскім цэнтральным рызалітам, трохвугольным франтонам і купалам. Глядзім на бакавыя крылы, прыбудаваныя да палаца ў эпоху ампіра, і думаем: як усё гэта было прыгожа і дзіўна кампанавалася з ландшафтам парку... Так, было! Быў цудоўны палац з шыкоўным тыповым для барока інтэр‘ерам, была круглая парадная зала, былі анфілады апартаментаў са зрэзанымі кутамі... Зараз азнаёміцца з гэтай прыгажосцю мы можам толькі па кнігах і асобных гравюрах: палац згарэў у першую сусветную вайну, рэшткі яго разабралі.

Шчорсаўскі палац быў вядомы Еўропе сваёй вялікай бібліятэкай, якая належала Яўхіму Храптовічу. Высокаадукаваны выхаванец Віленскага універсітэта, паэт, вучоны, апантаны бібліяфіл — канцлер адкупіў шэраг вядомых




Шчорсы. Галоўны фасад і план палаца

бібліятэк з найрэдкімі выданнямі. ”У Шчорсаўскай бібліятэцы сярод сачыненняў гданьскіх студэнтаў,— піша ў заўвагах да ”Гражыны“ А. Міцкевіч,— маецца рукапіс некага Ташкі, пазначаны 1735 г., у якім аўтар цытуе хроніку Вінцэнта...“ Тут захоўвалася перапіска Багдана Хмяльніцкага з польскімі гетманамі, арыгінал яго маніфеста да казакаў, дзённікі Марыны Мнішак і г. д. У шчорсаўскай бібліятэцы было мноства самых рэдкіх аўтографаў. Сын Яўхіма Адам Храптовіч-Буценеў (1768—1844), атрымаўшы 10 тыс. тамоў бацькі, сам значна павялічыў збор — у 1846 г. там налічвалася ўжо 15 тыс. тамоў. У бібліятэцы Храптовічаў акрамя А. Міцкевіча займаліся многія дзеячы навукі і культуры (пісьменнік Ю. Крашэўскі і інш.). Пасля смерці Адама Храптовіча унікальная калекцыя кніг і рукапісаў распалася, ацалелая яе частка зараз захоўваецца ў бібліятэцы Акадэміі навук Украіны ў Кіеве.

Мы звяртаемся цяпер да шчорсаўскага парку, які лічыўся



Шчорсы. Дзмітрыеўская царква уніятаў
(Я. Габрыелі, 1776 г.)

лепшым ва ўсім Навагрудскім павеце. Парк гэты пейзажнага тыпу, па ім любіў гуляць і А. Міцкевіч. Ён складаецца з трох частак, цэнтрам кампазіцыі якіх з'яўляецца, зразумела, шчорсаўскі палац. Першая частка размешчаная на паўночны захад ад палаца. У масіве мясцовых гатункаў ліставых дрэваў яшчэ можна заўважыць старажытную кальцавую дарожку, з якой добра глядзець на вадаёмы. Другая частка прымыкала да першай і знаходзілася непасрэдна за палацам: тут размешчана вялікая паляна са шматлікімі групамі дрэў па яе краях. На ўскрайку гэтай часткі яшчэ відны агромністы "дуб Міцкевіча", пад якім, паводле падання, паэт быццам пісаў сваю "Гражыну". Трэцяя частка парку за дамбай моцна забалочаная. З некалькіх сажалак парку большасць высахла, іншыя закінутыя і высыхаюць. Для выратавання парку, паводле сведчання В. Г. Анціпава, патрэбна тэрміновае ўмяшальніцтва спецыялістаў.

Праходзячы праз пасёлак Шчорсы, звернем увагу на яшчэ некалькі цікавых пабудоваў тых жа Храптовічаў. Гэта, на-



Шчорсы. Вяндлярня (20—30-я гады XX ст.)

прыклад, царква св. Дзімітрыя, збудаваная ў якасці касцёла пры ўдзеле Я. Габрыелі ў 1776 г. Яна вельмі масіўная і кідаецца ў вочы сваёй прыплюснутай, быццам уціснутай у фасад квадратнай у плане невысокай вежай з валютамі па баках. Яе прасторны інтэр'ер, перакрыты скляпеннямі з распалубкамі на падпружных арках, дэкарыраваны карнізамі, нішамі, здвоенымі пілястрамі карынфскага ордэра. Вельмі арыгінальная цагляная цыліндрычная вяндлярня, пакрытая дранкай (20—30-я гады XX ст.).

**Замак у Любчы.** Са Шчорсаў да Любчы ходзіць аўтобус і праехаць туды мы можам без цяжкасці. Любча — былы гандлёвы цэнтр на беразе Нёмана, вядомы яшчэ пры Міндоўгу, г. зн. з XIII ст. У 1499 г. кароль Аляксандр дараваў яе свайму пісару Храптовічу, у XVI ст. яна перайшла да Гаштольда (1528), а з 1547 г.— да знакамітага сваім багаццем Яна Кішкі. Стаўшы віленскім кашталянам, той здабыў для Любчы Магдэбургскае права і нават асобны герб. У 1580-х гадах побач з мястэчкам быў збудаваны ўнушальны замак з палацам. У 1606 г. Кішкі параднілiся з Радзівіламі і Любча стала належаць апошнім. Прадпрымальныя магнаты вырашылі эканамічна ўмацаваць і пашырыць новае ўладанне: з Мінска, Навагрудка і іншых гарадоў яны перасялілі сюды мяшчан, стварылі рамесныя цэхі, адкрылі друкарню, дзе выдавалася шмат кніг на розную тэматыку і г. д. Горад быў распланаваны па асабліваму геаметрызаванаму плану. Цэнтрам усёй кампазіцыі быў замак.

Кіруючыся да яго, мы думаем убачыць рэшткі сапраўды замка: вежаў, сценаў, равоў, пад'ёмны мост. На жаль, усё гэта да нас не дайшло. Засталіся толькі руіны — дзве некалі непрыступныя вежы, равы... Любчанскі замак быў збудаваны на ўзвышшы левага берага ракі Нёман, з трох бакоў яго акружалі равы. Адна з ацалелых вежаў — брамная — дае пэўнае ўяўленне аб замку ў цэлым. Магутны цяжкі куб яе нізу пераходзіць вышэй у васьмігранную прызму. У вежы чатыры ярусы бою з байніцамі, па якіх можна вызначыць, на якую зброю яна была разлічана. Восем ружэйных байніц нізу змяняюцца вышэй яшчэ адным ярусам з дванаццаццю такімі ж байніцамі. Трэці ярус мае восем байніц гарматнага бою (можна было страляць у розных накірунках). Зверху пад самым карнізам на кожным баку васьмігранніка размешчаныя па дзве мушкетныя байніцы. Складаная "гатычна-рэнесансная" цагляная муроўка дазваляе лічыць,

што вежы сапраўды будаваліся ў XVI ст. Любчанскі замак быў узяты і разбураны казакамі В. Залатарэнкі (з войска Б. Хмяльніцкага, памёр у 1663 г.) у жніўні 1655 г. Наш далейшы шлях ляжыць на Уселюб.

**У с е л ю б.** Вялікі цёмна-чырвоны ”Ікарус“ кідае водбліскі ад сваіх шырокіх вокнаў на дахі пасялковых дамоў і, рухаючыся на захад, павольна кружыць па пыльных вуліцах незлічоных паселішчаў. Нарэшце, ён асцярожна выкіроўвае на асфальт шашы Іўе — Навагрудак, ідзе на поўдзень паміж высокіх сценаў густога лесу з рэдкімі прыдарожнымі крыжамі (мясцовая асаблівасць) і спыняецца ў пасёлку Уселюб. Каля 1438 г. брат Вітаўта Жыгімонт Кейстутавіч дараваў яго Андрэю Няміровічу. Аднак ёсць падставы сцвярджаць, што Уселюб і раней належаў гэтаму роду, а менавіта канюшаму Вітаўта Яну Няміру (1412—1413). Па ”тэстаменту“ яго нашчадка Андрэя ў 1573 г. мястэчка перайшло да плоцкага ваяводы Станіслава Давойны, а ў нашчадкаў Давойны ўсю ”Уселюшчызну“ купіў віленскі ваявода Мікалай Радзівіл (1573); частку маёнтка атрымалі ў спадчыну Пацы. У апошнія часы Уселюбам валодалі графы О‘Ркі. Такая вось нескладаная гісторыя мястэчка.

Адметнасцю Уселюба з‘яўляецца яго знакаміты парк — адзін з лепшых на Беларусі па захаванасці. Ён складаецца з дзвюх частак: больш старажытнай — ”французскай“ (рэгулярнай) і навейшай — “англійскай” (пейзажнай). Цэнтрам першай быў дом уладальніка сядзібы, збудаваны ў яе паўночнай палове за дарогай. Парк прымыкаў да яго з усходу — у той частцы, дзе цяпер відныя магутныя ліпы са скрыўленымі ад моднай тады стрыжкі ствaламі. На заходнім баку даўней існаваў вялікі луг, а за лугам выяўлялася перспектыва на вадаём. Пазней на гэтым лузе ўзвялі новы панскі дом, адарваўшы пейзажную частку парку ад рэгулярнай.

Панскі дом не захаваўся, засталося толькі некалькі гаспадарчых пабудоў. Далей цягнуцца могілкі, а ў канцы іх — ”антычны храмік“— пахавальня ўладальнікаў маёнтка XIX ст. графаў О‘Рркаў з выбітай на ёй датай пабудовы — 1839 г. У крыпце капліцы знаходзяцца пахаванні О‘Рркаў і іх сваякоў, але ўсе яны зараз моцна пашкоджаныя.

Са старажытнай часткі парку можна перайсці да пейзажнай. Пры ўваходзе — шыльда, якая паведамляе аб рашэнні Уселюбскага сельскага Савета ўзяць яго пад дзяржаўную ахову. Парк захаваў некалькі ”прагулачных маршрутаў“ —

дарожкі шасцю выгнутымі петлямі ахопліваюць усю яго тэрыторыю. З некалькіх кампазіцыйных цэнтраў раскрываюцца добра прадуманыя перспектывы — парк яўна стварaўся вопытнай рукой спецыяліста. Лепшыя перспектывы — на "відовішчным пагорку", да якога падводзіць алея з сібірскай піхты. На жаль, прыгожая сажалка спушчаная, але дамбы захаваліся і яе контуры добра прыкметныя.

Па дамбах можна прайсці на той бок шашы, дзе на тэрыторыі вёскі Уселюб О'Руркамі ў 1840 г. узведзеная сціплая мураваная царква, а да яе ў 1884 г. прыбудаваная масіўная і высокая званіца. На размешчаных тут могілках можна знайсці прозвішчы некаторых вядомых родаў рускага дваранства (напрыклад, Даўгарукавы).

Аднак ва Уселюбе нас чакае адзін і самы цудоўны помнік старажытнай архітэктуры, аб якім яшчэ нядаўна ніхто нічога не ведаў. У 1986 г. гісторык архітэктуры Р. Баравы звярнуў увагу на ўселюбскі касцёл, збудаваны, мяркуючы па фасадзе, быццам бы ў XIX ст. Яго здзівіла неадпаведнасць строгага плана храма, лаканічна вырашаных яго бакавых фасадаў галоўнаму фасаду, выкананаму ў неагатычным стылі канца XIX — пачатку XX ст. Ужо візуальнае абследаванне помніка сведчыла аб тым, што ён быў збудаваны ў XV ст.— аб гэтым сведчыла перш за ўсё так званая гатычная муроўка (строгае чаргаванне тычкоў і лажкоў), памеры цэглы, вельмі блізкія да цэглы замка Вітаўта ў Гродне, да кафедральнага касцёла ў Каўнасе. Далейшае вывучэнне помніка гэта яшчэ больш пацвердзіла: забудоўка сцен валунамі, цыліндрычныя скляпенні, нервюрныя скляпенні ў сакрысці, нарэшце, сам так званы зальны план помніка. На жаль, не ўдалося высветліць сістэму перакрыцця асноўнага аб'ёму помніка — верхнія часткі яго сценаў занава перакладзены ў 1897 г., калі помнік перабудоўвалі. Вельмі характэрныя для позняй готыкі, лічыць аўтар даследавання, два магутныя прыступкавыя контрфорсы, якія некалі стаялі па баках увахода ў храм. Археалагічныя даследаванні помніка, праведзеныя А. М. Кушнярэвічам, прынеслі новую інфармацыю і ўнеслі ўдакладненні ў высновы Р. Баравога.

Хто ж і калі мог збудаваць уселюбскі касцёл? З дакументаў вядома, што брат памянутага Андрэя Няміровіча Мікалай у 1471—1472 гг. збудаваў у маёнтку Ішкальдзь (захаваўся і зараз) позьнегатычны касцёл. Р. Баравы справядліва, здаецца, мяркуе, што Мікалай не стаў бы будаваць у

сваім маёнтку касцёл, калі б у асноўным гняздзе Няміровічаў Уселюбе не было храма. Ішкальдскі касцёл да гэтага часу лічыўся самым старажытным познегатычным касцёлам на Беларусі. Паводле даследаванняў Р. Баравога і А. Кушнярэвіча, уселюбскі касцёл датуецца першай паловай XV ст. і з'яўляецца, такім чынам, самым старажытным вядомым нам познегатычным помнікам на Беларусі.

Правёўшы нашае кругавое падарожжа праз Шчорсы, Любчу і Уселюб, мы зноў вяртаемся на адным з рэйсавых аўтобусаў у Навагрудак — да яго адсюль усяго 15 км. Па дарозе перад самым Навагрудкам варта сысці з аўтобуса ў Літоўцы — маленькай вёсачцы, таксама апетай А. Міцкевічам.

**Л і т о ў к а.** Мы ў Літоўцы, той самай, якую ўславіў у сваіх вершах А. Міцкевіч. Тут, сярод лясоў у чатырох кіламетрах ад Навагрудка, каля невялікай дамбы ляжыць зараз ціхае круглае азярцо. У высокай прыбярэжнай траве фыркаюць і махаюць грывамі спутаныя коні, рэхам па лесе нясуцца крыкі дзяцей, якія купаюцца ў возеры. Гэта сюды, да гэтай вёскі, гераіня паэмы А. Міцкевіча "Гражына", апрануўшы даспехі мужа, прывяла з Навагрудка войска, каб біцца з крыжакамі. Вынік бітвы вырашыў сам князь Літавор, які паспеў на дапамогу, ліцвіны перамаглі, але жонка князя Гражына была забітая! Паэма канчаецца грандыёзным паганскім пахаваннем на вогнішчы гераіні паэмы Гражыны.

Вакол возера прыемна пахадзіць, пранікнуцца пейзажам, які натхняў калісьці вялікага паэта,— відаць, гэта адзінае месца, якое няшмат змянілася ад часоў А. Міцкевіча!

**С в і ц я з ь.** Пад Навагрудкам шмат мясцін, звязаных з жыццём выдатных дзеячаў культуры і перш за ўсё Адама Міцкевіча. "Немагчыма апісаць пейзажы пасля яго. Сваё бачанне, народжанае настальгіяй, Міцкевіч навязаў сучаснікам і нашчадкам — уяўны капііст гэтых пейзажаў і хранікёр часоў дня і года, ён навязаў сваё бачанне з такой сілай, што людзі паверылі ў іх адчувальную сапраўднасць (...) Іх не раз параўноўвалі і правяралі, і ўсё незвычайна і пераканаўча сышлося; але забываліся толькі на адно, што глядзелі ўжо (...) вачамі выгнанніка, які з дальняй далі, з парыжскай вуліцы бачыў Літву свайго дзяцінства..."— піша біёграф А. Міцкевіча М. Яструн. Але больш за ўсё ён любіў возера Свіцязь. Невялікае круглае возера з крыштальнай крынічнай

вадой, цесна акружанае лесам, здаўна натхняла людзей на стварэнне аб ім паданняў. Як і А. Міцкевіч, Свіцязь апяваў сябра вялікага паэта Ян Чачот. На жаль, сучаснасць унесла ў ваколіцы возера свае няўмольныя карэктывы: гэтая мясціна — любімае месца адпачынку жыхароў Навагрудка. Зеляніна хавае гатэль з бетона і шкла, будынкі пансіяната, на берагах возера чутныя крыкі і смех... Далёка і беззваротна адышла ад нас рамантычная эпоха Адама Міцкевіча!



**5 частка**

# Па старажытнай рацэ Шчары

**З гісторыі Слоніма.** Слонім размешчаны на левым беразе сярэдняга цячэння Шчары — другога па велічыні прытока Нёмана. Старажытная частка горада займае цэнтр сучаснага Слоніма паміж вуліцамі з адпаведнымі назвамі: Першамайская, Савецкая, Энгельса і Маякоўскага. Гэтае месца і зараз завецца Замчышчам. Пяціметровы культурны слой старажытнага горада паказвае, што ён узнік не ў XIII ст., калі яго ўпамінае летапісец, а на два стагоддзі раней — у XI ст. У XII ст. гэта ўжо багаты добраўпарадкаваны горад з вуліцамі, драўлянымі маставымі, з драўлянымі ж зрубнымі пабудовамі, з багатай матэрыяльнай культурай. Пад час раскопак Я. Г. Зверуга знойдзены між іншым залатая манетападобная падвеска,

частка танкасценнага ўсходнеазіяцкага посуду з арабскім надпісам, жалезны шлем з наноснікам і іншыя рэчы, якія даволі дэталёва характарызуюць старажытнае гарадское жыццё.

Асабліва цікавае развіццё Слоніма прыпадае на XVI ст., калі ажывіўся рух па рацэ Шчары. У 1532 г. гэты горад пачынае карыстацца Магдэбургскім правам, па якому гараджане не залежалі так, як раней, ад слонімскага старасты і атрымалі самакіраванне. З 1558 г. па асобнаму прывілею Слонім арганізоўвае ў сябе два кірмашы ў год. У гэтым жа XVI ст. рамеснікі горада аб‘ядналіся ў цэхі. У 1490 г. за ракой быў збудаваны першы касцёл. Сярод слонімскіх стараст ў той час вылучаліся Сапегі, пры якіх у 1591 г. быў атрыманы гарадскі герб. У XVII ст. горад яшчэ больш адбудоўваецца, з 1641 г. яго жыхары абавязваюцца плаціць падатак за брукоўку вуліц. З 1631 па 1685 г. у Слоніме збіраецца генеральны сейм Вялікага княства Літоўскага.

Як і Навагрудак, Слонім належаў да гаспадарскіх паселішчаў і не меў умацаванняў. Умацаваны быў толькі яго замак, які ўзвышаўся на левым беразе Шчары. Планіроўка горада склалася ў XVII ст.: цэнтрам быў замак, ад якога адыходзіла сістэма вуліц (Замкавая, Ражанская, Апанасаўская, Рыбацкая і інш.). Усе яны былі густа заселеныя. Слонім моцна пацярпеў пад час войнаў Рэчы Паспалітай з Расіяй і Швецыяй у сярэдзіне XVII ст. Сейм 1678 г. нават вызваліў яго на некалькі гадоў ад падаткаў. Стольнік Пятра Вялікага П. А. Талстой праязджаў Слонім у 1697 г. і сцісла апісаў драўляны замак, які стаяў на месцы слонімскага дзядзінца. У XVIII ст. плённую дзейнасць у горадзе вёў слонімскі староста гетман Міхал Казімір Агінскі (1729—1800). Імкнучыся вывесці край са стану эканамічнага застою і маючы для гэтага сродкі, М. Агінскі абессмяроціў сваё імя пабудовай у 1770-х гадах пяцідзесяцікіламетровага канала, які злучыў басейн Нёмана з басейнам Прыпяці (г. зн. Балтыйскае мора з Чорным!). Канал карыстаўся вялікай папулярнасцю сярод гандляроў і стаў называцца каналам Агінскага, а Слонім зрабіўся вялікім гандлёвым портам на шляху да Вільні. М. Агінскі таксама асушыў мелкія рукавы Шчары на тэрыторыі горада, а адна з пратокаў, якая працякала каля самага горада, была выпрамлена і паглыблена. З таго часу міма горада плылі караблі з хлебам і лесам з Кіева і Вільні. Другой важнай справай слонімскага старасты было стварэнне

ў горадзе суконнай фабрыкі, на якой працавала шмат раменнікаў, размешчаных у горадзе. Сярод іх многія былі запрошаныя з-за мяжы. М. Агінскі збудаваў у горадзе яшчэ некалькі фабрык і паміж іншых габеленавую мануфактуру.

Каля 1768 г. М. Агінскі загадаў зламаць замак Сапегаў і на яго месцы збудаваў цудоўны вялікі палац з тэатрам і друкарняй. Палац быў аднапавярховым, складаўся з цэнтральнага мураванага корпуса і двух бакавых драўляных, у ім было 116 пакояў. Адным бокам палац выходзіў да парку і ракі, другім — на рыначную плошчу і парк з вадаёмам. Побач з палацам, але бліжэй да Шчары стаяў тэатр. Трэба сказаць, што Міхал Агінскі быў адукаваным чалавекам, які ведаў мастацтвы і, у прыватнасці, музыку (ён быў дзядзькам вядомага кампазітара Міхала Клеафаса Агінскага). У яго слонімскім тэатры прафесійныя мясцовыя і італьянскія оперныя артысты і драматычныя акцёры ставілі шматлікія спектаклі; сярод іх карысталіся поспехам, у прыватнасці, оперы, якія пісаў сам уладальнік тэатра. Прыдворны аркестр Слоніма налічваў больш за пяцьдзесят чалавек і быў самым буйным з такіх аркестраў у Еўропе. Тэатр меў дзве філіі: у Целяханах (зараз Брэсцкая вобласць) і ў Седліцах (Варшаўскае ваяводства); выязджаў на гастролі (у Варшаву, Дубны). Будынак тэатра быў узведзены ў 1780—1786 гг. Ёсць звесткі, што яго сцэна была прыстасаваная для батальных пастановак. Будавалі тэатр архітэктары І. Марайна і Я. Бой, мастакамі былі Штроўбл і Рэгер. Таленавіты кампазітар, М. Агінскі быў і пісьменнікам — аўтарам некалькіх кніг. Дзякуючы яго дзейнасці Слонім у тыя часы пачалі называць ”Палескімі Афінамі“.

Вялікі адбітак на жыцці Слоніма наклала дзейнасць многіх каталіцкіх ордэнаў. Так, бернардзінскія манахі збудавалі касцёл і кляштар у горадзе (у 1630 г.— драўляны, у 1639—1645 гг. — мураваны). Для бернардзінскіх манашак касцёл і кляштар узвялі ў 1664—1670 гг., для бенедыкцінак — у 1669 г. у горадзе, другі — па дарозе на Жыровічы і г. д.

Па трэцяму раздзелу Рэчы Паспалітай (1795) Слонім адышоў да Расійскай імперыі. Спачатку ён быў аб'яўлены цэнтрам Слонімскай губерні, а з 1801 г., калі губерня была скасаваная, стаў цэнтрам уезда. З 1810 г. пачаўся прамысловы ўздым Слоніма. У маёнтку Альберцін на ўскраіне горада памешчыкам С. Пуслоўскім была арганізавана медная (1806) і суконная (1811) мануфактуры, на якіх працавалі прыгонныя

сяляне. Трохі пазней, у 1823 г., удалося падняць узровень вады ў рацэ, збудаваўшы высокую плаціну, і фабрыкі пачалі працаваць на энергіі падаючай вады. Буйная мануфактура была арганізавана М. М. Навасільцавым у 1824 г. (фабрыка сукнаў). Вялікая колькасць дробных фабрык і заводаў узнікла ў Слоніме пасля адмены прыгоннага права (1861). Гарадскі гандаль ажывіўся ў сувязі з адкрыццём канала Агінскага (1804), а пасля правядзення шашы Баранавічы — Слонім — Варшава (1880) і асабліва чыгункі Баранавічы — Беласток (1886) ён пашырыўся ў шмат разоў. Хутка на рацэ Ісе пачала працаваць першая ў Заходняй Беларусі электрастанцыя. Поспехі ў прамысловасці і гандлі спрыялі павелічэнню колькасці гараджан, а гэта, у сваю чаргу, запатрабавала пэўнай перапланіроўкі Слоніма. Першы праект забудовы горада датуецца 1825 г.

**Рынaчная плошча.** Гэтая плошча злучала некалькі вуліц-дарог. У XVII ст. вакол плошчы стаяла некалькі каменных касцёлаў, якія пры патрэбе маглі служыць абарончым мэтам. На паўднёвы ўсход ад рынaчнай плошчы, трохі воддаль ад яе размяшчаўся кляштар бернардзінаў з касцёлам, узведзеным у 1639 г. (зараз праваслаўная царква). Касцёл збудаваны ў формах ранняга барока: ён аднанефавы з трох'яруснай вежай, якая высіцца над галоўным фасадам, мае



Слонім. Касцёл бернардзінаў. (Фота І. Пятраўскаса)

выцягнуты хор, сакрысце і паўкруглую алтарную апсіду. Вельмі цікавыя маленькія круглыя байніцы ў арачных нішах васьмерыка вежы, што паказвае на яго абарончае значэнне. Храм перакрыты цыліндрычным скляпеннем, яго вонкавая дэкарацыя вельмі сціплая: толькі партал і вежа маюць тонка прафіліраванае пластычнае афармленне. Некаторыя спецыялісты мяркуюць, што "ў барочнай увогуле архітэктуры помніка яшчэ бачныя сляды больш ранняга гатычнага стылю: высока паднятыя і вузкія арачныя праёмы вокнаў, традыцыйная абарончая вежа, магутнасць якой падкрэсліваецца кутнімі контрфорсамі..." Прыбудаваныя да помніка капліцы належаць да значна больш позняга часу: паўночная — да 1668 г., паўднёвая — да 1750 г. Інтэр'ер храма вызначаецца сваёй сціпласцю: гэта вялікая зала, аддзеленая ад алтара высокай алтарнай агароджай. Увайшоўшы ў храм, вельмі цікава прасачыць паступовае маштабнае і дэкаратыўнае нарастанне групы бакавых алтароў, дзе дамінуе галоўны, размешчаны ў апсідзе (XVIII ст.). Гэты алтар намнога вышэйшы за бакавыя і дэкараваны значна складаней. На цокалі пастаўленыя цёмна-карычневыя калоны з размацаваным антаблементам і фігурамі анёлаў. Арнаментыка ўсіх алтароў помніка заснаваная на матывах, характэрных для эпохі ракако.

Цікавы П-падобны кляштар, які прымыкае да храмавай апсіды з поўдня. Калі верыць даце на адным з камянёў, ён збудаваны (а можа, рэканструяваны?) у 1749 г. Жылы корпус кляштара мае калідорную сістэму з манаскімі келлямі па баках. Варта звярнуць увагу на крыжовыя і цыліндрычныя скляпенні з распалубкамі. Ва ўсходнім крыле — тарцовая зала-сталоўка, перакрытая цыліндрычнымі скляпеннямі з люнетам.

Цалкам іншы характар мае кляштар бернардзінак, збудаваны на заходнім баку рыначнай плошчы ў 1649—1670 гг. Тут была толькі адна мураваная пабудова — касцёл, які дайшоў да нашых часоў і дзейнічае зараз. Помнік мае многія рысы позняга барока, што адрознівае яго ад храма, які мы толькі што разглядалі: вежа высунутая і не складае адно цэлае з храмам, вялікія вокны, прэсбітэрыум павернуты на ўсход і выходзіць на рыначную плошчу, на апсідзе — фігурная ляпная рама з характэрным для барока сюжэтным малюнкам. Ніякіх слядоў прыстасавання храма для абароны няма.

У эфектна аформленым інтэр'еры касцёла бернардзінак перш за ўсё кідаецца ў вочы грандыёзны галоўны алтар, прысвечаны "бязгрэшнаму зачаццю Дзевы Марыі" (па ім названы і ўвесь храм) з яго карынфскімі калонамі верхняга яруса, якія абліцаваны ў штукавай (пад мармур) тэхніцы і падтаніраваны пад ружовы мармур. Яны аддзеленыя ад ніжняга яруса з фігурамі евангелістаў складаным барочным антаблементам. Аналагічна вырашаны чатыры астатнія алтары і амбон з балдахінам. У сакрысціі захавалася унікальная кафляная печка. Як мы ведаем, некалі беларускія кафляры славіліся на ўсю Усходнюю Еўропу. Суровыя манастырскія пабудовы пачалі ўзводзіць у 1764 г. пад кіраўніцтвам архітэктара-манаха Ігната Авадовіча і скончылі толькі ў 1793 г. Як звычайна, жылыя карпусы кляштара маюць галерэйную планіроўку з келлямі, якія выходзяць вокнамі на ўнутраны двор. У калідорах і келлях захаваліся крыжовыя скляпенні.

Паміж кляштарамі бернардзінаў і бернардзінак падыходы да горада закрываў Дамініканскі кляштар, ад якога захавалася толькі адна пабудова. Ён быў заснаваны ў 1680 г., а мураваны касцёл узведзены ў 1747—1798 гг. На заходнім выездзе з горада ў 1745 г. манахі паставілі невялікі слуп-каплічку св. Дамініка з драўлянай пазалочанай статуяй унутры. Капліца зараз размешчана на вуліцы Пушкіна (Апанасаўская) — адной з самых старых у горадзе. Ёсць сведчанні, што такіх капліц тут было дзве, але другая не захавалася. Па форме каплічка напамінае касцёльныя вежы XVIII ст. Гэта тыповая для барока пабудова мае ў плане квадрат з увагнутымі гранямі і зрэзанымі кутамі. Масіўнаму цокальнаму ярусу супрацьпастаўлены лёгкі скразны верхні ярус, у якім некалі і размяшчалася статуя святога Дамініка. Абодва ярусы падкрэсленыя карнізамі, пакрытымі дахоўкай, уся пабудова завяршаецца фігурным пакрыццём у выглядзе высокага "шлема".

Акрамя названых ужо кляштараў у Слоніме было яшчэ два, але ад іх захаваліся толькі асобныя часткі будынкаў. Другі па колькасці кляштар бенедыкцінак быў заснаваны ў 1669 г. на гарадской ускраіне па дарозе ў знакаміты Жыровіцкі уніяцкі манастыр. Касцёл (Крыжаўзвіжання) спачатку быў драўляным, затым мураваным, але да нашага часу не захаваўся. Застаўся толькі Г-падобны корпус (вул. Чырвонаармейская), збудаваны ў 1801 г.,— келлі для манашак:



Слонім. Капліца Дамініканскага кляштара (1745)

звычайная галерэйная планіроўка, скляпенні. У адной келлі відаць перакрыццё, якое складалася з двух цыліндраў з цэнтральнай падпружнай аркай і распалубкамі. Каля кляштара лютэранскіх канонікаў, паводле звестак вядомага слонімскага краязнаўцы С. М. Новіка-Пеюна, захаваліся рэшткі званіцы езуіцкага кляштара. Гэты кляштар пачалі будаваць у 1705 г.; мураваны касцёл узводзілі вельмі доўга (1740—1769). Побач размяшчалася і абавязковая ў езуітаў школа. Трэба яшчэ ўпамянуць і базылянскі (уніяцкі) манастыр, які некалі стаяў у самым цэнтры горада на сучаснай плошчы Леніна, на тым месцы, дзе зараз знаходзіцца будынак аптэкі. Такі вось склад комплексу манастыроў вакол плошчы Старога рынку ў Слоніме.

Разгледзім і іншыя помнікі ў цэнтры горада. Пачнём з плошчы (зараз пл. Леніна) перад Дамініканскім касцёлам (не захаваўся). Плошча гэтая вядомая з XVII ст. і ў плане ўяўляе сабой фігуру, блізкую да круга. Цэнтрам яе быў Дамініканскі касцёл. Зараз захаваліся толькі жылыя дамы XVIII ст., размешчаныя па перыметру плошчы. Усе яны былі збудаваныя М. Агінскім для яго прыдворных рамеснікаў. Усе дамы аднапавярховыя, усе стаяць адзін каля другога і па традыцыі тарцамі выходзяць да плошчы. Гэта дамы № 7, 9, 11. З архітэктурнага пункту гледжання кожны з іх, узяты па-



Слонім. Гістарычная забудова горада (пачатак XIX ст.)

асобку, вялікай каштоўнасці, можа быць, і не мае, але ў комплексе яны ствараюць пэўную кампазіцыю і надаюць гораду адметны воблік. Тут жа на плошчы агледзім і больш познія дамы, збудаваныя ў канцы XIX — пачатку XX ст., напрыклад № 1 і 6. Дамы гэтыя цагляныя, нетынкаваныя, маюць характэрныя для таго часу арнаменты, выкладзеныя з выступаючых цаглін,— геаметрычныя, зубцовыя і г. д. Падобныя ўпрыгажэнні ў той час былі надзвычай моднымі — імі аздабляліся не толькі жылыя дамы, але і фабрычныя і прамысловыя будынкі.

Дом № 1 заняты краязнаўчым музеем, створаным у 1929 г. мясцовым ураджэнцам высокаадукаваным гісторыкам горада і Слонімскага краю Восіпам Восіпавічам Стаброўскім (1869—1968). Нашае ўяўленне аб Слоніме было б няпоўным, калі б мы не паведалі аб гэтай адметнай асобе. В. В. Стаброўскі паходзіў са старой ваеннай сям‘і. Ён — унук прапаршчыка Вікенція Мацвеевіча Стаброўскага, які служыў у рускай арміі і за подзвіг у бітве 27 мая 1807 г. пры Галібергу быў узнагароджаны ордэнам св. Ганны. Яго бацька — капітан мурамскага палка быў цяжка паранены пад Севастопалем пры абароне Валынскага рэдута. Сястра ж бацькі — актыўны ўдзельнік паўстання 1863 г. (дастаўляла паўстанцам ежу і грошы). Супраць цара ваявалі і іншыя сваякі з боку маці. Пасля амністыі ўдзельнікам паўстання, якую абвясціў Аляксандр III, ужо дарослым В. Стаброўскі слухаў аповяды А. Масальскага (дзеда па маці) аб яго знаходжанні на Нерчынскіх рудніках, дзе за забойства чалавека, які здзекаваўся над ім, дзед правёў 14 гадоў пад зямлёй, прыкуты да тачкі... Сям‘я, у якой вырас гісторык краю, як бачым, была цесна звязана з лёсам Расіі, вызваленчым рухам на Беларусі. Кіпучая творчая натура, В. Стаброўскі яшчэ на вайсковай службе паказаў сябе таленавітым вынаходнікам (асабліва від шрапнелі і ўдасканалены тэлефон). Пакінуўшы службу ў чыне палкоўніка, ён вярнуўся да сваіх улюбёных заняткаў — краязнаўства і археалогіі. Даследчык адкрыў у сваёй ваколіцы мноства стаянак каменнага веку, выказаў гіпотэзу аб месцазнаходжанні старажытнага Слоніма. Сваю буйную калекцыю старажытнасцяў ён ператварыў у краязнаўчы музей і шмат гадоў заставаўся яго захавальнікам і кіраўніком. У цяжкія гады нямецкай акупацыі В. Стаброўскі і яго памочнік — выдатны краязнаўца Сяргей Міхайлавіч Новік-Пяюн лоўка ”замаскіравалі“ важную частку калекцыі і кнігі.

Шматразовыя вобыскі гітлераўцаў так ім нічога і не далі. Калі пасля вайны музей зноў пачаў працаваць, жыхары горада ўбачылі, што ўсе яго кнігі і калекцыі былі ў наяўнасці. Стары чалавек, падняўшы каўнер паношанага шыняля, грэючы рукі над пліткай, працягваў працаваць у халодным памяшканні музея, ствараць новыя працы па гісторыі краю... Ён памёр, трохі не дажыўшы да свайго стагоддзя. Беларускія газеты і часопісы шырока адгукнуліся на смерць выдатнага беларускага краязнаўцы. У музеі вісіць яго партрэт. Ці не пара музею прысвоіць імя яго стваральніка?!

Наведаўшы музей, рушым да яшчэ адной адметнасці горада — старой сінагогі каля цэнтра побач з сучасным рынкам. Яна збудаваная ў 1642 г. у стылі барока. Магутны кубічны аб'ём будынка з трох бакоў акружаны нізкімі пабудовамі яўрэйскай школы. Тоўстыя сцены, суровы знешні воблік, рад вузкіх байніц у ніжнім ярусе (замураваныя) сведчаць аб прыстасаванасці да абароны. Адзіным пластыка-архітэктурным упрыгажэннем з'яўляецца святочны барочны франтон усходняга фасада з круглай люкарнай у цэнтры. Зал перакрыты крыжовымі скляпеннямі, якія абапіраюцца на чатыры слупы бімы. Фрэскавы роспіс інтэр'ера паказвае рамантычныя пейзажы, музычную арматуру. Яна выкананая ў паліхромнай тэхніцы жывапісу, арнамент бімы — у тэхніцы грызайль (адценні аднаго шэрага колеру).

**Ампірны асабняк на Замкавай вуліцы.** На старой Замкавай вуліцы (Камсамольская) размяшчаецца цікавы ампірны асабняк, збудаваны ў першай палове XIX ст. Два асобныя флігелі фланкіруюць цэнтральны корпус, ствараючы перад ім утульны курданёр. Чатыры калоны падтрымліваюць даволі развіты антаблемент і высокі трохвугольны франтон. Пастаўлены на высокі скляпенчаты цокаль будынак, мяркуючы па капітальных сценах, меў тыповую для тых часоў калідорную сістэму планіроўкі. Гэта даволі тыповы асабняк познекласічнага стылю, вырашаны строга і гарманічна.

**Касцёл святога Андрэя.** Гэта адзін з найпрыгажэйшых помнікаў дойлідства Слоніма, збудаваны ў Зарэчнай частцы горада, у прадмесці, якое называецца Замосце. Першы касцёл быў драўляным і паўстаў у 1490 г. Існуючы мураваны касцёл быў збудаваны ў 1775 г. у стылі ракако. Перад намі двухвежавы аднанефавы храм, прамавугольны ў плане, з шырокай прамавугольнай апсідай.



Слонім. Асабняк на Замкавай вуліцы (першая палова XIX ст.)



Слонім. Касцёл св. Андрэя (1775)

Эфектна пастаўленыя вуглом, тонка прарысаваныя ажурныя вежы вельмі своеасаблівыя. Характэрны выгнута-выпуклы фасад помніка з высокім развітым шчытом. У нішах фасада пастаўлены скульптуры апосталаў Пятра і Паўла. "Дэкор храма з'яўляецца выдатным прыкладам высокамастацкай разьбы і ляпніны ракако" (Н. Ф. Высоцкая). Нельга не пашкадаваць, што гэты шэдэўр дойлідства ўсё яшчэ не адрэстаўраваны.

**Альберцін.** У межы сучаснага горада Слоніма ўвайшоў вядомы загарадны маёнтак графоў Пуслоўскіх — Альберцін. Уладанне гэтае некалі славілася праз фабрыкі, якія працавалі на энергіі вады ракі Ісы і выраблялі сукны, палатно, апрацоўвалі метал.

Да сядзібы мы трапляем праз галоўны ўваход з невысокімі пілонамі. Пейзажны парк паступова пераходзіць у лесапарк, і мы пачынаем разумець, што сядзіба Альберцін узнікла, відавочна, у першай палове XIX ст. І на самай справе, непадалёку ад возера перад намі вырастае сядзібны дом, збудаваны яўна ў той час. Будынак выклікае дваякае ўражанне: з аднаго боку, па традыцыях ампіра галоўны ўваход



Альберцін. Панская стайня



Альберцін. Уезд у стайню

выдзелены порцікам з антамі, перакрытым франтонам, прыступкі ўпрыгожаныя скульптурамі двух ільвоў, з другога — з-за глыбокага бакавога рызаліту ўся аб'ёмная кампазіцыя зрабілася асіметрычнай. Інтэр'ер будынка пасля размяшчэння ў ім музычнай школы, на жаль, моцна зменены. Пры Пуслоўскіх у доме была акрамя іншага карцінная галерэя з партрэтамі вялікіх князёў і каралёў. Яна была вывезена немцамі ў 1919 г.

Непадалёк размешчана стайня Пуслоўскіх — характэрны прыклад мадэрна мяжы XIX і XX стст. Збудаваная яна з вялікай фантазіяй. Над уваходам — скульптурная выява галавы каня, арачныя вокны па форме нагадваюць падковы. Іх мы бачым і над здвоенымі аконнымі праёмамі ніжняга яруса і над круглымі акенцамі верхняга яруса. Падковападобны "німб" ёсць і над галоўным уваходам, а таксама на двух размешчаных па яго баках рызалітах і г. д.

Акрамя архітэктурных збудаванняў мінулага — помнікаў, правераных часам і ўвайшоўшых у мастацкую скарбніцу Беларусі, у Слоніме ёсць некалькі цікавых пабудоваў нашага стагоддзя, узведзеных у стылі, які атрымаў назву "цаглянага". Гэта шэраг будынкаў канца XIX — пачатку XX ст., калі ў архітэктуры панаваў шматстылявы накірунак. Цагляныя пабудовы часта не тынкаваліся; іх фасады, аконныя праёмы, карнізы і г. д. было прынята ўпрыгожваць дэкаратыўнай муроўкай з асаблівай, спецыяльна заказанай цэглы лякальнай формы. Атрымліваліся складаныя геаметрычныя зубцовыя арнаменты, якія аздаблялі верхнія абрысы фасадаў будынкаў, вокны. Гэта — жылыя дамы на плошчы Леніна (№ 1), на вуліцы Янкі Купалы (№ 5) і інш. Да гэтага ж стылю варта аднесці гарадскую каланчу на вуліцы Студэнцкай (№ 7), аднак дэкаратыўнага ўбранства тут амаль няма.

У часы буржуазнай Польшчы (1919—1939) шырока ўвайшлі ў моду пошукі так званага "нацыянальнага стылю", узводзіліся будынкі, якія адначасова нагадвалі эпоху барока мясцовай сядзібнай архітэктуры і драўляную архітэктуру мясцовых дробнапамесных шляхецкіх сядзіб (драўляныя гарадскія асабнякі, збудаваныя ў 1923 г. на вул. Савецкай (№ 58) і на вул. Чкалава (№ 9). У тым жа стылі ў 1922 г. быў збудаваны і слонімскі вакзал.

Закончыўшы з цікавымі помнікамі Слоніма, пяройдзем да агляду мастацкіх помнікаў яго ваколіцы.

**Жыровіцкі манастыр.** У 10 км ад Слоніма па дарозе на Быцень знаходзіцца старажытны Жыровіцкі манастыр. Яго заснаванне звязана з даўнім паданнем. У часы вялікага князя Казіміра Ягелончыка (1440—1492) тут каля ручая Вікні, які ўпадае ў Шчару, у глухім тады лесе на дзікай грушы пастухам з'явіўся абраз Багародзіцы. Магнат Аляксандр Солтан (які толькі што атрымаў ад караля гэтыя землі) не надаў значэння знаходцы, але пакінуў яе ў сябе і замкнуў у стол. Аднак на другі дзень ён не змог паказаць абраз сваім гасцям: ён знік. Пастухі знайшлі яго на ранейшым месцы, і ўражаны Солтан загадаў збудаваць тут драўляную царкву, якую "аснасціў і абдарыў" слонімскі маршалак Ян Солтан, а Аляксандр Солтан змясціў знойдзены абраз. Праз стагоддзе храм згарэў, а абраз зноў знік. Яго знайшлі ўжо на вялізным камені на бліжэйшым пагорку. Гэты трэці цуд атрымаў шырокую вядомасць, абраз быў прызнаны цудатворным і пачаў прывабліваць сюды да новай ужо мураванай царквы вялікую колькасць вернікаў. Храм стаў багатым пасля ахвяраванняў знакамітага канцлера Вялікага княства Літоўскага Льва Сапегі (1557—1633). Ён жа загадаў адліць для царквы ў Жыровіцах шматпудовы звон. Вакол храма быў заснаваны уніяцкі манастыр (1613), яго настаяцелем становіцца знакаміты фанатык Іасафат Кунцэвіч, праз дзесяць гадоў забіты віцяблянамі (1623). З сярэдзіны XVII ст. Жыровіцкі базылянскі манастыр — ажыўленае месца паломніцтва не толькі простых людзей, але таксама магнатаў і нават каралёў. У студзені 1644 г. тут са сваёй жонкай маліўся Уладзіслаў IV, а ў студзені 1651 г. простым пілігрымам прыходзіў кароль Ян Казімір. Высокія багамольцы адорваюць манастыр. А праз чатыры гады зноў здараецца пажар і сейм двойчы вызваляе яго землі ад дзяржаўных падаткаў тэрмінам на чатыры гады (у 1661 і 1667 гг.). Але хутка манастыр зноў можа прымаць каралёў, сюды прыязджаў Ян III з сынам Якавам (1688), а пазней і Аўгуст II. У XVIII ст. урачыста адсвяткавалі "каранацыю" цудатворнага жыровіцкага абраза (1730). На ўрачыстасці з'ехаліся ўсе уніяцкія мітрапаліты і біскупы: кіеўскі мітрапаліт Анастасій Шэптыцкі, біскупы Уладзіміра-Валынскага і Пінска. Захавалася дэталёвае апісанне гэтых небывалых урычыстасцяў. З Рыма былі прысланыя дзве багатыя кароны, якія блаславіў сам папа Бенедыкт XIII. Удава Радзівіла Ганна Сангушка ўпрыгожыла кароны каштоўнымі каменнямі. З тых часоў абраз

Жыровіцкай Божай Маці набыў папулярнасць, амаль роўную знакамітаму абразу Божай Маці з Чанстахова. Апошнія каралеўскія шанаванні прыносіў манастыр Станіславу Аўгусту ў 1784 г. Пасля ліквідацыі уніі (1839) Жыровіцкі манастыр страціў сваю былую веліч. Спачатку царскі ўрад звязаў з ім свае "русіфікатарскія памкненні" і ён стаў цэнтрам кіравання праваслаўнай літоўскай епархіі з кафедрай епіскапа, але пасля 1845 г. манастыр быў аб'яўлены другакласным і заняпаў. Да 1908 г. ён атрымліваў ад казны дапамогу ў 2835 руб. штогод, кіраваўся архімандрытамі і меў усяго... 7(!) манахаў, 15 паслушнікаў і 27 хлопчыкаў-вучняў манастырскай школы.

Мы на плошчы каля будынкаў манастыра. Перад намі мураваныя двухпавярховыя будынкі і побач — вялікі манастырскі сабор Успення Божай Маці са званіцай, аднесенай на другі бок плошчы. Храм грандыёзны, але мае на першы погляд нейкі дзіўны, "нелагічны" фасад... Помнік быў закладзены пад час заснавання манастыра ў 1613 г., і алтар апынуўся якраз на тым месцы, дзе, паводле падання, расла груша, на якой быў знойдзены абраз. Будавалі сабор доўга, па некаторых даных



Жыровічы. Манастыр



Жыровічы. Званіца манастыра

пабудову закончылі толькі ў 1670 г., па другіх — у 1650 г. Сабор сапраўды вялікі: яго вышыня 40 м, даўжыня — 55 м. Яшчэ вышэй дзве яго вежы, відныя адусюль, але царскі ўрад у 1828 г. іх "абсёк" — адсюль і "нелагічнасць" фасада, аб якой мы толькі што гаварылі. Мы адчыняем веснічкі ў агароджы манастыра і заходзім у двор. Жыровіцкі манастыр — вялікі архітэктурны комплекс, у гэтым мы адразу пераконваемся, толькі ступіўшы ва ўнутраны двор. Будавалі яго з XVII ст. да 1828 г. У комплекс уваходзяць тры храмы: Успенскі сабор, Богаяўленская царква і царква Крыжаўзвіжання, жылы корпус, жыллё для прыезджых і г. д. Усходні бок храма, прылеглы да яго будынак семінарыі і жылы корпус з поўдня ствараюць унутраны двор; ззаду семінарыі — аднапавярховыя гаспадарчыя пабудовы ствараюць гаспадарчы двор. З поўдня да манастыра прымыкаюць сад і агароды, на іх працуюць манашкі.

У цэлым манастыр задуманы своеасабліва, даволі арыгінальна выкарыстаны рэльеф мясцовасці. Большая яго частка размешчана па пагорку, а Успенскі сабор унізе. Увайшоўшы ў манастырскі двор, пачынаеш патроху рухацца ўгору праз увесь комплекс да храма Крыжаўзвіжання, які размешчаны на пагорку. Ад Успенскага сабора вернік рухаецца да царквы Богаяўлення, якая пастаўлена на сярэдзіне пад'ёму (на месцы, дзе абраз у XV ст. з'явіўся другі раз, на першым месцы стаіць Успенскі сабор), ад гэтага храма ён ідзе далей да вяршыні, дзе дарога канчаецца царквой і крутым схілам, ”абрывам“. Царква Крыжаўзвіжання, якая стала на дарозе, паказвала, што тут скончыўся толькі зямны шлях, далей пачынаецца іншы — той, якому вучыць хрысціянская царква. Такой была ідэя, ”укладзеная“ ў манастыр пад час яго пабудовы.

**Успенскі сабор** уражвае сваёй грандыёзнасцю як звонку, так і ў сярэдзіне. Гэта трохнефавы аднаапсідны храм, яго вялікі купал падтрымліваюць слупы складанага сячэння. Побач з ім пры вялікай вышыні сабора чалавек здаецца пясчынкай. Як у многіх помніках XVII ст. эпохі барока, скляпенні багата ўпрыгожаныя арнаментам у выглядзе спалучэння геаметрычных ліній. Пры рэканструкцыі помніка ў 1828 г. ён атрымаў рысы, характэрныя для класіцызму: былі змененыя формы светлавога барабана ў купале, фасад забяспечылі двайнымі калонамі і пілястрамі, завяршылі яго трохвугольнымі франтонамі і г. д. Наведвальніка ўражвае вялікі трох'ярусны іканастас, дзе паміж абразамі ўюцца залатыя вінаградныя лозы, гірлянды, відныя галовы херувімаў, ракавіны. Гэтая цудоўная разьба па дрэву выкананая невядомым майстрам яшчэ ў XVIII ст. у эпоху барока. Тут вам пакажуць і знакаміты абраз Жыровіцкай Божай Маці, той самы, які, па паданню, некалі з'явіўся на грушы. Абраз арыгінальны — тонкая разьба па каменю датуецца, на думку спецыялістаў, XIV—XV стст. Ва ўсім іканастасе яна з'яўляецца галоўнай і як самая старажытная выклікае найвялікшую цікавасць. Да сярэдзіны XIX ст. у манастыры захоўвалася так званае Жыровіцкае Евангелле XV ст. (зараз у Навуковай бібліятэцы АН Літвы).

**Богаяўленская царква.** Ад сабора мы пачынаем павольна падымацца па той самай шырокай дарозе (цяпер яна, на жаль, пакрытая асфальтам), якая сімвалізуе ”зямное жыццё“. Справа ў густой лістоце дрэў бялеюць сцены



Жыровічы. Успенскі сабор (1613)



Жыровічы. Богаяўленская царква (1769)

царквы Богаяўлення. Храм будаваўся ў 1769 г. (па другіх звестках, на тры гады пазней) — у эпоху позняга барока. Ён бязвежавы, без унутраных апораў і перакрыты простым двухсхільным дахам з драўляным купалам. Яго ўзводзілі, як і ўсе папярэднія храмы, уніяты, і нам не даводзіцца здзіўляцца заходнееўрапейскаму выгляду помніка. Над фасадам царквы высіцца вялікі фігурны шчыт. Імкненне ўгору да крыжа на шчыце тут падкрэсліваецца пучкамі паўкалонак, самім шчытом, пластыкай яго бакавых валют (астатнія фасады сціплейшыя: простыя лапаткі, карнізы, простая аблямоўка вокнаў і г. д.).

**Царква Крыжаўзвіжання** — выдатная пабудова уніятаў у Жыровічах. Гэта храм-кальварыя, збудаваны таксама ў 1769 г., у тым жа стылі позняга барока. Ён заканчвае ўзыходжанне па ”дарозе зямнога жыцця“. Тут зямное жыццё заканчвалася і пачынаўся ”іншы шлях“. Знешні воблік такога важнага па царкоўнай ідэі храма быў, канешне, дасканала прадуманы, асабліва галоўны фасад, які сустракаў вернікаў на іх шляху. Фасад — тры выцягнутыя ўгору ярусы — служыў быццам працягам пройдзенага шляху, але па вертыкалі — да Бога. За першым ярусам, даволі масіўным, які ахоплівае два паверхі з двайнымі пілястрамі па баках увахода, ідзе другі, больш нізкі, звязаны з першым тыпова барочнымі валютамі. Трэці ярус прадстаўлены невялікай вежай-званіцай з фігурным барочным купалам. Царкоўныя дзверы расчыняліся і перад агаломшанымі вернікамі ўзнікаў увесь далейшы шлях, як бы мовіць, навідавоку: уся прастора для малітвы (кафалікон) занятая шырокай лесвіцай, якая вяла на верхні ярус да сімвала раю — алтара. Па гэтай лесвіцы ”на неба“ трэба было падымацца толькі на каленях! Ва уніяцкія часы ў кожную прыступку лесвіцы былі ўстаўленыя часткі мошчаў пад шклом і вернік па чарзе прыкладваўся да кожнай святыні. Уся гэтая ідэя натуралістычнай выявы жыццёвага шляху Хрыста чужая для праваслаўя і адлюстроўвае блізкасць уніятаў да каталіцызму. Малая прастора ў сярэдзіне храма шырока раскрывалася ў роспіс з выявай распяцця на Галгофе — так званы ілюзорны жывапіс, які стварае эфект вялікай прасторы.

**Семінарыя.** Яе корпус быў прыбудаваны да Успенскага сабора ў XVII—XVIII стст. Напачатку ён прызначаўся для школы уніятаў, а ў 1827 г. быў перароблены ў так званую Літоўскую семінарыю — буйны асяродак асветы



Жыровічы. Царква Крыжаўзвіжання (1769)

ў тыя суровыя часы мікалаеўскага прыгнёту. Першы яе рэктар — вядомы уніяцкі дзеяч Антоні Зубко пакінуў аб гэтай семінарыі вельмі цікавыя ўспаміны. Выкладчыкамі былі высокаадукаваныя прафесары, якія вызначаліся дэмакратызмам і, нягледзячы на вунію, прыхільнасцю да ўсяго "рускага". Сярод іх былі: паліглот пісьменнік П. Янкоўскі, фізік і матэматык Вронскі, апантаны аматар старажытнасцяў і археалогіі І. Гамаліцкі (пад яго ўплывам да старажытнасцяў Беларусі прыхінуўся А. Кіркор у Вільні) і інш. Усе выкладчыкі і прафесары складалі дружны і цесны калектыў аднадумцаў, які дабратворна ўплываў на вучняў, і ігнаравалі ганарлівае асяроддзе апалячаных мясцовых памешчыкаў, якія на іх, беларусаў, глядзелі звысоку. Ад базылянскага манастыра семінарыя атрымала вялікую, заснаваную ў XV ст. (!), бібліятэку і значны збор старажытных рукапісаў. Аб парадках у Жыровіцкай семінарыі сведчыць у сваіх успамінах той жа Зубко: "Мы не кіраваліся строгім выкананнем прыстойнасці. Кожны з нас апранаўся як хацеў, па-за службай праводзіў час па свайму жаданню. Аматары палявання — палявалі, а паколькі ў нас быў свой аркестр музыкі (...), то вечарамі бывалі ў нас і танцы (...). Пры такой свабодзе адносін не было і думкі выкарыстаць яе для нядобрага..." Аўтар гаворыць аб сіле "папоўска-народнага" (беларускага!) патрыятызму прафесараў семінарыі і іх намаганнях несці асвету да мясцовага насельніцтва. У 1895 г. семінарыю перавялі ў Вільню.

**Жылы корпус** злучаны з Успенскім саборам пераходам над брамай. Ён збудаваны ў сярэдзіне XVIII ст. у выглядзе выцягнутага двухпавярховага аб'ёму, з цыліндрычнымі скляпеннямі і распалубкамі над доўгім калідорам і крыжовымі скляпеннямі ў памяшканнях. Тут былі келлі, а таксама і рэзідэнцыя епіскапа. Архітэктура будынка вельмі спрошчаная.

**Гаспадарчыя пабудовы** манастыра ўзведзеныя ў XVIII—XIX стст. і агароджваюць унутраны двор манастыра, пачынаючы ад ўсходняга корпуса семінарыі. Гэта аднапавярховыя будынкі, фасады якіх падзяляюцца "кароткімі і масіўнымі пілястрамі". У архітэктурным вырашэнні гаспадарчых пабудоваў відныя "больш познія матывы архітэктуры эпохі класіцызму" (сухары, франтончыкі). Аднак архітэктурная аснова гэтых пабудоваў сведчыць аб першапачатковай барочнай трактоўцы будынка.

**Ю р‘ е ў с к а я  ц а р к в а.** Нам засталося агледзець у Жыровічах царкву св. Юры — помнік драўлянай архітэктуры канца XVIII ст., размешчаны за межамі манастыра на могілках. Гэта суровы выцягнуты ў плане храм з шырокай пяціграннай апсідай, размешчанай з заходняга (!) боку помніка. Галоўны фасад завяршаецца трохвугольным франтонам з чатырохгранным барабанам і фігурным купалам тыпова барочнага вобліку. Сярод магільных плітаў на пахаваннях сустракаюцца помнікі сярэдзіны XIX ст., часам з цікавымі старажытнымі выразамі (”божы дваранін“, напрыклад).

**А б а р о н ч а я  ц а р к в а  ў  С ы н к а в і ч а х.** Каб паглядзець знакамітую сынкавіцкую царкву, трэба ехаць ад Слоніма аўтобусам у бок Зэльвы — Ваўкавыска. 10—12 км добрага асфальту па мяккіх пад‘ёмах і схілах сярод кустоў, пералескаў, палёў. У прасветах паміж прыдарожнымі дрэвамі павольна і плаўна перакочваюцца хвалі жыта. Яшчэ два кіламетры пехам праз палі і перад намі каля яблыневага саду ў атачэнні ліпаў узнікае дзівосны аазіс старажытнасці: шэдэўр архітэктуры XV ст.— чырвоная цагляная царква, абстаўленая вежамі, са шчытом, упрыгожаным ”дыванам“ невялікіх глухіх нішаў. ”Як ты тут апынулася? — хочацца нам спытаць. — Як



Сынкавічы. Царква (XV ст.)



Сынкавічы. Царква. Паўднёвы фасад



Сынкавічы. Царква. Галоўны фасад

трапіла ў гэтае чужое табе жыццё? Чаму стаіш адна сярод пустынных палёў? Хто і калі цябе будаваў і што акружала цябе тады?“ Але храм сурова маўчыць і мы самі павінны шукаць адказы...

Аб сынкавіцкай царкве напісана шмат, яна фігуруе ў большасці падручнікаў па гісторыі архітэктуры. Чытаючы аб ёй, разглядаючы яе фотаздымкі, каюся, захапленні адносна яе здаваліся мне моцна перабольшанымі і надуманымі... Але вось я перад ёй і ўсё адступіла! Прэч прывычныя ўяўленні, прэч прадузятасці! Мы на заходнебеларускай зямлі ў еўрапейскай правінцыі... У тую суровую ўвогуле эпоху ствараліся сапраўдныя цуды прыгажосці. Беларус не ваяўнічы па сваёй натуры, яму бліжэй ідэал прыгажосці, чым воінскай адвагі. І вось перад намі ”царква-крэпасць“, дзе галоўнае — прыгажосць. Тут усё ў кантрастах. Высокі востравугольны дах, але чатыры кутнія вежы з байніцамі ніжэйшыя за яго і гэта паніжае ”ваенны эфект“. Вежы зробленыя ”па ўсіх правілах“ — без упрыгожанняў, з байніцамі і нават машыкулямі. Але гэтыя машыкулі паўтораныя зверху сцяны дэкаратыўным поясам, і гэта таксама паніжае ”ваенны эфект“. І нарэшце, галоўны фасад — самае значнае месца ў гэтым помніку. Тут таксама ўсё пабудавана на кантрасце. Масіўнай і гладкай сцяне асноўнай часткі будынка супраць-



Сынкавічы. Панскі дом (XIX ст.)

пастаўлены высокі трохвугольны шчыт з безліччу разнастайных дэкаратыўных нішаў.

Адзначаючы вялікую значнасць сынкавіцкага помніка, спецыялісты па позняй готыцы падкрэсліваюць яго выключна зграбную гарманічную кампазіцыю, дзе сплятаюцца разнастайныя элементы готыкі (скляпенні, формы фасадаў — трохвугольны шчыт з нішамі, стрэльчатыя вокны, васьмігранныя вежы) і рэнесансу ("псеўдараманскія" падвесныя аркі шчыта, круглыя вежы, якія фланкіруюць апсідальны фасад, аркатура апсідаў і г. д.). Зноў і зноў хаджу я вакол царквы, зноў і зноў углядаюся ў яе, стараюся спасцігнуць "дух" пабудовы... Адзінока стаіць яна ў атачэнні ліпаў каля бярозавай алеі, якая нікуды не вядзе. Аазіс старажытнасці! Без пабелкі, ружовая на фоне зяляніны царква выглядае дзівосна. Вежы па чатырох кутах здаюцца цацачнымі... Гайдаецца перакладзіна пакошанага драўлянага крыжа. Навокал — нікога. Толькі агромністы яблыневы сад мясцовага саўгаса, воддаль, з другога боку, — доўгія саўгасныя пабудовы... Як выразна ўсё гэта гаворыць аб іншых людскіх памкненнях, жаданнях, намерах!.. Вецер наганяе хмары і тады храм-замак сярод бурай прадвосеньскай лістоты цямнее, зліваецца з ёю і, здаецца, вось-вось прывід знікне... Але разам з сонцам ён зноўку пануе над прыродай і зноўку ён дзівосны! Нам пара назад.



Сынкавічы. Сядзібны стаў

Па дарозе не забудзем агледзець невялікую вёску Сынкавічы, побач з якой яшчэ захаваліся рэшткі дробнай беларускай сядзібы з невялікім домам, быццам з аповесці Элізы Ажэшкі, і ставам, па якому цяпер замест лебедзяў горда плаваюць па сваіх адлюстраваннях вясковыя гусі...

**Ружаны, Косава.** Ад Слоніма на Ружаны аўтобус ідзе амаль суцэльнай вельмі маляўнічай алеяй старога тракту. Каля Міжэвічаў — прыпынак, засталося паўдарогі, і тут адгаліноўваецца шлях на Дзевяткавічы (дзе таксама ёсць рэшткі цікавых пабудоваў). Хутка пачынае мільгаць невялікімі дамкамі гарадок Ружаны. Нечакана побач з белым касцёлам аўтобус уязджае на рынaчную плошчу, так характэрную для ўсіх заходнебеларускіх мястэчак. Руіны палаца, якія мы невыразна бачылі яшчэ перад уездам у горад, цяпер яскрава вымалёўваюцца на пагорку каля сажалкі. Але вось мы праязджаем масток праз невялікую рачулку і, крута развярнуўшыся, спыняемся каля аўтастанцыі. Адсюль да палаца Сапегаў — рукой падаць!

У Ружанах мы знаёмімся з другім пасля Радзівілаў беларускім магнацкім родам (другім па знакамітасці, з XVII ст.— княскім), прадстаўнікі якога займалі важнейшыя пасты ў дзяржаве. Першы Сапега — Сымон быў пісарам вялікага князя Казіміра (1447—1492). Яго сын Іван

Сапега (1450—1517) крута пайшоў угару, быў канцлерам вялікай княгіні Алены Іванаўны — дачкі маскоўскага князя Івана III, аддадзенай замуж за вялікага літоўскага князя Аляксандра. Сын Івана Леў (1557—1633) — адзін з самых знакамітых Сапегаў у рэшце рэшт заняў высокую пасаду вялікага гетмана і ў Смутныя часы падтрымліваў Ілжэдзмітрыя I, які заняў маскоўскі стол. Уладанні Сапегаў былі вельмі вялікія.

Ружаны — адна з самых галоўных вотчын гэтых магнатаў. Яшчэ Леў Сапега заснаваў тут касцёл і палац (верагодна, драўляны). Яго нашчадак Казімір Сапега пачаў пабудову на пагорку над горадам шыкоўнага мураванага палаца (XVII ст.). Будынак узводзіўся вельмі доўга: пачаты ў эпоху барока, быў закончаны толькі ў эпоху класіцызму (1788) і ў сувязі з гэтым давялося яго па-новаму адбудоўваць па праекту прыдворнага архітэктара Сапегаў Яна Бэккера. У выніку атрымаўся выдатны комплекс будынкаў, цудоўна ўвязаны з навакольным ландшафтам. Імпазантны ўжо ўезд: грандыёзная брамная, тыпова барочная арка, змешчаная паміж двухпавярховымі флігелямі. Манументальнасць уезда падкрэсліваецца рустам асновы арак. Драбленне плоскасці аркі на другім ярусе, упрыгожванне яе разным картушам і гірляндамі (мораны дуб) хавае яе цяжар. Трэці ярус падобных арак па традыцыі меў які-небудзь надпіс — павучальную сентэнцыю, а часам проста герб уладальнікаў (як у Ружанах).

За ўездам адкрываўся вялікі курданёр, узвышаўся манументальны палац, на жаль, моцна разбураны ў першую сусветную вайну. Ён будаваўся, як ужо казалі, у эпоху барока і эпоху класіцызму, і абодва стылі знайшлі ў ім свой адбітак. Барочная архітэктура, мы ведаем, патрабавала прасторавай кампазіцыі, шырыні ў выкарыстанні формы. Класіцызм імкнуўся да выразнай, строгай формы. Будынак палаца эфектна пастаўлены насупраць увахода, дзве паўцыркульныя ў плане аркады са спаранымі калонамі тасканскага ордэна злучаюць будынак з бакавымі двухпавярховымі карпусамі (захаваўся адзін). Сярэдняя частка палаца павышаная на паўпаверх і размешчана перпендыкулярна да астатняй часткі будынка па цэнтральнай лініі ансамбля (якая праходзіць праз уезд). Фасад цэнтральнай часткі ўпрыгожаны чатырма здвоенымі калонамі і пілястрамі па кутах на высокіх пастаментах. Вынесеныя спараныя калоны — характэрная



Ружаны. Уезд у сядзібу (1788)



Ружаны. Палац (1788)

рыса барока. Галоўны ўваход у палац у адрозненне ад галоўнага ўезда камерны, але і ён падкрэслены калонамі, да яго вядуць дзве паўцыркульныя каланады, аб якіх мы казалі. Звяртаюць на сябе ўвагу дэталі ўпрыгажэння палаца і ўсяго ансамбля — багатае абрамленне вокнаў з сандрыкамі над імі. ”Выдатнае выкананне скульптурных дэталяў паказвае на высокае майстэрства прыдворнага архітэктара Сапегаў“ (У. А. Чантурыя). Як можна зразумець па захаваных частках, у першапачатковым выглядзе палац быў узведзены на шматлікіх скляпенчатых сутарэннях папярэдняга палаца XVI ст., прызначаных, відавочна, для захоўвання скарбаў уладальнікаў палаца. Сутарэнні гэтыя ўпамінаюцца ў дакументах яшчэ ў 1655 г. Пасля перабудовы 1788 г. вестыбюль і парадная зала знаходзіліся ў цэнтральнай, павышанай частцы будынка. Зала была размешчана ў бельэтажы, з вестыбюля да яе вялі дзве шыкоўныя лесвіцы, якія пачыналіся па баках ад уваходa. Зала была двухсветлавой, з яе вокнаў відны маляўнічы пейзаж: вялікі парк, сажалка, далей дамы, крытыя чырвонай дахоўкай, і тры храмы сярод іх. Хто ж будаваў палац Сапегаў (дакладней, хто пачынаў будаваць)? Хто праектаваў гэты цудоўны ляпны дэкор — карнізы, русты, мадульёны, кранштэйны, сандрыкі, увесь гэты фрэскавы роспіс інтэр‘ераў, уведзены ў моду італьянцамі эпохі

Адраджэння? Гісторыкі архітэктуры пішуць, што ў той час, калі Сапегі пачалі будаваць свой палац, у Рэчы Паспалітай працаваў вядомы ў той час архітэктар фларэнціец Санці Гуччы. Верагодна, што і ружанскі палац праектаваў гэты выдатны майстра. У першай палове XVIII ст. Рэччу Паспалітай кіравалі каралі саксонскай дынастыі (Аўгуст II і Аўгуст III), і вельмі можа быць, што ляпны дэкор на паўночным фасадзе (пастаральныя і іншыя матывы ў стылі ракако) створаны нейкім з майстроў знакамітай саксонскай школы пачатку XVIII ст., можа быць, нават тым, хто будаваў дрэздэнскі Цвінгер ці гродзенскі Новы замак. У канцы XVIII ст. ружанскі палац будаваў прыдворны архітэктар Сапегаў, як мяркуюць, саксонец Я. С. Бэккер.

Парк у Ружанах захаваўся дрэнна, але, мяркуючы па тэрасах, што дайшлі да нас, гэта быў адзін з найрэдкіх на Беларусі паркаў — у стылі італьянскага Адраджэння, да якога былі, відавочна, прыхільныя першыя ўладальнікі палаца.

Пяройдзем на плошчу рынку. Тут яшчэ Леў Сапега збудаваў першы фарны касцёл. Яго нашчадак Казімір Леў Сапега ў 1650 г. заснаваў пры ім шпіталь на 12 чалавек. Касцёл Св. Тройцы, які стаіць і зараз, шмат разоў перабудоўваўся (1615 г. — XVIII ст.). Гэта аднанефавы, аднавежавы храм, збудаваны з такім разлікам, каб яго было відаць здалёк. На яго зарыентаваныя многія вуліцы горада.

На рыначнай плошчы размяшчаўся і базылянскі манастыр, узведзены ў XVII—XVIII стст. Петрапаўлаўская царква гэтага манастыра, пабудаваная ў 1675 г. і перарobленая ў XVIII ст., таксама мае шматлікія рысы барока. Своеасаблівая яе вузкая высокая званіца. Масіўны двухпавярховы будынак плябані, які выходзіць на плошчу, таксама належыць да манастырскіх пабудоў XVIII ст. Яго раскрэпаваны ў сярэдзіне фасад і шматлікія плоскія і шырокія пілястры надзвычай характэрныя для эпохі барока.

Вялікія князі і каралі неаднаразова наведвалі Ружаны. У Ружанскім палацы адбываліся нябачныя па раскошы прыёмы манархаў, праходзілі важныя нарады. Пры Яне Сапезе—"ваяводзе падляскім" горад наведаў кароль Жыгімонт I і атрымаў тут належны манарху прыём.

Непадалёк ад Ружанаў знаходзіцца яшчэ адзін старажытны маёнтак — Косава.



Ружаны. Касцёл Св. Тройцы (1615 г. — XVIII ст.)



Ружаны. Базылянскі манастыр (XVII—XVIII стст.)

**К о с а в а** — старажытнае паселішча. У 1494 г. спецыяльным прывілеем вялікага князя Аляксандра яно было дараванае літоўскаму маршалку Яну Літавору Храптовічу. У 1570—1577 гг. Косавам валодалі Сангушкі, а ў 1611 г. яно перайшло да Сапегаў. Пазней тут гаспадарыла Ізабэла Чартарыйская...

Мы едзем па шашы ў бок Івацэвічаў і ўжо здалёк бачым над лесам косаўскі замак. Шызы, ён нечакана вырываецца сваімі фігурнымі вежамі з-за мора маладога, таксама шызага сасняку. Дарога ўецца вакол лесу, а замак ганарліва паварочваецца да нас то адным, то другім бокам. Вось ужо відныя зубцы на вежах, стрэльчатыя вокны. Але раптам будынак замка знік гэтак жа нечакана, як і з‘явіўся, — шаша паварочвае ўправа і аўтобус спыняецца каля надпісу ”Косава“.

Мы перасякаем шашу, ідзём угору, у той бок, дзе толькі што віднеўся замак, праходзім малады сасняк і раптам трапляем да самай падэшвы замкавай гары. Але ж гэта зусім не замак! Ён толькі здалёк так выглядае — гэта шыкоўны палац эпохі рамантызму, дэкараваны пад сярэднявечнае абарончае збудаванне. Выцягнуты план будынка, анфіладнае размяшчэнне пакояў — як усё гэта нагадвае пабудовы класіцызму! Косаўскі палац збудаваны ў першай палове XIX ст., калі ў рускай, беларускай і ўкраінскай архітэктуры сталі моднымі рысы готыкі. Гэта чыстае перайманне не



Косава. Палац (першая палова XIX ст.)



Косава. Фрагмент палаца

атрымала шырокага распаўсюджання на Беларусі і прадстаўлена лічанымі пабудовамі. Захавалася акварэль мастака Н. Орды першай паловы — сярэдзіны XIX ст.: аднапавярховы драўляны панскі дом з тыповым для гэтых мясцінаў мансардным дахам і чатырохкалонным порцікам, каля якога стаіць група людзей у адзенні сярэдзіны XIX ст. Да дома пад'язджае вазок, запрэжаны парай белых моцных коней. Усё гэта на фоне косаўскага замка. Гэта сядзіба Мерачоўшчына, размешчаная каля самага палаца ў Косаве. Належала яна дробнапамеснаму шляхціцу Касцюшку. 4 лютага 1746 г. тут у Людзвіга Касцюшкі нарадзіўся сын Тадэвуш, што і было запісана ў кнігах косаўскага касцёла 12 лютага 1746 г. Пазней гэты хлопчык стаў нацыянальным героем Злучаных Штатаў Амерыкі і знакамітым кіраўніком паўстання 1794 г., якое мела мэтай захаванне дзяржаўнай незалежнасці Рэчы Паспалітай. Тадэвуш Касцюшка не паспеў пабачыць "замка" ў Косаве — ён памёр у Швейцарыі ў 1817 г., замак тады яшчэ не быў збудаваны.



# 6 частка

# Нясвіж і Мір

Наш апошні маршрут ляжыць на ўсход, дзе каля вярхоўяў Нёмана знаходзяцца старажытныя гарады — уладанні знакамітага магнацкага роду Радзівілаў — Нясвіж і Мір.

**З гісторыі Нясвіжа.** Нясвіж — адна з найпрыгажэйшых мясцін на Беларусі; яго пачатак выходзіць з глыбокай даўніны. У 1492 г. вялікі князь Аляксандр перадаў Нясвіж Яну Кішку з Цэханоўца і Кішкі збудавалі тут першы касцёл. Да гэтага ў паселішчы ўжо была драўляная царква Раства Багародзіцы. Дачка Яна Кішкі выйшла замуж за Радзівіла і з 1513 па 1939 г. — 426 гадоў — нясвіжскае ўладанне належала гэтаму магнацкаму роду. Радзівілы былі інтэлектуаламі, высокаадукаванымі людзьмі, і Нясвіж стаў асяродкам асветы. Мікалай Радзівіл Чорны быў у сваяцтве з каралём Жыгі-

монтам Аўгустам (1520—1572) і змог стаць віленскім ваяводам, а затым маршалкам і канцлерам Вялікага княства Літоўскага. Гэта быў час, калі мацнеўшы феадальны клас імкнуўся абмежаваць прывілеяванае становішча каталіцкай царквы і скараціць яе зямельныя ўладанні. Гэтай барацьбе спрыяў пратэстантызм, які ў форме кальвінізму распаўсюдзіўся сярод магнацкіх родаў Беларусі. Радзівіл Чорны перайшоў у кальвінізм у 1559 г., за ім пайшлі Кішкі, Сапегі, Пузыні, Валовічы. Чалавек сярэднявечча — Чорны дзейнічаў не перакананнямі, а прымусам: адбіраў у каталікоў касцёлы, у праваслаўных цэрквы і перадаваў іх кальвіністам. Але ў адрозненне ад каталікоў прапаведаванне пратэстантызму вялося па-беларуску. У Нясвіжы пачала працаваць друкарня, дзе вядомы дзеяч беларускага пратэстантызму Сымон Будны (памёр у 1593 г.) выдаў свой "Катэхізіс" з выкладаннем асноваў пратэстанцкага веравызнання (1562). Асновы гэтыя поспеху не мелі, але іх беларуская мова была крайне важнай — стваралася літаратурная беларуская мова.

Пасля смерці Радзівіла Чорнага (1565) яго сыны ўжо не падтрымлівалі пратэстантызму. У другой палове XVI ст. Нясвіж уступіў у пару свайго росквіту, якая цесна звязана з дзейнасцю сына Чорнага — Мікалая Радзівіла Сіроткі (1549—1616). Мікалай Радзівіл вучыўся ў Германіі, Італіі, Аўстрыі і Францыі, ён быў адукаваным чалавекам, ствараў літаратурныя творы і апантана любіў падарожнічаць. Апісаннямі яго вандраванняў па Егіпце, Палесціне і іншых краінах Сярэдняга Усходу зачытваліся аж ад канца XVIII ст. не толькі ў Рэчы Паспалітай, але і ў іншых краінах Еўропы. У сваіх уладаннях Радзівіл Сіротка намерваўся стварыць вялікі музей, для якога купляў у падарожжах розныя гістарычныя і мастацкія каштоўнасці (у прыватнасці, нават егіпецкую мумію). Ён вярнуўся да каталіцызму, пратэстантаў адхіліў, а друкарню перадаў езуіцкай калегіі. Пратэстанцкія кнігі былі публічна спаленыя. У 1583 г. князь Мікалай збудаваў у Нясвіжы цудоўны замак, а ў 1593 г. не менш прыгожы храм, дзе належала захоўваць астанкі Радзівілаў. Жадаючы як мага ўмацаваць Нясвіж, ён дамогся ў караля Стэфана Баторыя роўнасці ў правах нясвіжскіх мяшчан з жыхарамі дзяржаўных гарадоў, прызначыў тут штотыднёвы торг і два кірмашы ў год (на Тройцу і напярэдадні Раства). Князь выпісаў з-за мяжы выдатных рамеснікаў і купцоў і здабыў для Нясвіжа герб. Жонка князя Мікалая Яўфімія

Вішнявецкая ў 1590 г. фундавала тут кляштар бенедыкцінак (дзе пахаваныя дочкі Сіроткі), а сам ён — кляштар бернардзінцаў (1598). На месцы пазнейшага загараднага парку Альба князь збудаваў летнюю рэзідэнцыю — Эрэміторыум. Радзівіл Сіротка атрымаў ад Стэфана Баторыя прызнанне трох яго ўладанняў маяратамі — Нясвіжскага, Альцкага і Клецкага. У выпадку знікнення якой-небудзь лініі яго нашчадкаў гэтыя ўладанні не маглі стаць вымарачнымі, а зліваліся ў адно. Гэта ў значнай меры спрыяла захаванню нясвіжскіх уладанняў. Напрыклад, у 1614 г. Альцкі маярат уліўся ў Нясвіжскі.

Пасля Сіроткі Нясвіж перажыў шмат розных падзей, на яго неаднаразова нападалі ворагі. Так, 14 жніўня 1706 г. шведы зруйнавалі горад, затым замак, якія Радзівілы аднавілі толькі праз 20 гадоў. Міхал Радзівіл адбудаваў не толькі замак, але кляштары і касцёл, заснаваў фабрыку, вялікую бібліятэку, карцінную галерэю, разнастайныя калекцыі. Нясвіж зноў стаў блізкі да росквіту. Аднак сярод Радзівілаў былі не толькі высокія інтэлектуалы. Сын Міхала, вядомы князь Кароль ”Пане Каханку“ (празваны так за свой любімы выраз), быў неверагодным самадурам і купаўся ў раскошы. Асветніцкая дзейнасць Радзівілаў спынілася. У XIX ст. Дамінік Радзівіл змагаўся з Расіяй на баку Напалеона і пасля адступлення французаў на Нясвіж быў наложаны секвестр, каштоўную бібліятэку і шмат што яшчэ вывезлі ў Пецярбург. Бяздзетны Дамінік памёр ад ран у 1813 г. У 1814 г. Аляксандр I зняў секвестр, Нясвіжскі маярат зліўся з Клецкім і перайшоў да прускіх Радзівілаў. Па пагадненню Антона і Лявона Радзівілаў у 1874 г., г. зн. праз 300 гадоў, спадчына Мікалая Сіроткі прыняла ранейшы выгляд: яна злілася ў агромністы маярат з цэнтрам у Нясвіжы. Тут было 7600 валок зямлі, 8 мястэчак, каля 128 фальваркаў!

**Замкавы ансамбль у Нясвіжы.** Нясвіж зараз маленькі гарадок з мала развітой прамысловасцю, з вялікай колькасцю прыватных дамоў па ўскраінах, а ў цэнтры ўсё дыхае гісторыяй. Тут традыцыйная прамавугольная плошча рынку з ратушай, з невялікімі дамамі і кляштарамі па яе баках, з рэшткамі цудоўнага замка Радзівілаў на азёрах. Нясвіжскі ансамбль пачаў стварацца ў 1533 г. пры яго першым уладальніку Яну Радзівілу. Тады былі праведзеныя каласальныя земляныя работы і збудаваны драўляны замак. Сын Яна — Мікалай Радзівіл Чорны замяніў яго мураваным



Нясвіж. Замак. Выгляд ад Слуцкай брамы

(1551), у 1583—1585 гг. ансамбль быў адбудаваны па-новаму (па другіх крыніцах — абноўлены) Мікалаем Радзівілам Сіроткай. Зіму 1580—1581 гг. Сіротка правёў у Італіі, бачыў многія вядомыя тады італьянскія непрыступныя замкі, збудаваныя паводле апошняга слова высокай італьянскай фартыфікацыі, і вырашыў, відавочна, запрасіць вядомага італьянскага архітэктара-езуіта з Кома Яна Марыю Бернардоні (1542—1605). У выніку ў Нясвіжы быў збудаваны шыкоўнейшы замак-палац, які адпавядаў усім патрабаванням тагачаснай заходнееўрапейскай навукі. Шматлікія абнаўленні і дабудовы замка — прычына таго, што зараз ён не выглядае цэласным аб'ёмам, хоць уезд, вежа, цэнтральны корпус і галоўны ўваход знаходзяцца на адной восі і першаснае імкненне архітэктара да сіметрыі захавалася.

Замак аддзелены ад горада маляўнічымі штучнымі вадаёмамі на загачанай Ушы. Прайсці да яго можна па дамбах. Каля высокай замкавай вежы пачынаецца алея, якая і вядзе па дамбе да брамы-вежы. Некалі тут быў драўляны мост, які можна было лёгка знішчыць пры наступленні ворага. Мост падводзіў да рова з пад'ёмным мостам (зараз заменены мураваным), далей шлях ляжыць праз брамную вежу. Такім чынам, сістэма ўмацаванняў нам зразумелая: замак акружаны вадой з усіх бакоў. Далей ідуць земляныя валы, якія



Нясвіж. Брамная вежа



Нясвіж. Палац. Галоўны фасад

агароджваюць прамавугольную прастору (170×120 мм) з магутнымі бастыёнамі па кутах. Калі вораг захопліваў пад'ёмны мост і знешнія вароты, то трапляў у тунель пад праязной вежай і са спецыяльных адтулін на галовы нападаючых падалі кулі абаронцаў...

Але вось мы мінулі ўнутраныя вароты. Перад намі шматвугольны двор, кветнікі, дэкаратыўныя елкі... Наперадзе палац, які ўражвае колькасцю ляпных упрыгожванняў. Захавалася цудоўная гравюра Т. Макоўскага канца XVI—XVII ст., якая паказвае замак як бы з птушынага палёту. У тыя часы ён быў акружаны высокімі землянымі валамі з бастыёнамі па кутах, на якіх узвышаліся абарончыя вежы. Перад валамі шырокія равы, запоўненыя вадой. Са знешняга боку рова ішла шырокая дарога, абароненая невысокім земляным насыпам — гласісам, у паўкруглых выступах якога (як і за самім насыпам) пад час аблогі хаваліся стралкі і рыхтаваліся вылазкі. Зараз мяркуюць (М. А. Ткачоў), што замак быў збудаваны не ў "стараітальянскай" сістэме фартыфікацыі і тым больш не ў "старафранцузскай" (як лічылася раней), а ў "новаітальянскай", аб чым сведчаць пляцоўкі, абароненыя гласісам (упершыню ўведзеныя ў Італіі ў 1567 г.), і некаторыя іншыя рысы. "Нясвіжскі замак,— піша М. А. Ткачоў,— у свой час быў адным з самых магутных і непрыступных на Беларусі (...) Гэта дазволіла яму паспяхова вытрымліваць працяглыя аблогі рускіх войскаў у 1654 і 1659 гг. Толькі ў 1706 г. войскі шведскага караля Карла XII пасля доўгай аблогі і штурму ўзялі замак і ўзарвалі магутныя бастыёны".

З гравюры Т. Макоўскага мы даведваемся, што ўнутры валоў Сіротка ўзвёў тры будынкі. Насупраць брамнай вежы быў размешчаны цэнтральны корпус-палац, дзе жыў сам уладальнік замка. Тады гэта быў трохпавярховы будынак, фланкіраваны па кутах невялікімі васьміграннымі вежамі. Справа ад уезда стаяла трохпавярховая казарма з дазорнай вежай, злева — двухпавярховы гаспадарчы корпус. Пазней усе тры корпусы былі злучаныя і стварылі парадны двор (80×50 м), на якім мы цяпер і стаім.

Пасля шведскага разбурэння замак аднаўляўся ў новым абліччы і больш за ўсё гэта відаць на палацы. Ваеннае значэнне замка адышло на другі план, у 1726 г. палац аднаўлялі ў стылі барока (архітэктар К. Ждановіч). У 1748—1752 гг. працу прадоўжыў М. Педэцці, у 1775—1778 гг. — М. Фларыяновіч, у 1778—1779 гг. — К. Сампані і А. Лоцці (у 1783 г. апошні



Нясвіж. Палац. Задні фасад

распрацаваў яшчэ праект галерэі) і інш. На жаль, шматразовыя перабудовы палаца не даюць магчымасці разглядаць яго як адно цэлае. Фасад цэнтральнай часткі, які мы зараз бачым, створаны ў эпоху позняга барока. Пры перабудове палаца ён перш за ўсё атрымаў чацвёрты паверх цэнтральнага рызаліту. Фасад палаца, як фасады ўсіх іншых будынкаў комплексу, звернуты ўсярэдзіну двара; ён упрыгожаны пілястрамі вялікага ордэра, з якім тонка кантрастуе рэльефны штукавы арнамент. На ніжнім паверсе гэтага арнаменту няма, чым вышэй, тым яго становіцца болей. Асабліва насычаны ляпнінай франтон: тут і гарматы на колах, і воіны са шчытамі, і складаныя віньеткі, і, нарэшце, герб Радзівілаў. Фасад уражвае і выдатна знойдзеным малюнкам вокнаў, іх штукавай абрамоўкай, малюнкам пераплётаў. Сапраўдны мастак эпохі барока архітэктар быццам баяўся пакінуць дзе-небудзь роўную сцяну, там, дзе гладкія ўчасткі ўсё-такі заставаліся, ён спяшаўся спусціць пад акном двайную гірлянду ляпніны (высокія вокны трэцяга паверха) або ўвесці ”фальшывыя вокны“-нішы, якія адразу ж звязваў з сапраўднымі ляпнымі віньеткамі па вертыкалі. Звернем, нарэшце, увагу на зламанасць усіх плоскасцяў фасада, ад гэтага фасад робіць уражанне лёгкага і грацыёзнага. Усюды мы адчуваем руку выдатнага майстра.

Інтэр'ер палаца таксама цікавы, хоць і захаваўся значна горш. Палац складаўся з 12 вялікіх залаў, кожная з якіх мела сваю назву і ўражвала багаццем убранства. Гэта былі: Каралеўская, Мармуровая, Гетманская, Залатая, Мазаікавая, Габеленавая і інш. Упрыгожваючы ўнутраныя памяшканні, Радзівілы XVIII ст. не ведалі межаў. Кароль Радзівіл (Пане Каханку), напрыклад, загадаў абклеіць гасцёўню мядзведжымі шкурамі, падлогу выслаць натуральным зялёным дзірваном і паставіць на ёй кадкі з дзівоснымі трапічнымі раслінамі. У сталоўцы ў яго стаялі сталы і крэслы, упрыгожаныя слановай косцю, а на абрусах блішчэлі прыборы толькі з чыстага золата з родавымі гербамі і каштоўнымі каменнямі ў выглядзе мазаікі. У спальні княскі ложак быў абцягнуты шкурамі буйвалаў і аленяў...

Палац адначасова быў і музеем з творамі мастацтва і проста рэдкасцямі. Тут быў багаты арсенал з трыццаццю наборамі рыцарскіх даспехаў, вялікай калькасцю паляўнічай зброі. Уражвала багаццем сховішча старажытнасцяў, нумізматычныя калекцыі, каласальны шматвекавы архіў Радзівілаў, бібліятэка з 20 тыс. тамоў, часта найрэдкіх выданняў на самых розных мовах і, у прыватнасці, на беларускай, нарэшце, знакамітая партрэтная галерэя Мікалая Сіроткі з выявамі не толькі ўсіх прадстаўнікоў роду з іх сем'ямі, але і ўсіх каралёў, усіх буйнейшых дзеячаў дзяржавы і нават рускага цара Івана IV (яму неяк прапаноўвалася карона Рэчы Паспалітай). Такім быў цудоўны палац Радзівілаў у Нясвіжы.

Астатнія два замкавыя будынкі ў XVIII ст. моцна разрасліся і злучыліся з палацам і брамнай вежай (апошняя была цалкам дабудаваная ў XVIII ст.).

Сумны лёс чакаў замак у XIX ст. пры прускіх Радзівілах. Чыноўнік з Вільні, які быў у палацы ў 1864 г., паведамляе, што "ўсе прадметы раскошы: мармур, бронза, дарагая разная мэбля, мастацкія творы скульптуры і жывапісу — раскрадзеныя, а частка вывезеная з замка ўладальнікамі. У пустых залах з пакарobленымі паркетамі і выбітымі вокнамі страшна вые вецер". З тысячы палотнаў у замку засталося каля 400. Справы былі трохі лепшымі, калі замак наведаў К. К. Случэўскі ў 1888 г. пасля аб'яднання ўладанняў Радзівілаў (1874). Замак стаў канторай, з якой кіравалі маёнткамі Радзівілаў. Усё, што заставалася ў замку да 1939 г., было вартае жалю — замак быў разрабаваны ў часы першай сусветнай вайны, астатняе расцягнулі ў апошнюю вайну.

Зараз замак па магчымасці адрамантаваны. З 1945 г. у ім размешчаны санаторый "Нясвіж".

Да палаца прымыкае знакаміты Нясвіжскі парк. Ён, праўда, не старажытны, бо, пакуль замак быў крэпасцю, акружаць яго дрэвамі было нельга — гэта перашкаджала артылерыі. Таму яшчэ ў XIX ст. замак акружалі адкрытыя лугі. Так званы "Стары парк" быў заснаваны ў 1879 г. З паўднёвага боку пад таполяй захаваўся "камень закладкі", які сведчыць, што ў той час тут расла толькі "гэта адзіная таполя". Модная тады англаманія паўплывала на характар рамантычнага пейзажнага парку. Увесь "дзірванова-паркавы" ансамбль займае 108 га, з іх стаў "Дзікі" — 42 га. З розных векавых раслін захавалася толькі 104 віды, 70 завезеныя ўжо ў нашыя дні. Адпаведна модзе канца XIX ст. у парку былі: "Галандскі млын", які стаяў на старых жорнах, "Бярозавы домік", на палянах ляжалі розныя "памятныя камяні" (адзін з іх быў прысвечаны сабаку, які ў 1896 г. выратаваў гаспадару жыццё). З "Новым паркам", пасаджаным на другім беразе, былі звязаныя рамантычныя паданні. Ён насіў назву "Марысін парк", меў "Паляну белага арла", круглы стаў з абавязковым "Востравам кахання", калодзеж (крыніца XVI ст.) з надпісам на камені "Студня Ундзіны" і г. д.

На Нясвіжскі парк наклала адбітак эпоха гістарызму, якая змяніла рамантызм на мяжы XIX—XX стст. Маляўнічыя паляны, якія тут і там адкрывалі перад вамі групы дэкаратыўных дрэў, збудаванняў і г. д., цяпер былі замененыя копіяй сапраўднай прыроды. Ствараліся вялікія лясы, у значнай колькасці высаджваліся вельмі рэдкія пароды дрэў. На ўсходняй ускраіне Нясвіжскага парку быў створаны так званы Рускі лес з масай лісцевых народаў. Стварэнне Старога і Новага паркаў — работа таленавітага беларускага садавода-дэкаратара, галоўнага садоўніка Андрэя Пастарэмчыка (1878—1913). У 1913 г. тут працаваў выпісаны з Англіі садоўнік, у задачу якога ўваходзіла паляпшэнне паркавых ландшафтаў. У адпаведнасці з тагачаснай модай ён пасадзіў на ўскраіне парку ля става японскі сад з карлікавымі пародамі.

Зараз парк у значнай ступені адноўлены.

**Горад Нясвіж** размясціўся на другім баку става, створанага ад ракі Ушы. Атрымаўшы гэтае паселішча ва ўладанне, Радзівілы перш за ўсё перапланавалі яго. У 1586 г. ад Мікалая Сіроткі горад атрымаў самакіраванне і ў канцы XVIII ст. налічваў 2714 жыхароў, 490 дамоў (29 з іх былі

мураванымі). Цэнтрам горада, як звычайна, была прамавугольная плошча рынку з ратушай. Тры бакі займалі мураваныя дамы мяшчан, а чацвёрты — паўднёва-заходні (дзе зараз гатэль) — дамініканскі кляштар (1672). Горад быў адкрыты да замка, а з астатніх бакоў умацаваны валамі з бастыёнамі, сценамі і равамі. На поўначы і на поўдні знаходзіліся два кляштары: бернардзінскі (1598) і бенедыкцінскі (1593). Ад умацаванняў горада XVI—XVII стст. засталася Замкавая вежа побач з езуіцкім касцёлам і так званая Слуцкая брама.

**Замкавая вежа.** Магутнае чатырохпавярховае квадратнае ў плане збудаванне, прызванае разам з размешчанай побач Замкавай брамай (не захавалася) абараняць уезд на замкавую дамбу і мост. Вежа пастаўлена на высокі цокаль, кожны з яе чатырох ярусаў забяспечаны вялікімі пралётамі разнастайных абрысаў, іх пабеленыя карнізы і гарызантальныя цягі маляўніча кантрастуюць з чырвонай цэглай сцяны.

**Слуцкая брама.** У горад уязджалі праз вежы-брамы: Клецкую, Віленскую і Слуцкую. З іх захавалася толькі апошняя, збудаваная ў стылі барока ў XVII ст., з магутнымі контрфорсамі на ніжнім паверсе, дзе былі памяшканні для кардэгардыі. Верхні паверх прызначаўся для капліцы. Абодва фасады брамы завяршаюцца тыпова барочнымі франтонамі даволі своеасаблівага малюнка. Перад намі рэдкі ўзор брамы сярэднявечнага беларускага горада, і гэты помнік уяўляе сабой вялікую каштоўнасць.



Нясвіж. Замкавая вежа



Нясвіж. Слуцкая брама (XVII ст.)

**Ратуша** ў Нясвіжы захавалася далёка не ў пачатковым выглядзе. Збудаваная яна была адразу пасля 1596 г., калі горад атрымаў Магдэбургскае права, і прызначалася для работнікаў магістрата. Ратуша перабудоўвалася ў 1752 і ў 1836 гг. Пасля апошняй перабудовы яна страціла высокую і святочную, тыповую для будынка ратушы вежу. Зараз гэта сухі прамавугольны ў плане аб'ём з масіўнай нізкай вежай над уваходам. Прайшоўшы яе, наведвальнік трапляе да высокай лесвіцы, якая вяла ў залу пасяджэнняў гарадскога магістрата.

У XVII ст. да ратушы прыбудавалі яшчэ гандлёвыя рады — характэрныя памяшканні для прыватных лавак, вырашаныя ў выглядзе суцэльнай аркі, перакрытай масіўным атыкам, які ўпрыгожаны двайной лініяй неглыбокіх нішаў. Цікава, што ў архітэктуры гандлёвых радоў яшчэ прасочваюцца рысы рэнесансу, аднак на ўязных варотах, якія вядуць ва ўнутраны дворык, ужо бачныя і рысы барока.

**Езуіцкі касцёл.** Акрамя замка самым цікавым помнікам Нясвіжа патрэбна прызнаць знакаміты езуіцкі касцёл. Мікалай Радзівіл Сіротка, звернуты ў каталіцтва дзеячам Контррэфармацыі Пятром Скаргай (1536—1612), запрасіў з Рыма архітэктара Яна Бернардоні і даў яму заданне



Нясвіж. Ратуша і гандлёвыя рады

збудаваць не толькі замак з палацам, але і езуіцкі касцёл з калегіумам. Да жніўня 1584 г. падмурак касцёла быў гатовы. У гэты ж час пачалася скупка земляў па суседству з замкам для будаўніцтва калегіума на 200 чалавек. Даўжыня ўчастка, аддадзенага езуітам, па падліках А. Д. Квітніцкай, была роўная палове даўжыні ўсяго горада.

Незадоўга да гэтага Бернардоні ўдзельнічаў, як мяркуюць, у будаўніцтве знакамітага храма Іль Джэзу ў Рыме, і не дзіўна, што езуіцкі касцёл у Нясвіжы з'яўляецца паменшаным паўторам гэтага праслаўленага твора італьянскіх архітэктараў Д. Віньёлы і Д. Порта. Нясвіжскі езуіцкі касцёл стаў першым барочным храмам у Рэчы Паспалітай. Калі раней касцёлы тут былі аднанефавымі, зальнымі, толькі зрэдку базілікальнымі і перакрываліся крыжовымі ці зоркападобнымі нервюрнымі скляпеннямі, то цяпер у Нясвіжы ўзнікла базіліка з купалам, што дазваляла незвычайна абагаціць інтэр'ер. Побач з нізкай забудовай таго часу нясвіжскі касцёл быў бачны адусюль, і, улічыўшы гэта, Бернардоні спецыяльна выдзеліў на бакавых фасадах гранёныя капэлы, а таксама архітэктурна апрацаваў бакавыя і заднія фасады. Можна меркаваць, што нясвіжскі храм быў першым, фасады якога былі пакрытыя тынкоўкай і пабеленыя. У помніках, якія папярэднічалі гэтай пабудове, на фасадах тынкаваліся і бяліліся толькі нішы. У нясвіжскім



Нясвіж. Езуіцкі касцёл (1584)



Нясвіж. Езуіцкі касцёл. Роспіс інтэр'ера (мастак К. Хескі, 1754 г.)

храме таксама ўпершыню пастаўлены каменныя скульптуры святых у нішах фасадаў. У цэлым пабудова Бернардоні — простая і прыгожая базіліка. Яе сярэдні неф павышаны, заканчваецца паўцыркульнай апсідай і перакрыты цыліндрычнымі скляпеннямі з люнетамі. Бакавыя нефы намнога ніжэйшыя і перакрытыя крыжовымі скляпеннямі. Галоўны фасад выключна характэрны для гэтай эпохі. Як і ў іншых помніках ранняга барока, ён дзеліцца па вертыкалі пілястрамі, а па гарызанталі — развітым антаблементам. Асаблівую параднасць будынку надаюць чатыры нішы са скульптурамі, чатыры глухія квадратныя нішы і інш. Імпазантны інтэр'ер касцёла запоўнены жывапісам (фрэскі напісаны ў 1754 г. мастаком К. Хескі, больш раннія не захаваліся). Ад першапачатковага храма да нас дайшлі алтары, размешчаныя ў канцы трансепта. Анёлы, якія падтрымліваюць падаючыя калоны, сімвалізуюць часовае "адступніцтва" Радзівілаў ад

каталіцызму. Вельмі цікавае надмагілле Радзівіла Сіроткі і двух яго сыноў. Барэльеф паказвае яго скінуўшым даспехі, апранутым у адзенне паломніка, які на каленях звяртаецца да Бога... Труны з целамі Радзівілаў і зараз пакояцца ў спецыяльных склепах (крыптах) пад падлогай.

"У цэлым будынак з'явіўся плённым пачаткам у архітэктуры Беларусі, — піша А. Д. Квітніцкая, ацэньваючы помнік,— да з'яўлення гэтага храма высотныя кампаненты мураваных пабудоў — вежы — не былі звязаныя з павышэннем унутранай прасторы збудавання. Іншая структура дазволіла значна павысіць інтэр'ер культавага будынка і надаць асаблівую значнасць помніку сярод навакольнай забудовы. У той жа час архітэктура касцёла вызваленая ад залішніх нагрувашчванняў барока. Яго кампазіцыя строга лагічная і не мае вычурнасці і пампезнасці гэтага стылю".

**Кляштар бенедыкцінак.** Паблізу цэнтра горада знаходзіцца кляштар бенедыкцінак, збудаваны ў 1590—1595 гг. тым жа Радзівілам Сіроткай у тым жа стылі ранняга барока. Ордэн бенедыкцінак — самы стары сярод заходнееўрапейскіх. Ён заснаваны каля 530 г. манахам Бенедыктам Нурсійскім у Італіі (Монтэкасіна) і вызначаўся строгасцю манастырскага статута. Манахі гэтага ордэна абавязаныя былі заўжды знаходзіцца ў сваім кляштары, давалі абеты строгага ўстрымання і паслушэнства. Пры абавязковай малітве сем разоў у суткі яны яшчэ павінны былі займацца фізічнай і разумовай працай. У задачу ордэна ўваходзіла падтрымка імкненняў рымскага папы да панавання над каталіцкай царквой ва ўсёй Заходняй Еўропе.

Нясвіжскі кляштар бенедыкцінак меў малавыразны двухпавярховы будынак, паміж крыламі якога быў пастаўлены аднанефавы з пяціграннай алтарнай апсідай невялікі касцёл. Яго вежу, падобную да захаванай брамнай, разабралі яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. Сцены касцёла маюць пілястры і завяршаюцца развітым карнізам. Цікавая квадратная ў плане брамная вежа, збудаваная ў XVIII ст. у стылі позняга барока. Складанапрафіляваныя гарызантальныя цягі дзеляць яе на тры ярусы, прычым так, што кожны вышэйшы ярус ніжэйшы за папярэдні, чым дасягаецца ўражанне лёгкасці пабудовы.

"**Дом на рынку**"— узор мясцовай грамадзянскай архітэктуры эпохі барока. Гэта прамавугольны ў плане двухпавярховы будынак з жылымі памяшканнямі пад высокім дахам, узведзены ў 1721 г., уяўляе сабой змешаную

канструкцыю. Ніжняя яго частка выкладзеная з цэглы, верхняя, меншая па плошчы,— з дрэва. Самай цікавай часткай будынка з'яўляецца яго парадны тарцовы бок, звернуты да плошчы. Верх гэтага фасада вырашаны ў выглядзе масіўнага трохвугольнага шчыта з тыпова барочным хвалістым сілуэтам. Сіметрычнасць фасада падкрэсліваецца па яго цэнтральнай восі — уваходам у ніжняй частцы, вышэй — балкончыкам і яшчэ вышэй — акном з двума фальшывымі вокнамі-нішамі па яго баках. За гэтым цагляным фасадам не відаць, што верхняя частка будынка зробленая з дрэва. Перад намі тыповы дом даволі багатага мясцовага рамесніка. Праўда, такой багатай вонкавай апрацоўкі ў другіх дамах мы ўжо не сустракаем. Такіх будынкаў, відавочна, на плошчы было некалькі.

**Іншыя пабудовы Нясвіжа.** Звернем увагу на невялікую капліцу, збудаваную ў 1747 г. архітэктарам Педэці, на цікавую радавую старую забудову, якая "... аднаўляе характар гістарычнай эпохі XVIII—XIX стст." (У. А. Чантурыя). Сярод гэтай забудовы асаблівае месца належыць нясвіжскай плябані (дом ксяндза), збудаванай паблізу езуіцкага касцёла ў XVI—XVII стст. Тут на ўнутраным фасадзе захаваліся сляды рэнесанснай аркады. На доме размешчана мемарыяльная дошка, прысвечаная Сымону Буднаму.



Нясвіж. Дом на рынку (1721)

Першапачатковая планіроўка будынка страчаная. Цікава, што традыцыі сярэднявечнага будаўніцтва індывідуальных дамоў трымаліся ў Нясвіжы вельмі доўга. Напрыклад, паглядзім на невялікі двухпавярховы дом побач з ”домам на рынку“, збудаваны ў другой палове XIX ст. Авінавіцкімі. Ён захаваў формы, блізкія да больш старажытных дамоў у гэтых мясцінах. Сям‘я Авінавіцкіх у XIX ст. выдзялялася ў Нясвіжы адукацыяй і прагрэсіўнымі поглядамі, сын уладальніка дома быў вядомым адвакатам. У верхняй частцы дома над традыцыйным балкончыкам маецца ўпрыгожанне ў выглядзе штукавых гірляндаў з кветак і зяляніны, паміж гірляндамі размешчаная дата пабудовы — 1878 г. і ініцыялы ўладальніка. На жаль, такіх ”традыцыйных“, збудаваных у XIX ст. прыватных дамоў засталося ў горадзе зусім нямнога!

**П а р к А л ь б а** зараз знаходзіцца ў межах горада і да яго можна праехаць на гарадскім аўтобусе, але калісьці тут была загарадная рэзідэнцыя Радзівілаў. У 1604 г. усё той жа Радзівіл Сіротка збудаваў каля паўднёвай ускраіны горада ”Каналяцыю“ (”Суцяшэнне“) — Эрмітаж з палацам і побач — фабрыку дываноў. Праз сто гадоў Пане Каханку ўзвёў тут ”дамы і палаты“ пад назвай ”Альба“ (ранішняя зара).



Нясвіж. Забудова цэнтра горада (XIX ст.). Дом Авінавіцкіх

У суседнім лесе ён уладкаваў звярынец, куды нагналі звяроў з Белавежскай пушчы. Фантазія Радзівілаў у Альбе не ведала межаў! Людзі распавядалі аб паездках у гэтым парку на санях, запрэжаных мядзведзямі, летам па пасыпанай соллю дарозе... Зараз Альба ўяўляе сабой лесапарк плошчай у 200 га. Уражваюць рэшткі вялікай рыбнай гаспадаркі, складаная сістэма зарослых каналаў (усяго каля 30 вадаёмаў!), велізарныя старыя дрэвы.

Самая старая частка парку, мяркуючы па слядах дарожак, рэгулярнага, знаходзіцца цяпер пад лясным масівам. Паўднёва-ўсходняя частка занятая новым пейзажным паркам, створаным пры апошніх Радзівілах у 1930-х гадах. Парк Альба вельмі запушчаны, але, можа быць, у гэтым і ёсць яго рамантычная прывабнасць. Па ім патрэбна доўга і ўважліва пахадзіць, толькі пасля гэтага гледачу адкрываюцца яго старажытныя абрысы...

**С н о ў** — невялікае мястэчка на рацэ Сноўцы паблізу сталіцы Радзівілаў, куды ад яе ходзіць міжгародні аўтобус. Размешчанае так блізка да Нясвіжа, мястэчка Сноў таксама некалі належала Радзівілам, але потым перайшло да парадніўшыхся з імі Рдултоўскіх. Тут ёсць стары, збудаваны яшчэ Радзівіламі касцёл (другая палова XVII ст.), у якім пасля паўстання 1863 г. была зроблена праваслаўная царква, ёсць і



Сноў. Палац (1827)

праваслаўная царква, збудаваная ў 1836 г. Але галоўнае — цудоўны палац Рдултоўскіх, твор архітэктара Б. Тычэцкага (1827 г.).

Палац — вялізны працяглы будынак, некалі ў сто пакояў, выцягнуты ў даўжыню на 140 м! Ён складаецца з некалькіх удала пастаўленых роўнавялікіх аб'ёмаў і вялікая працягласць яго становіцца непрыкметнай. Будынак сіметрычны, цэнтральны порцік фланкіруецца рызалітамі меншай вышыні, а да іх па баках прыстаўленыя аднапавярховыя крылы з іанічнымі каланадамі, якія ў сваю чаргу фланкіруюцца трохі павышанымі павільёнамі. Схема палаца нагадвае некаторыя аналагічныя пабудовы на Украіне, напрыклад Антопальскі палац, і інш. Аднак у сноўскім будынку шмат своеасаблівага: "прапарцыйнасць і грацыёзнасць порцікаў з прыгожым малюнкам капітэляў, ажурныя рызаліты цэнтральнай часткі будынка з шырокімі трохчасткавымі вокнамі на два паверхі, дэкаратыўныя ўстаўкі каля арачнага завяршэння вокнаў надаюць фасадам палаца зграбнасць і веліч",— піша спецыяліст па архітэктуры Беларусі прафесар У. А. Чантурыя, падкрэсліваючы "працягласць і раскрытасць кампазіцыі, выразнасць планіровачнай і аб'ёмнай пабудовы, строгасць архітэктурных формаў".



Сноў. Крыло палаца

Палац зараз адрэстаўраваны і стварае вельмі моцнае ўражанне. У ім размешчаны шпіталь.

Інтэр'ер будынка таксама цікавы. Вялікая парадная зала (плошчай больш за 100 кв. м) з шасцю высокімі вокнамі, якія выходзяць на абодва фасады, трохі ссунутая ад цэнтральнай восі будынка. У адной са сценаў залы — глыбокая ніша-"алькоў" з дадатковымі нішамі для скульптур. Звернем увагу і на высокамастацкую кафляную печ насупраць алькова. Усё гэта надае памяшканню асаблівую параднасць. Даводзіцца шкадаваць, што з-за шматлікіх пажараў астатнія ўпрыгажэнні залы не захаваліся. Няма іх і ў іншых жылых памяшканнях палаца.

**Ішкальдзь і Палапечка.** Абодва гэтыя старыя маёнткі з цікавымі архітэктурнымі помнікамі размешчаныя не так далёка ад Снова, на захад ад чыгункі і шашы Мінск — Баранавічы. У першы можна патрапіць на аўтобусе ад Баранавіч або Стоўбцаў. Аднак з Ішкальдзі да Палапечкі можна дайсці і пехам — паміж імі ўсяго некалькі кіламетраў.

Старажытны маёнтак Ішкальдзь знакаміты сваім выдатным касцёлам — адным з самых ранніх узораў беларускай готыкі. Паводле архіўных звестак вядома, што ён быў збудаваны ў 1472 г. Не так даўно гэта яшчэ раз пацвердзілася: у апублікаваных жыццёпісах віленскіх біскупаў ёсць сведчанне, што пры біскупе Яне Ласовічу (1462—1481) знаёмы нам (гл. Уселюб) Мікалай Няміровіч збудаваў у сваім маёнтку Ішкальдзь мураваны касцёл, які быў асвечаны ў 1471 г. Такім чынам, помнік збудаваны ў самую познюю пару развіцця гатычнага стылю, калі, як мы ўжо казалі, невысокія зальныя храмы з тонкімі апорамі прыйшлі на змену высотным кампазіцыям з магутнымі сценамі і слупамі і выдзеленымі вертыкальнымі элементамі, калі маляўнічасць і дэкаратыўнасць узялі верх над суровай сіметрыяй.

Як паказала А. С. Янкавічэне, Ішкальдскі касцёл нясе на сабе адбітак як познебеларускай готыкі, так і некаторыя асаблівасці руска-раманскага ўплыву і нават недалёкага ўжо рэнесансу. Праўда, познегатычныя рысы, паказвае даследчыца, якія характэрныя для модных тады бязвежавых храмаў, на помніку з'яўляюцца галоўнымі. "Галоўны фасад завяршаецца вострым шчытом з нішамі, у цэнтры фасада — партал і акно, па баках адпаведна ўнутраным слупам-апорам сярэдняга нефа — контрфорсы. На бакавых фасадах (...) рытмічна



Ішкальдзь. Касцёл (1472)

чаргуюцца вокны і контрфорсы. На паўночным фасадзе вокнаў няма. Такая асаблівасць часта сустракаецца на гатычных храмах Прусіі. Святла для інтэр'ера было дастаткова. Як і прынята было ў познегатычных пабудовах, сцены будынка не тынкаваліся, чырвонай цэгле супрацьпастаўляліся атынкаваныя белыя нішы. Для гэтага ж стылю характэрны і партал са стрэльчатай аркай у прамавугольнай аблямоўцы". Ад царкоўнага стылю XII ст., мяркуе А. С. Янкавічэне, у інтэр'ерах касцёла — магутныя слупы, якія дзеляць яго на тры нефы, і некаторыя іншыя асаблівасці. Мы сказалі яшчэ аб рысах рэнесансу ў Ішкальдскім касцёле. Даследчыца бачыць іх перш за ўсё ў замене гатычных арак паўкруглымі. Аднак яна знаходзіць у храме і рысы самастойнасці: шчыпец з нішамі галоўнага фасада аддзелены ад ніжняй часткі сцяны ледзь прыкметна, аднак у гэтым выпадку контрфорсы ў познегатычных храмах даходзяць да верху і заканчваюцца асаблівымі "сілуэтнымі акцэнтамі". Тут жа яны канчаюцца на плоскасці шчыта, а нішы дзякуючы гэтаму ўдалося размясціць

у шахматным парадку. Арыгінальныя тут і формы контрфорсаў і прыступкавая форма абрысаў шчыта. Нічога падобнага ў іншых познегатычных помніках мы не знаходзім. Касцёл у Ішкальдзі, які ўспрыняў комплекс разнастайных рысаў (заходнееўрапейскіх, усходнеславянскіх), вельмі арыгінальны і ў гэтым яго вялікая каштоўнасць!

Ішкальдзь адзін час была родавым маёнткам Іллінічаў, а ад іх перайшла да Радзівілаў.

У сямі кіламетрах ад Ішкальдзі ёсць цікавы старажытны маёнтак Радзівілаў — Паланечка. Размешчаны ён на рацэ Змейцы — левым прытоку Ушы. Некалі ўладанне належала Дусяцкім-Рудомінам, а пазней, як і ўсе навакольныя землі, перайшло да Радзівілаў. Росквіт маёнтка адносіцца да канца XVIII — пачатку XIX ст., калі ім кіраваў Мацей Радзівіл. Ён збудаваў палац, які славіўся раскошай, вялікай бібліятэкай, фамільным архівам. Там была сабрана вялікая колькасць твораў мастацтва. У маёнтку адбываліся святы з грандыёзнымі феерверкамі, з усіх бакоў да Паланечкі сцякаліся госці. Мацей памёр, і пры апекунах яго сына-нашчадка Хадкевічах бляск маёнтка быў страчаны, палац не рамантаваўся, прыйшоў у заняпад, пасля яго неаднойчы перараблялі.

Паводле акварэлі мастака Н. Орды, першапачаткова палац меў так званую сіметрычна-восевую трохчасткавую



Паланечка. Панскі дом (так званы палац)

кампазіцыю, дзе да двухпавярховага прамавугольнага аб'ёму з бакоў прымыкалі аднапавярховыя аб'ёмы з флігелямі па канцах галерэі. Сярэдняя частка галоўнага аб'ёму была забяспечаная плоскімі пілястрамі высокага ордэра, якія на ўзроўні другога паверха былі дэкарыраваныя гербамі і завяршаліся трохвугольным (не захаваўся) франтонам. Аконныя праёмы апрацаваныя сандрыкамі. У тым жа стылі вытрыманыя і астатнія часткі будынка. Пачатковыя інтэр'еры не захаваліся. Па некаторых звестках, у цэнтры палаца за вестыбюлем з лесвіцай была размешчаная парадная зала, у бакавых флігелях знаходзіліся службовыя памяшканні. Зараз увесь будынак прыстасаваны пад сярэднюю школу.

Да палаца прымыкаў "пейзажна-рэгулярны" парк з сістэмай сажалак, аранжарэямі, капліцай-пахавальняй уладальнікаў і г. д. Па сведчанню мясцовых жыхароў, яшчэ нядаўна ён займаў 76 га і меў (з аранжарэямі) да 700 відаў раслін. Парку цяпер няма: яго знішчылі немцы ў апошнюю вайну, баючыся нападаў партызанаў.

* * *

Алеі Нясвіжа ўжо ззаду. Мінавалі і мястэчка Гарадзею з яе невялікай чыгуначнай станцыяй. Аўтобус павольна пераваліўся цераз пераезд, і цяпер у акне віднеюцца далягляды. Нарэшце, спераду, над астраўкамі зялёніны ўздымаюцца нейкія слупкі. Вось яны бліжэй, ясней і паступова набываюць форму сярэднявечных вежаў з байніцамі, дэкаратыўнымі нішамі. Дрэвы расступаюцца — над штучным вадаёмам вырастае старажытны замак. Мы ў Міры.

**Мірскі замак.** Дык вось ён, знакаміты Мірскі замак! Яго пекнасці не могуць перадаць ні фотаздымкі, ні малюнкі. Фатаграфуюць часцей з возера, здалёк, ахвяруючы веліччу дзеля прыгожага адлюстравання ў вадзе... Трэба пахадзіць па яго знешніх валах, угледзецца ў цёмныя амбразуры, адчуць "дух" кожнай вежы, пранікнуцца іх суровай веліччу... Што выказвае гэты помнік, што даносіць да нас з глыбінь адышоўшых стагоддзяў?.. Трохвежавы галоўны фасад глядзіць над брустверам у бок захаду сонца. Дэкаратыўнае ўпрыгажэнне вежаў (нішы, вокны, зноў нішы), машыкулі сценаў — усё гэта ўражвае спалучэннем функцыянальна неабходнага і дэкаратыўнага, а разам з тым стварае значнае відовішча, дэманструючы ворагам моц уладальніка, які мог



Мір. Замак (XVI ст.)

дазволіць сабе не толькі ўзвесці першакласную фартэцыю, але і разнастайна яе ўпрыгожыць. Калі стаіш каля брамы замка, міжволі здаецца, што вось-вось сюды падляціць конны рыцар у развітым плашчы паверх даспехаў, акружаны коннай світай, і пачне трубіць у рог, патрабуючы апусціць мост і адчыніць браму!..

Летапісы маўчаць аб старажытным Міры. Першыя звесткі аб ім належаць да 1395 г., калі хохмайстар Тэўтонскага ордэна Конрад фон Юнгінген быццам спаліў Мір і разрабаваў ваколіцы. Ёсць звесткі, што брат Вітаўта Жыгімонт у 1434 г. перадаў Мір нейкаму Сенку Гедыгольдавічу за дапамогу ў барацьбе са Свідрыгайлам. Вядома таксама, што ў 1490 г. Мірам валодае Юры Іллініч, якому і прыпісваецца заснаванне замка. Мяркуецца, што адной з прычынаў будаўніцтва было жаданне Ілініча атрымаць тытул графа, а для гэтага патрэбна было быць уладальнікам замка!.. Як бы там ні было, на невялікім пагорку на месцы загінуўшага ад пажару паселішча (двара?) другой паловы XV ст. Юры пачаў будаўніцтва замка. З суседніх вёсак Прапошаў і Бірбашаў, дзе знаходзіліся цагельні, сюды звозілі цэглу, са Свержаня цягнуліся абозы з вапнай. Імя кіраўніка будаўніцтвам невядомае. Нам ясна толькі, што майстры-інжынеры былі цудоўна арыентаваныя ў навейшых дасягненнях тагачаснага абарончага дойлідства. Перш за ўсё былі ўзведзеныя сцены з

вежамі і аднапавярховыя памяшканні ўсярэдзіне будучага замка, а таксама валы вакол яго.

Замак атрымаў план трохі скошанага прамавугольніка, амаль квадрата з чатырма выступаючымі прамавугольнымі ў плане вежамі і адной квадратнай — брамнай. Для эканоміі цэглы з яе выкладаліся толькі знешнія і ўнутраныя паверхні сценаў, а сярэдзіна забутоўвалася дробным каменнем. Вежы моцна ўзвышаліся над сценамі і былі разнастайна дэкарыраваныя нішамі, арнаментальнымі паясамі і г. д. Давайце ўважліва ўгледзімся ў вежы: усе яны па форме вытрыманыя ў адным стылі — роўныя па вышыні, у асноўным маюць квадратны ў плане паралелепіпед, які звужваецца да верху, а на яго пастаўлены яшчэ васьмярык. Але пры агульнасці схемы прапорцыі брамнай вежы трохі адрозніваюцца ад астатніх. Калі ў кутніх вежаў чацвярык складае дзве трэці іх вышыні, а васьмярык толькі адну (што надае ім значную манументальнасць), то ў праезджай вежы чацвярык і васьмярык займаюць па палове яе вышыні і вежа становіцца больш зграбнай. Афармленне вежаў дэкаратыўнымі нішамі і пояскамі таксама не аднолькавае. Больш за ўсё быў дэкарыраваны заходні бок замка, дзе знаходзіўся ўезд. Асабліва эфектна выглядае брамная вежа. Святочнасць ёй надаюць паясы дробных і вузкіх нішаў над варотамі і больш за ўсё зверху каля завяршэння васьмерыка, дзе вузкія і доўгія нішы з дакладнымі прапорцыямі апаясваюць вежу цалкам. Інакш вырашаны дэкор паўднёва-заходняй вежы, паверхня якой дзеліцца значна больш буйнейшымі нішамі.

Гарматы ў вежах стаялі на трэцім ярусе, з астатніх ярусаў ворага палівалі агнём са стрэльбаў і мушкетаў. Калі з боку двара ў паўднёвай сцяне і зараз добра відныя гарматныя байніцы, то на заходняй сцяне і па верху паўднёвых вежаў можна бачыць машыкулі, праз якія ў момант прыступу на галовы нападаючых лілі вар. Звернем увагу і на самыя верхнія байніцы на вежах, заходняй і паўночнай сценах: адтуль стралялі ў ворага, які лез на сцены. Усярэдзіне замка каля ўсходняй і паўднёвай сценаў Юры Іллініч меркаваў збудаваць палац, а каля паўночнай сцяны (далей ад палаца на выпадак выбуху) — арсенал. Аднак дабудаваць замак уладальнік не паспеў: гэтыя пабудовы засталіся ў праекце, паўночна-заходняя вежа да моманту яго смерці была гатовая толькі напалову. У хуткім часе род Іллінічаў знік. Апошні яго прадстаўнік унук Юрыя (таксама Юры) атрымаў ад імператара

Свяшчэннай Рымскай імперыі тытул графа (1555), але нашчадкаў не меў і адпісаў Мір сыну свайго апекуна Мікалаю Радзівілу Сіротку (1569). З тых часоў Радзівілы валодалі Мірам аж да 1813 г.

Энергічны Радзівіл Сіротка вырашыў дабудаваць замак і запрасіў для гэтага італьянцаў, якія толькі што закончылі працы ў Нясвіжы (пачатак XVII ст.). Калі Мірскі замак пачыналі будаваць ў стылі знаёмай нам позняй готыкі, то цяпер у Італіі панаваў стыль рэнесансу. Адпаведна будаваўся і Мірскі замак. Спачатку тут паўсталі аднапавярховыя пабудовы з вялікімі скляпеннямі каля паўночнай і ўсходняй сценаў, затым іх надбудавалі да трох паверхаў, ператварыўшы ў салідны палац. Сцены, якія да яго прылягалі, таксама былі перакладзеныя — у іх з'явіліся вокны, а байніцы заклалі. Трэці паверх палаца закрыў байніцы галерэі верхняга бою. Было скончана будаўніцтва паўночна-заходняй вежы, але ў адрозненне ад старых вежаў яна атрымала трошкі іншыя прапорцыі, а таксама вялікія вокны. Перад брамнай вежай збудавалі паўкруглы выступ, які часам недакладна называюць барбаканам. Вакол замка насыпалі валы з бастыёнамі. У самім замку з'явіліся аднапавярховыя прыбудовы: кухня, стайня (з двух бакоў паўднёвай сцяны), пякарня і піваварня (каля заходняй сцяны). Знешні выгляд замка таксама змяніўся — сцены палаца і трох вежаў былі атынкованыя. На вежах пад тынкоўкай зніклі стаўшыя нямоднымі дэкаратыўныя нішы, паяскі і парэбрыкі. Пераробка не закранула паўднёва-заходняй і брамнай вежаў, якія захаваліся амаль у першапачатковым выглядзе. Вось чаму яны так рэзка адрозніваюцца ад астатніх! Цяпер асноўным элементам дэкору стаў белы камень (сляды яго там-сям захаваліся).

Аб унутранай пабудове і ўбранстве палаца Мірскага замка можна меркаваць толькі па сярэднявечных інвентарах. У праезджай вежы мелася, напрыклад, рашотка-герса, якая ў выпадку небяспекі падала з другога паверха і перакрывала праход. Што тычыць палаца, то ён уражваў сваёй суровай прыгажосцю. Яго ўваходныя дзверы былі абабітыя жалезам, у вокны ўстаўленыя жалезныя рашоткі, за якімі віднеліся шыбы ў свінцовых аконных пераплётах. У скляпеннях жыла абслуга, захоўваліся запасы і зброя. Верхнія тры паверхі прызначаліся для размяшчэння княскай сям'і (40 пакояў). Тут былі шыкоўныя кафляныя печы, фігурны паркет. На сценах віселі карціны, габелены, верагодна, дарагая зброя, у шафах заха-



Мір. Палац у замку

валася дарагое начынне. Разныя пясчанікавыя кансолі паказваюць на тое месца, дзе быў вялікі балкон.

Час не пашкадаваў гэты выдатны помнік. Мірскі замак моцна пацярпеў пад час нашэсця шведаў у 1655 і 1706 гг. У 1726 г. Радзівіл Рыбанька яго аднавіў, але ўжо ў зменeным выглядзе: скляпенні другога паверха замянілі драўлянымі перакрыццямі. Габелены, начынне, якое ўпрыгожвала палац, былі цяпер выкананыя мясцовымі ўмельцамі. Пры знаёмым нам ужо Пане Каханку, які жыў тут пасля першага шлюбу, мястэчка Мір, сцвярджаюць некаторыя гісторыкі, дасягнула росквіту. На самай справе: у 1785 г. гэты князь урачыста прымаў тут апошняга караля Станіслава Аўгуста. У 1792 г. войскі Кацярыны II аблажылі замак і моцна яго пабурылі. Тое ж паўтарылася ў 1812 г., калі тут два дні ішлі баі паміж Баграціёнам і дывізіяй Ражнецкага. Гэта было пры наступленні французаў летам, а восенню пры іх адступленні адмірал П. В. Чычагаў выбіваў з замка аддзелы дывізіі Дамброўскага... Знаёмы нам па Нясвіжы Дамінік Радзівіл быў апошнім Радзівілам — уладальнікам замка. Ён памёр у 1813 г., пакінуўшы ў спадчыну дачцы Стэфаніі гэты замак. Тая выйшла замуж за графа Вітгенштэйна і замак перайшоў да гэтага роду. Затым ім валодалі Гогенлоэ, а ў 1895 г. яго атрымаў князь Святаполк-Мірскі, які і ўзяўся за рэстаўрацыю помніка, а потым пачаў будаваць побач новы палац уладальнікаў (не захаваўся) і прыгожую ўсыпальню.

Не даводзіцца сумнявацца, што Мірскі замак з‘яўляецца цікавейшым аб‘ектам для археалагічных раскопак. Першыя падобныя працы там правёў знаёмы нам Ю. Ядкоўскі, якому ўдалося адкрыць каля галоўнай брамы калодзеж і знайсці вялікую колькасць рэшткаў вітражоў і фрагменты паліхромнай кафлі.

З 1970-х гадоў за даследаванні ў замку ўзяліся беларускія рэстаўратары і археолагі. Рэканструкцыю помніка, прапанаваную Ю. Ядкоўскім, цяпер змяніла рэканструкцыя В. В. Калніна і Л. В. Трэпет на грунце новых даследаванняў. У 1972 г. М. А. Ткачоў раскапаў прадбрам‘е — падкованадобнае цаглянае збудаванне канца XVI — пачатку XVII ст., якое мела сцены ў 1,25 м таўшчынёй і захавалася на вышыню 1,35 м. Гэтая пабудова з‘яўлялася дадатковым умацаваннем уезда. У 1980-х гадах археалагічныя даследаванні былі працягнутыя А. А. Трусавым. Ён высветліў, што першае паселішча на месцы замка ўзнікла яшчэ ў XV ст. Яно загінула пад час

моцнага пажару і на гэтым месцы насыпалі магутную падушку з пяску і гліны, на якой і пачалося будаўніцтва Мірскага замка. Земляныя валы і бастыёны, якія мы і зараз бачым вакол замка, былі насыпаныя пазней. А. А. Трусаў даследаваў аднапавярховыя прыбудовы XVII ст. да паўднёвай сцяны, падмуркі палаца, рэшткі баявой галерэі на заходняй сцяне, рэшткі падмуркаў лесвічнай вежы і г. д. І. М. Чарняўскі адкрыў руіны кухні ў двары замка. Цікава, што цэгла абпальвалася тут жа каля пабудовы — удалося знайсці сляды печы XVI ст. Мноства рэчаў, знойдзеных пад час раскопак, значна аблегчыла працу рэстаўратараў, якія аднаўляюць гэты цудоўны помнік еўрапейскага маштабу.

**Усыпальня Святаполк-Мірскіх.** Раз у год, расказвала мне мясцовая ўраджэнка, дачка вядомага ў тутэй-



Мір. Царква-ўсыпальня князёў Святаполк-Мірскіх (пачатак XX ст.)

шым краі аптэкара, М. І. Грышына, на іх маленькай станцыі Гарадзея адбывалася незвычайнае — варшаўскі кур‘ерскі цягнік, які заўжды пралятаў на ўсёй хуткасці, раптам спыняўся. Усе ўжо ведалі — гэта прыехаў у свае ўладанні князь Святаполк-Мірскі. Англійскія коні цырымонна перабіралі забінтаванымі нагамі, паважная павозка мільгацела спіцамі — князь ехаў у Мір на адпачынак. Пад‘язджаючы да замка, ён бачыў, як ідзе будаўніцтва яго новага палаца, як рухаецца задуманая ім рэстаўрацыя замка, як будуюць усыпальню яго роду.

Ад палаца, як мы казалі, нічога не засталося, але на беразе става за замкам, на тым месцы, дзе ў XVII ст. быў распланаваны парк італьянскага тыпу з ліпамі па перыметру, рэгулярнай сістэмай алеяў, баскетаў, з аранжарэямі і вадаёмамі, цяпер быў разбіты пейзажны парк плошчай 25 га, які ўключаў у сябе не толькі тэрыторыю замка, але і новы палац, толькі што адбудаваны для Святаполк-Мірскіх (разбураны ў 1914 г.). Сярод зялёнай лістоты эфектна пачынаў падымацца, адлюстроўваючыся ў вадзе, спакойны сілуэт капліцы-ўсыпальні. Гэты цудоўны помнік архітэктуры мадэрн добра захаваўся і яшчэ цяпер уражвае сваім колеравым рашэннем: цёмна-чырвоная цэгла, шэры камень, бетон, вялікае мазаічнае



Мір. Від на царкву-ўсыпальню князёў Святаполк-Мірскіх

пано на фасадзе з лікам Хрыста — усё гэта дзівосна гармануе ”са старажытным замкам, зелянінай парку, вадаёмамі, павялічваючы маляўнічасць гэтага куточка ансамбля“ (У. А. Чантурыя). Царква сапраўды стварае вельмі своеасаблівае ўражанне. Яе збудаваў у 1904 г. архітэктар Марфельд. Асновай кампазіцыі з‘яўляецца квадратная ў плане слупападобная трох‘ярусная званіца, да якой збоку прыстаўлены закрыты бабінец з вялізным мазаічным пано Хрыста над ім, ззаду гэтых пабудоў да іх прыстаўлены асноўны аб‘ём невысокай капліцы. Фасад будынка, такім чынам, атрымліваецца быццам трохпрыступкавым, прычым кожная прыступка (званіца, пано, храм) не толькі паніжаецца ў параўнанні з папярэдняй, але яшчэ трохі ”адступае“. У цэлым гэты зграбны, акружаны лістотай будынак перадае адчуванне непарушнага спакою, што і павінна выказваць хрысціянская пахавальная капліца.

Пакінуўшы парк, мы вяртаемся да замка і спрабуем разабрацца ў тым, што і калі ў ім рэстаўравалася. Самыя буйныя працы пачаліся пры пераемніку ўпамянутага Святаполк-Мірскага ў 1917 г., але яны насілі ў асноўным чыста рамонтны характар. Работамі кіравалі кансерватар Т. Буржэ, архітэктар Ф. Блех і майстар-муляр Я. Пушкарскі. Доўжыліся працы 20 гадоў, было адноўлена пяць пралётаў усходняга крыла палаца (верх яго так і не закончылі) і тры вежы: паўднёва-ўсходняя, паўднёва-заходняя і часткова паўночна-заходняя. У 1939 г. у сувязі з вайной працы былі спыненыя. Да іх вярнуліся толькі ў 1969 г. беларускія архітэктары-рэстаўратары, рэстаўрацыя працягваецца і зараз.

**Помнікі горада Міра.** Маленькі гарадок Мір захаваў сваю старажытную планіроўку — прамавугольную плошчу рынку ў цэнтры, вуліцы, якія разыходзяцца ад яе ў розныя бакі і ператвараюцца ў дарогі да іншых гарадоў. Стаяць тут традыцыйныя касцёл і праваслаўная царква.

Касцёл быў збудаваны ўсё тым жа Мікалаем Радзівілам Сіроткай у 1599—1605 гг. і прысвечаны яго патранальнаму святому Мікалаю. У 1710 г. яго абнавілі, а ў 1865 г. пад час апантанай русіфікацыі краю Мураўёвым-Вешальнікам ён быў ператвораны ў праваслаўную царкву. Зараз храм захаваўся далёка не поўнасцю. Па фотаздымках 1950-х гадоў відаць, што гэта была аднавежавая базыліка з невялікім трансептам. Магутная квадратная ў плане чатырох‘ярусная вежа з шатровым пакрыццем узвышалася над уваходам у па-

чатку цэнтральнага нефа і была ўпрыгожана ў трэцім ярусе глыбокімі дэкаратыўнымі нішамі. Бакавыя нефы завяршаліся дэкаратыўнымі вежкамі— цэнтральны неф быў перакрыты цыліндрычным скляпеннем, бакавыя — крыжовымі. У цэлым мірскі Мікалаеўскі касцёл — помнік вельмі цікавы і зараз на ім таксама ідзе рэстаўрацыя. Суровая масіўная вежа помніка напамінала вежы Мірскага замка.

Царква Св. Тройцы ў Міры была закладзена ў XVI ст., але ў сучасным выглядзе яна з‘яўляецца помнікам XIX ст. У 1865 г. яна згарэла і была адноўлена ў казённым псеўдарускім стылі. У 1875 г. да яе прыбудавалі трапезную і двух‘ярусную званіцу з васьміграннным шатром. У такім выглядзе значнай мастацкай каштоўнасці гэтая царква не мае, хоць і ”ахоўваецца дзяржавай“, як сведчыць надпіс на яе сцяне. Справа за рэстаўратарамі!

Археалагічныя даследаванні культурных наслаенняў у гарадскім пасёлку Мір, якімі кіраваў А. К. Краўцэвіч (1982—1989), далі вялікі археалагічны матэрыял. Тут у розных месцах былі закладзеныя 32 шурфы, 3 раскопы і 4 траншэі агульнай плошчай 316 кв. м. Высветлілася, што рэшткі жыццядзейнасці чалавека залягаюць тут на глыбіню да 3,5 м і ў заходняй частцы пасёлка датуюцца пачынаючы з XIV ст. Аднак самая вялікая колькасць знаходак адносіцца да XVI—XVII стст. Паблізу былой гарадской плошчы выяўленыя рэшткі скляпення буйной мураванай пабудовы, магчыма, гарадской ратушы XVII ст. Сярод знаходак адзначым два манетныя скарбы канца XVII — пачатку XVIII ст., цудоўную паліваную кафлю, якая выраблялася ў Міры (расчышчаны фрагмент кафлянай печы XVII ст.), побытавы паліваны і непаліваны керамічны посуд, шкляны посуд, разнастайныя металічныя вырабы і г. д. Пры раскопках замка знойдзены фрагменты рэйнскай керамікі XVI ст. са светла-сіняй палівай, а таксама паліхромнай XVII ст., якія сведчаць аб гандлёвых сувязях жыхароў замка. У пасёлку, зразумела, больш было рэчаў мясцовай вытворчасці, якія, аднак, сведчаць аб высокай матэрыяльнай культуры гарадскіх жыхароў беларускага горада позняга сярэднявечча. У цэлым археалагічныя даследаванні беларускіх археолагаў у Міры значна пашырылі нашыя ўяўленні аб гісторыі Мірскага замка і жыцці навакольных гараджан-беларусаў XIV—XIX стст.

Не забудзем суровую эпоху, якую перажыў Мір у апошнюю вайну, у памяць аб ёй у розных месцах горада стаяць

помнікі-абеліскі. У гараджан старэйшага пакалення на памяці расстрэлы мірных жыхароў. У замку гітлераўцы зрабілі лагер для ваеннапалонных і гета.

Колькасць насельніцтва яшчэ не дасягнула даваеннай, але будаўніцтва гарадскога пасёлка Мір ідзе поўным ходам, у бліжэйшым будучым ёнператворыцца ў цэнтр турызму міжнароднага ўзроўню. Крок за крокам рэстаўруецца гонар Беларусі — Мірскі замак, аднаўляецца старая забудова старажытнага горада. Працягваюцца архітэктурна-археалагічныя даследаванні, якія патроху раскрываюць нам гістарычнае мінулае гэтых мясцін.

Пажадаем жа ўсім, хто так самааддана працуе над аднаўленнем старажытных помнікаў Міра і ўсёй Беларусі, самай вялікай удачы на гэтай высакароднай ніве!

Наш маршрут па выдатных помніках Гродна і Панямоння падышоў да канца. Мы спрабавалі расказаць аб усім тым цудоўным, што захоўвае гэты край са свайго вялікага мінулага, гаварылі аб помніках, цяпер шырока вядомых у гісторыі архітэктуры і мастацтва Беларусі. Тое-сёе з таго, што тут апісана, вядома не так шырока і часцей толькі спецыялістам. Хацелася б думаць, што гэтая сціплая кніга для чытання (ніяк не даведнік) абудзіць цікавасць чытача да старажытных помнікаў краіны і ён накіруецца туды для знаёмства з тым, што мы апісалі, насустрач таму, што засталося яшчэ неадкрытым...

# Літаратура

*Алексеев Л. В.* Игнатий Кульчинский — первый исследователь белорусских древностей // Древности славян и Руси: К 80-летию Б. А. Рыбакова. М., 1988.

*Антипов В. Г.* Парки Белоруссии. М., 1975.

*Воронин Н. Н.* Древнее Гродно // Материалы и исследования по археологии СССР. М., 1954. Вып. 41.

*Гурин М. Ф.* Мир. Мн., 1985.

*Дурова Н. А.* Кавалерист–девица. СПб., 1836.

*Караткевіч В. Б., Кулагін А. М.* Помнікі Слоніма. Мн., 1983.

*Квитницкая Е. П.* Белоруссия // Всеобщая история архитектуры: В 12 т. М., 1968. Т. VI.

*Квитницкая Е. Д.* Планировка Гродно в 16—18 вв. // Архитектурное наследство. М., 1964. Вып. 17.

*Краўцэвіч А. К.* Гарады і замкі Беларускага Панямоння XIV—XVIII стст.: Планіроўка, культурны слой. Мн., 1991.

*Кулагин А. Н.* Архитектура дворцово-усадебных ансамблей Белоруссии второй половины XVIII — начала XIX в. Мн., 1981.

*Малевская М. В.* К реконструкции майоликовых полов Нижней церкви в Гродно // Культура Древней Руси. М., 1966.

*Ожешко Э.* Мемуары. Мн., 1911.

*Пярвышын У. М.* Помнікі Гнезна. Мн., 1991.

*Рапапорт П. А.* Пётр Міланег — гродзенскі дойлід XII ст. // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. Мн., 1987. № 4.

*Раппопорт П. А.* Русская архитектура X—XIII вв. Археология СССР. Л., 1982. Вып. Е—1—47.

*Сергачев С. А.* Деревянная архитектура Белоруссии XVI—XVII вв. Мн., 1984.

*Ткачоў М. А.* Замкі Беларусі. Мн., 1977.

*Ткачоў М. А.* Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII—XVIII стст. Мн., 1978.

*Трусов О. А.* Памятники монументального зодчества Белоруссии XI—XVIII вв. Мн., 1988.

*Трусаў А. А.* Старонкі мураванай кнігі. Мн., 1990.

*Чантурия В. А.* Архитектурные памятники Гродно. Мн., 1983.

*Чантурия В. А.* История архитектуры Белоруссии. Мн., 1985.

*Чарняўскі І. М., Жаровіна Г. П.* Нечаканае адкрыццё // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1982. № 4. С. 34—36.

Чтения в обществе истории и древностей Российских при Московском университете. М., 1870. № 3. С. 25, 78, 80, 81 (о пребывании ст. Августа в Гродно).

*Янкавічэне А. С.* Самабытныя рысы беларускай готыкі // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1974. № 1.

*Durczewski Zd.* Stary Zamek w Grodnie w świetle wykopalisk dokonanych w latach 1937—1938 // Niemen. 1939. Nr. 1.

*Jodkowski J.* Swiątynia warowna na Kołoży w Grodnie. Grodno, 1936.

Sprawozdanie z prac na Starym Zamku w Grodnie 1933—1937. Grodno, 1938.

*Szymański Stanisław.* Pałac królewski w Grodnie // Rocznik Białostocki. T. VI. Białystok, 1965. S. 297—333.

*Tatarkiewicz W.* Swiack. Warszawa, 1937.

*Wojciechowski J.* Stary Zamek w Grodnie. Warszawa, 1938.

# Слоўнік спецыяльных тэрмінаў

*Абак* — верхняя частка капітэлі, калоны, паўкалоны, пілястры

*励кеж* — гл. эркер

*Амбон* — узвышэнне ў царкве перад так званымі царскімі варотамі

*Антаблемент* — верхні, архітэктурна распрацаваны элемент класічнай ордэрнай сістэмы

*Анфілада* — шэраг злучаных памяшканняў, дзвярныя праёмы якіх размешчаны на адной асі

*Апсіда* — выступ будынка паўкруглай, шматвугольнай ці квадратнай формы ў плане — часцей у культавых пабудовах

*Аркада* — шэраг аднолькавых па абрысах арак, якія абапіраюцца на слупы або калоны

Атык — 1) сценка, размешчаная над карнізам будынка; 2) паверх, размешчаны вышэй верхняга карніза будынка

*Бабінец* — пярэдняя частка царквы перад паперцю

*Базіліка* — прамавугольны ў плане будынак, які ўнутры падзяляецца ўздоўж двума радамі калон

*Балюстрада* — агароджа з фігурных слупкоў, якой упрыгожваюць балконы, тэрасы, галерэі, лесвіцы

*Барбакан* — дадатковае ўмацаванне, якое ўваходзіла ў сістэму крэпасці

*Бельведэр* — невялікая вежа над будынкам або асобная невялікая пабудова на ўзвышаным месцы, адкуль можна аглядаць ваколіцы

*Валюта* — архітэктурны матыў у форме спіралепадобнага завітка з ”вочкамі“

*Віньетка* — аздабленне ў выглядзе невялікага малюнка на загаловачным лісце кнігі, у пачатку або ў канцы раздзела, у альбоме

*Данжон* — галоўная вежа ў сярэднявечным замку, якая стаіць асобна

*Канелюра* — вертыкальны жолаб на ствале калоны ці пілястры сегментнага ці паўкруглага сячэння

*Кансоль* — выступ у сцяне ў выглядзе каменя ці пліты дэкаратыўнага прызначэння або рэальная апора карніза, балкона

*Картуш* — скульптурнае ці ляпное ўпрыгожанне ў выглядзе не зусім разгорнутага світка з авальным ці круглым полем пасярэдзіне

*Контрфорс* — мураваная папярочная сценка (вертыкальны выступ ці рабро), якая ўзмацняе асноўную нясучую канструкцыю

*Курданёр* — парадны двор палаца, сядзібы, створаны галоўным корпусам і бакавымі флігелямі

*Лапатка* — плоскі вертыкальны выступ на сцяне будынка

*Люкарна* — аконны праём у даху або ў купале

*Мадульён* — архітэктурная дэталь тыпу кранштэйна, якая падтрымлівае вынасную пліту карніза будынка

*Неф* — адна з падоўжных частак будынка, аддзеленая ад астатніх радам калон або слупоў

*Ордэр* — разнавіднасць спалучэння, парадак размяшчэння частак архітэктурных канструкцый (калон і антаблементу). Асноўныя тыпы: дарычны, іанічны, карынфскі, тасканскі, кампазітны

*Пандус* — нахіленая пляцоўка для ўезду да параднага ўваходу

*Парэбрык* — форма арнаментальнай цаглянай муроўкі, калі цэгла ставіцца пад вуглом да вонкавай паверхні сцяны

*Пілон* — масіўная, часцей за ўсё прамавугольная калона, якая падтрымлівае аркі, скляпенні, афармляе па баках уваходы у паркі, на масты і пад.

*Пілястра* — плоскі вертыкальны выступ прамавугольнага сячэння на паверхні сцяны, мае тыя ж часткі, што і калона

*Порцік* — 1) частка будынка, адкрытая на адзін ці на ўсе бакі, створаная калонамі ці аркамі з перакрыццем, атыкам ці франтонам; 2) аналагічна зроблены ўваход у будынак

*Ратонда* — круглая пабудова, звычайна акружаная калонамі і ўпрыгожаная купалам

*Руст* — від апрацоўкі сцяны каменнымі квадрамі, калі кожны камень з вонкавага боку захоўвае груба сколатую паверхню з вузкім гладкім кантам па краях

*Рызаліт* — частка будынка, якая выступае за асноўную лінію фасада па ўсёй вышыні сцяны

*Сандрык* — невялікі прафіляваны карніз, размешчаны над праёмам акна ці дзвярэй

*Трансепт* — папярэчны неф ці некалькі нефаў, якія пад прамым вуглом перасякаюць асноўныя (прадольныя) нефы

*Франтон* — верхняя частка фасаднай сцяны будынка, створаная скатамі даху

*Фрыз* — 1) сярэдняя частка антаблемента; 2) лентачная скульптурная ці жывапісная кампазіцыя, якая дэкарыравала сцяну

*Цяга* — тонкі гарызантальны выступ на сцяне, звычайна на ўзроўні міжпавярховых перакрыццяў

*Шчыпец* — 1) верхняя частка сцяны трохвугольных абрысаў, абмежаваная двума схіламі даху; 2) верх сцяны фасада таксама абмежаваны схіламі, але са складаным малюнкам завяршэння

*Шчыт* — франтон двухскатнага даху

*Эркер* — паўкруглы, трохвугольны або шматгранны зашклёны выступ у сцяне будынка

# Змест

Уступ . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5
З мінулага нёманскіх берагоў . . . . . . . . . . . . 7

Частка 1. **Помнікі Гродна і яго наваколля** . . . . . . . 11

Гістарычная планіроўка Гродна (13). Гара "Стары замак" (15). Ніжняя царква (20). Княскі церам XII ст. (22). Умацаванні замка эпохі Кіеўскай Русі (23). Замак Вітаўта (25). Верхняя царква (26). Замак Стэфана Баторыя (27). Новы замак (30). Пабудовы ў наваколлі замкаў (33). Царква Барыса і Глеба на Каложы (35). Гродзенская школа старажытнага дойлідства (41). Плошча рынку (42). Езуіцкі (фарны) касцёл (43). Кляштар бернардзінаў (47). Брыгіцкая вуліца і кляштар брыгітак (48). Вуліца Гараднiца і пабудовы А. Тызенгаўза (51). Францысканскі кляштар і касцёл (57). Дом Элізы Ажэшкі (58). Некалькі слоў аб гродзенскім музеі (59). Свяцк (63). Індура (66).

Частка 2. **На Росі, Зяльвянцы і Свіслачы** . . . . . . . 68

Ваўкавыск (68). Помнікі ў Гнезна (71). Падароск, Поразава, Свіслач (79). Поразава (81).

Частка 3. **На правым беразе Нёмана** . . . . . . . . 86

Шчучын (86). Малое Мажэйкава, Мураванка (89). Ліда (92). Іўе (94).

Частка 4. **Навагрудак і ваколіцы** . . . . . . . . 97

Некалькі старонак з гісторыі Навагрудка (97). Дзядзінец і вакольны горад Навагрудка (98). Царква Барыса і Глеба (101). Міхайлаўскі касцёл (103). Дом Міцкевіча (103). Сядзіба ў Шчорсах (105). Замак у Любчы (110). Уселюб (111). Літоўка (113). Свіцязь (113).

Частка 5. **Па старажытнай рацэ Шчары** . . . . . . . 115

З гісторыі Слоніма (115). Рынaчная плошча (118). Ампірны асабняк на Замкавай вуліцы (124). Касцёл святога Андрэя (124). Альберцін (127). Жыровіцкі манастыр (130). Успенскі сабор (133). Богаяўленская царква (133). Царква Крыжаўзвіжання (136). Семінарыя (136). Жылы корпус (138). Гаспадарчыя пабудовы (138). Юр'еўская царква (139). Абарончая царква ў Сынкавічах (139). Ружаны, Косава (143). Косава (150).

Частка 6. **Нясвіж і Мір** . . . . . . . . . . 153

З гісторыі Нясвіжа (153). Замкавы ансамбль у Нясвіжы (155). Горад Нясвіж (162). Замкавая вежа (163). Слуцкая брама (163). Ратуша (164). Езуіцкі касцёл (164). Кляштар бенедыкцінак (168). "Дом на рынку" (168). Іншыя пабудовы Нясвіжа (169). Парк Альба (170). Сноў (171). Ішкальдзь і Паланечка (173). Мірскі замак (176). Усыпальня Святаполк-Мірскіх (182). Помнікі горада Міра (184).

Літаратура . . . . . . . . . . . . . . . 187

Слоўнік спецыяльных тэрмінаў . . . . . . . . . . 189

Навукова-папулярнае выданне

Аляксееў Леанід Васільевіч

ГРОДНА І ПОМНІКІ ПАНЯМОННЯ

Рэдактар
*С. К. Лазар*

Мастак
*М. А. Жахавец*

Мастацкі рэдактар
*В. А. Жахавец*

Тэхнічны рэдактар
*Т. В. Лецьен*

Карэктар
*І. Л. Дзмітрыенка.*

Здадзена ў набор 20.08.96. Падпісана ў друк 25.11.96. Фармат 84×108 1/32. Папера афсетная. Гарнітура літаратурная. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 10,08. Ум. фарб.-адб. 16,8. Ул.-выд. арк. 10,36. Тыраж 1400 экз. Зак. № 889.

Выдавецтва ”Беларуская навука“ Акадэміі навук Беларусі і Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. 220141. Мінск, Жодзінская, 18. ЛВ № 1294.

Набор і вёрстка выкананы на камп‘ютэрах выдавецтва ”Беларуская навука“.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа.
220005. Мінск, Чырвоная, 23.

Якасць друку адпавядае якасці выдавецкіх дыяпазітываў.

Л.В. Аляксееў